Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПЯТНІЦА, 12 чэрвеня 1987 г. № 24 (3382) ⊙ Выходзіць з 1932 г. ⊙ Цана 10 кап.

МУЗЫКА І ЧАС

Творы, створаныя ў год 70-годдзя Вялікага Кастрычніка, прагучаць у канцэртах Усесаюзнага фестывалю савецкай музыкі, які ўвосень сёлетняга года адбудзецца ў Кузбасе. Пастанова аб яго правядзенні прынята 9 чэрвеня на пасяджэнні сакратарыята праўлення Саюза кампазітараў СССР. Яго ўдзельнікі разгледзелі ход работы ў творчых арганізацыях саюза па выкананні рашэння студзеньскага (1987 г.) Пленума ЦК КПСС і падрыхтоўцы да юбілею краіны.

З гарачай зацікаўленасцю дзеячы музычнага мастацтва ўсіх саюзных рэспублік вялі гаворку аб павышэнні ідэйна-прафесійнага ўзроўню творчасці, умацаванні яе сувязей з сацыяльна-эканамічным развіццём краіны. Асаблівая ўвага была звернута на фарміраванне грамадзянскай пазіцыі кампазітараў, сачыненні якіх павінны адпавядаць духу часу, выхоўваць музычна-эстэтычныя густы. Падкрэслівалася, што ў апошні час назіраецца вядомы ўхіл у бок аблегчаных жанраў, бачны спробы падмяніць высокую духоўнасць таннай забаўляльнасцю. У сувязі з гэтым важнае месца ў дыскусіі заняла тэма прапаганды лепшых дасягненняў айчыннай музыкі.

У пасяджэнні прыняў удзел першы намеснік загадчыка аддзела культуры ЦК КПСС Я. В. Зайцаў.

СВЯТА НА ЎСЮ РЭСПУБЛІКУ

У гэтыя дні мастацка-спартыўнае прадстаўленне «Рэвалюцыі вечны агонь», пра якое мы падрабязна расказалі ў нумары за 29 мая, прыйшло на Віцебшчыну. Пад дэвізам «Майстры мастацтваў — працаўнікам рэспублікі да 70-годдзя Вялікага Кастрычніка» праходзяць канцэрты на вясковых пляцоўках і ў мястэчках, а ў выхадныя дні лепшыя артыстычныя сілы рэспублікі становяцца ўдзельнікамі святочных прадстаўленняў на стадыёне ў абласным цэнтры. Поруч з імі выступаюць вядомыя самадзейныя артысты і спартсмены вобласці. (Такіх мастацка-спартыўных прадстаўленняў праходзіць пяць у кожным абласным цэнтры).

Добрыя водгукі атрымалі мы з Гомельшчыны, дзе свята «Рэвалюцыі вечны агонь» прайшло апошнімі майскімі днямі. Неўзабаве прыйдзе яно на Магілёўшчыну, затым — на Гродзеншчыну... У кожным канцэрце на стадыёнах — коля паўтары тысячы ўдзельнікаў. Каля 170 канцэртаў у розных куткох рэспублікі дадуць за гэты месяц нашы майстры мастацтваў. Гучыць свята на ўсю Беларусь!

НАШ КАР.

ПЛЕНУМ ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ

Пленум адкрывае Максім Танк.

Фота Ул. КРУКА.

ВЕРНАСЦЬ ЖЫЦЦЮ, ВЕРНАСЦЬ ПРАЎДЗЕ

Уступнае слова старшыні праўлення СП БССР Максіма ТАНКА

Чарговы пленум праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі сабраўся ў юбілейны год Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, у год, які супадае з разгарненнем рашучай перабудовы, абнаўлення ўсяго жыцця, абвешчаных XXVII з'ездам нашай партыі. Змены, якія зараз адбываюцца ў нашым грамадстве, названы рэвалюцыйнымі. Яны з'яўляюцца працягам тых эпахальных пераўтварэнняў, якія былі абвешчаны Вялікім Кастрычнікам і зараз ажыццяўляюцца на тэарэтычнай платформе перабудовы і паскарэння, вызначаючы магістральны напрамак сацыяльнага, эканамічнага і духоўнага развіцця нашай краіны.

Пытанне, якое выносіцца на разгляд гэтага пленума, — «Сацыяльныя і маральныя праблемы ў жыцці і літаратуры», — адпавядае задачам і асаблівасцям сучаснага перыяду развіцця савецкага грамадства.

Сацыяльная місія нашай літаратуры — літаратуры сацыялістычнага рэалізму — на ўсіх этапах будаўніцтва новага, народжанага Кастрычнікам ладу, складалася з усталявання прынцыпаў сацыялістычнага гуманізму, народнасці, камуністычнага выхавання працоўных, з фарміравання новага жыцця і новай грамадскай маралі. У беларускай, як і ва ўсёй шматнацыянальнай літаратуры, адлюстраваны вопыт цэлых пакаленняў савецкіх людзей — тых, хто штурмаваў Зімні, змагаўся на франтах грамадзянскай вайны, выводзіў краіну з разарэння і закладваў першыя вянцы сацыялізму, граміў ворага ў гады Вялікай Айчыннай вайны, аднаўляў рэспубліку з руін і штурмаваў космас. Сацыяльны вопыт народа— тая база, на якой узвышаецца будынак беларускай савецкай літаратуры. І толькі ў сувязі з патрэбамі гэтага сацыяльнага вопыту, росту і ўдасканалення сацыялізму, які забяспечвае гарманічнае развіццё чалавека, мы маем права гаварыць пра тыя маральна-этычныя праблемы, без адлюстравання якіх не можа існаваць ніводны від мастацтва, у тым ліку і літаратура.

Вядомая ленінская думка пра сацыяльна-гуманістычную ролю мастацтва мяркуе неабходнасць духоўнага ўзвышэння людзей, абуджэння і развіцця ў кожным чалавеку творцы. Важнасць гэтай думкі набывае ў наш час асаблівае значэнне, бо поспех рэвалюцыйнага абнаўлення сацыялізму не можа ісці паспяхова без скарыстання ўсіх бакоў творчага патэнцыялу народа. І аб гэтым нельга забываць, бо адрыў сацыяльнага ад маральнага, іх раз'яднанасць адбіваюцца і на літаратуры, якая паступова губляла свае неад'емныя ўласцівасці — здольнасці фіксавання, адлюстравання рэчаіснасці і папярэджання аб нарастаючых тытанічных зрухах і зменах у нашым грамадстве. Так стварылася тая атмасфера, у якой жаданае і ўяўнае ўсё больш разыходзіліся з праўдай, з рэчаіснасцю. А калі і з'яўляліся творы, у якіх раскрывалася праўда жыцця, засведчаная пяром мастака, дык яны часта траплялі пад крыжавы агонь нарматыўнай і рэгламентаванай крытыкі. А ў выніку — узнікаў шэры паток скараспелых твораў на патрэбу дня, твораў, ад якіх нікому не было ні холадна, ні горача. Праўда, у іх была адна «прывабная якасць»— яны былі бясспрэчнымі. І на іх больш ахвотна арыентаваліся рэдакцыі нашых газет, часопісаў, выдавецтваў.

На жаль, трапляюцца такія «бясспрэчныя» творы яшчэ і сёння. Яны, як і ранейшыя з гэтага касяка, не выдзяляюцца ні вастрынёй мыслення, ні самабытнасцю таленту, самавітасцю слова, ідэйнай глыбінёй.

Нам неабходна даць выхад новым маладым сілам, якія здольны ўзняць чалавечы фактар, і ўсім падняць сваю энергію і актыўнасць, больш глыбока раскрываць у сваіх творах веліч ідэй партыі і духоўнае багацце савецкага народа, і ў той жа час, змагаючыся супроць застою і маразму, не ісці на паваду розных лаўкачоў, узброеных новай рыторыкай, якія бяруцца перавыхоўваць усіх, толькі не сябе.

Гаворачы аб крытыцы, хацелася б, каб больш было адчувальным яе ўздзеянне на развіццё нашай літаратуры, магчыма, гэтаму перашкаджаюць усё яшчэ нецярпімыя адносіны многіх нашых і старэйшых і маладзейшых пісьменнікаў і атрафія самакрытычнасці да сябе, той самакрытычнасці, якая з'яўляецца спадарожніцай кожнага сапраўднага таленту.

Неабходна падняць баявітасць нашых спрэчак, абмеркаванняў, іх культуру і ўзровень. Бо цішыня ў літаратуры, як вя-

(Працяг на стар. 2).

Друкуецца са скарачэннямі.

ПЛЕНУМ ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ

(Працяг. Пачатак на стар. 1).

дома, хоць усё яшчэ з'яўляецца для некаторых прывабнай, але не з'яўляецца паказчыкам нашых творчых пошукаў і нармальнага развіцця. Станоўчай з'явай, мне здаецца, з'яўляецца актывізацыя нашай публіцыстыкі, якая ў пэўнай меры кампенсуе адставанне іншых жанраў.

Глыбіня мастацкай распрацоўкі характару героя вымагае весці перабудову літаратуры ў тым рэчышчы, калі маральнае аблічча яго, паводзіны не проста рэгіструюцца, а набываюць эстэтычную вартасць. Як толькі мастацкім вобразам нестае сацыяльнай канкрэтнасці, нацыянальнай самабытнасці, хоць вонкава героі і выглядаюць зусім па-сучаснаму, падобнымі на праўду, тады і выступае непераканаўчая нарматыўнасць, што спараджае нудоту, шэрасць.

Побач з сацыяльнай асновай жыцця мастацкі твор закліканы адлюстроўваць і маральныя аспекты яго, якія, калі шчыра гаварыць, усё яшчэ не сталі нормай нашых твораў, твораў, у якіх сацыяльны вопыт пісьменніка, маральны змест яго і эстэтычнае выяўленне сплятаюцца тугім, неразрыўным вузлом. На крытычным фронце нашай літаратуры ўсё яшчэ адчуваецца пэўная збянтэжанасць перад новымі з'явамі. Зацягнулася і зняменне крытыкі. Яно пачалося ў першыя пасля вайны гады, калі ёй прадпісвалася, якой яна павінна быць. Як вядома, гэта рагламентаваная крытыка нарабіла ў свой час шмат шкоды нашай літаратуры, калі сустракалася ў штыкі так званая «акопная праўда», і Васіля Быкава намагаліся выбіць з творчай каляі; калі спробу Аляксея Кулакоўскага ў аповесці «Дабрасельцы» выставіць напаказ і асмяянне бюракратызм ў самых нізавых эшалонах Савецкай улады расцэньвалі як ачарненне рэчаіснасці; калі творча смелы, прынцыповы рэдактарскі талент Васіля Віткі быў палічаны несумяшчальным з пасадай галоўнага рэдактара «Літаратуры і мастацтва».

Тут можна было б прыгадаць і тое, што ў свой час была знята з рэпертуару тэатра купалаўцаў адна з выдатнейшых п'ес К. Крапівы «Мілы чалавек»; прыгадаць, як рэдагаваліся творы Чорнага, Брыля і некаторыя вершы Панчанкі і як цяжка пракладаў дарогу да чытача А. Куляшоў сваёй цудоўнай паэмай «Варшаўскі шлях», прысвечанай памяці яго вялікага друга А. Твардоўскага.

Рэцыдывы той застойнай пары адчувальны і сёння. Праўдзівая, даволі непрывабная карціна вывучэння беларускай мовы ў агульнаадукацыйных школах рэспублікі, якую паспрабавала закрануць на сваіх старонках газета «Літаратура і мастацтва», некаторымі і сёння лічыцца амаль нармальнай з'явай. Гэта пра іх калісьці пісаў адзін з чэшскіх пісьменнікаў, што хоць некаторыя з іх знаюць шмат розных моў, але сваю ўжываюць толькі для наклейвання марак (мова ў сэнсе «язык»).

Становішча з мовай, якое склалася ў нас, відаць, нельга пускаць далей на самацёк, як не пускаем на самацёк ніводнай сур'ёзнай справы. Своеасаблівасць культуры кожнага народа — каштоўнейшае багацце ўсёй нашай шматнацыянальнай савецкай культуры. У гэтым яе рэвалюцыйная інтэрнацыянальная і прыцягальная сіла, здольная супрацьставіцца экспансіі бязроднай культуры капіталізму, яе гіганцкай індустрыі хлусні і прапаганды, якая з'яўляецца ўсеапусташальнай пагрозай для чалавецтва, разбураючай яго маральныя і этычныя традыцыі і ўстоі. Не можа нас не хваляваць і тое, што кнігі, якія выдаюцца па-беларуску, усё менш чытаюцца, што многія з нашых твораў у перакладзе на мовы братніх народаў маюць большыя тыражы, чым у нас, у Беларусі. Не менш трывожнае становішча і з тыражамі газет і часопісаў. Зразумела, што немалую ролю ў гэтым іграе ўзровень нашых твораў. Сёння, каб звярнуць на сябе ўвагу патрабавальнага чытача, трэба пісаць не на нейкім сярэднім, а на самым высокім узроўні. Але гэта патрабаванне стаіць перад кожнай літаратурай. Нам неабходна аднавіць скарочаныя лістажы часопісаў, што не дае магчымасці больш поўна прадстаўляць дасягненні і нашай, беларускай, і ўсёй шматнацыянальнай савецкай літаратуры, што мае велізарнае значэнне ў выхаванні чытачоў у духу інтэрнацыяналізму і дружбы народаў.

Як вядома, напярэдадні нашага пленума адбылася сустрэча ў ЦК КПБ з тав. Сакаловым Яфрэмам Яўсеевічам, з сакратарамі ЦК і кіраўнікамі нашай рэспублікі, сустрэча, на якой былі закрануты многія пытанні, якія нас хвалююць і якія мы абмяркоўвалі на сваім з'ездзе пісьменнікаў.

І мы глыбока ўдзячны нашай партыі, ураду, што некаторыя з гэтых пытанняў вырашаны або знаходзяцца ў працэсе свайго вырашэння. Прынята пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР аб паляпшэнні ўмоў дзейнасці творчых арганізацый. Усё гэта, бясспрэчна, яшчэ больш будзе садзейнічаць развіццю нашай літаратуры.

Сёння месца кожнага сапраўднага пісьменніка на перадавой лініі перабудовы грамадскай свядомасці.

Вернасць ідэям партыі, вернасць праўдзе з'яўляецца асновай асноў нашага жыцця і творчасці.

САЦЫЯЛЬНЫЯ І МАРАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ Ў ЖЫЦЦІ І ЛІТАРАТУРЫ

Даклад першага сакратара праўлення СП БССР Н. С. ГІЛЕВІЧА

Крыху больш двух гадоў назад наша краіна ўступіла на шлях карэннай, рэвалюцыйнай перабудовы ва ўсіх сферах грамадскага жыцця: і ў эканамічнай, і ў сацыяльнай, і ў духоўнай. У дакладзе на студзеньскім (1987 г.) Пленуме ЦК КПСС М. С. Гарбачоў даў дакладнае растлумачэнне, як мы павінны разумець гэту перабудову, якія яе важнейшыя накірункі. Дазвольце ў сціслым пераказе нагадаць самае для нас галоўнае: перабудова — гэта рашучае пераадоленне застойных працэсаў і злом механізма тармажэння. Перабудова — гэта апора на жывую творчасць мас, гэта ўсебаковае развіццё дэмакратыі, пашырэнне публічнасці крытыкі і самакрытыкі. Перабудова — гэта прыярытэтнае развіццё сацыяльнай сферы, пастаянны клопат пра духоўнае багацце, культуру кожнага чалавека і грамадства ў цэлым... Перабудова — гэта энергічнае збавенне грамадства ад скажэнняў сацыялістычнай маралі, паслядоўнае правядзенне ў жыццё прынцыпаў сацыяльнай справядлівасці.

Размова пра сацыяльна-маральныя праблемы сёння можа весціся толькі ў рэчышчы ідэй абнаўлення, у святле пастаўленых XXVII з'ездам партыі задач; гэтаксама як і ўся наша наступная творчая і арганізацыйна-грамадская работа павінна паслужыць мэтам перабудовы.

У навагоднім звароце да савецкага народа М. С. Гарбачоў сказаў: «Мы ўступілі на шлях глыбокіх перамен. Гэта наш з вамі выбар. Яшчэ даюць сябе адчуць сілы застою і бесклапотнасці, надзеі таго-сяго на тое, што ўсё вернецца ў старую каляіну. Але гэта не спыніць руху савецкага грамадства па шляху перабудовы. Мы павінны быць цвёрдымі і паслядоўнымі. Ніякіх паслабак мы не можам сабе дазволіць. Ініцыятыва і адказнасць, крытыка і публічнасць, дэмакратыя і дысцыпліна — вось наша палітычная і маральная пазіцыя, эфектыўныя сродкі развіцця сацыялістычнага ладу» («Правда» за 1.01.1986 г.).

Каб ажыццявіць глыбокія рэвалюцыйныя перамены ў сферах эканамічнай, сацыяльнай, духоўнай, трэба самым рашучым чынам многае перайначыць у псіхалогіі нашых людзей, у характары іх мыслення, у маральным клімаце грамадства, у сферы ідэалагічнай. Інакш сказаць — у перабудове душы чалавечай. І тут літаратура можа адыграць ролю неацэнную. Праўдзівае, пераканаўчае слова пісьменніка можа дапамагчы людзям усвядоміць, што, па-першае, так жыць і працаваць, як было дагэтуль, далей нельга, і што, па-другое, жаданых перамен ніхто за нас саміх не зробіць.

На жаль, у адным дакладзе немагчыма спыніцца на ўсіх тых сацыяльна-маральных праблемах, якія моцна хвалююць сёння нашу грамадскасць і якія, канечне ж, акажуцца ў цэнтры пісьменніцкай увагі на бліжэйшыя гады. Таму я вылучу толькі праблемы першаступеннай, на мой погляд, важнасці. Напрыклад, як пакончыць у нашым грамадскім жыцці і ў літаратуры з няпраўдай, з крывадушнасцю, з гэтак званай двайной мараллю. Хлусня стала ў нас вельмі небяспечным злом. Але ж на хлусні вырастае толькі новая хлусня, а з няпраўды — толькі яшчэ большая няпраўда.

Калі і чаму чалавек пачынае хлусіць? Не ў бытавым плане, на кухні, а ў ідэйна-палітычным плане — чалавек дзяржаўны і на дзяржаўнай службе? І ў навуцы — чалавек вучоны? І ў літаратуры — паважаны таварыш аўтар? Чаму, ведаючы, што гэта няпраўда, фікцыя, падман, чалавек сцвярджае, піша, гаворыць, што гэта — праўда, поспех, перамога? Што прымушае яго да гэтага? Страх за пасаду, за цёплае месца? Прага нажывы, прывілеяў, дастатку? Славалюбства, прага рэгалій, узнагарод, рэкламы? А чаму чалавек не баіцца пакарання за няпраўду? Можа, таму, што ведае: недзе вышэй ёсць той, каму яго хлусня патрэбна. І той яму за хлусню ўдзячны і пры выпадку — заступіцца. А чаму ён не баіцца суда маральнага? А вось гэта ўжо пытанне да ўсіх нас...

Мы хочам зрабіць наша грамадства духоўна высакародным, у якім будуць панаваць законы сумлення, маральнай чысціні, чалавечай годнасці. А як мы думаем дасягнуць гэтага? Хлуснёй або палавінчатай праўдай, якая горш хлусні? Заганяючы праўду ў закуткі свядомасці? Пакідаючы яе для размовы тэт-а-тэт — удваіх? Не дапускаючы яе на публічную трыбуну? Манапалізуючы права на ісціну ў апошняй інстанцыі?.. Так можна дасягнуць толькі таго, чаго мы дасягнулі: застою ў сферах эканамічнай і сацыяльнай, няшчырасці, раздваення асобы — у сферы маральнай. Выступаючы на апошнім пасяджэнні Савета па беларускай літаратуры, Святлана Алексіевіч сказала: «У мяне такое адчуванне, што ўсе мы аказаліся духоўна і прафесійна разбэшчанымі. Ну, калі не ўсе, дык большасць... Я думаю, што гэта важная для літаратуры праблема — масавы кампраміс, масавае маўчанне». («ЛіМ», 27.03.1987). Хто не згодзен з Алексіевіч наконт таго, ці большасць,— можаце з ёй паспрачацца. Такое лёгка аспрэчыць і без аргументаў: дастаткова высокааптымістычнага пафасу. Ну, а што пафас і праўда — далёка не заўсёды сінонімы,— гэта як для каго, як хто разумее.

Сацыяльныя і маральныя праблемы сёння як ніколі цесна звязаны ў адзін вузел, які і рассекчы магчыма толькі разам. Не можа лічыцца здаровай і жыватворнай мараль, якая дапускае сацыяльную несправядлівасць, а значыць — і сацыяльную крыўду. Мараль, у якой мала спагады, і спачування, — таго, што калісьці называлася ўжо амаль забытым словам «міласэрнасць». Мараль, якая затуманена шкоднымі для духоўнага здароўя грамадства ідэйна-палітычнымі міфамі.

Парушэнняў прынцыпу сацыяльнай справядлівасці ў нашым жыцці назіраецца багата. Гэтым, перш за ўсё, і абумоўлена паніжэнне маральнасці, пашырэнне такіх агідных з'яў, як закаранелы эгацэнтрызм, чыноўная фанабэрыя, легальнае казнакрадства, усёдазволенасць, хцівасць, пошласць, цынізм і г. д. — аж да адкрытага антыпатрыятызму і здрадніцтва. Нядаўна на канферэнцыі журналістаў Масквы быў прыведзены такі факт — цытую па газеце «Правда» (за 9.02 1987): «Журналісты «Московской правды» пачалі расследаванне: што такое сталічныя спецшколы і хто ў іх вучыцца? Выяснілася: многа дзяцей кіраўнічых таварышаў. З першага класа ездзяць на вучобу ў службовых аўтамашынах. Іншы раз гэта не школы, а палацы з райскімі кушчамі, фантанамі, басейнамі. Дык вось уплывовыя таты, дазнаўшыся аб расследаванні карэспандэнтаў, спалохаліся, атакуюць рэдакцыю і МГК КПСС. Ціснуць, граюць мускуламі: «Спыніце!»

Дарэчы, каму і калі гэта прыйшло ў галаву — насаджаць у нас спецыялізаваныя англамоўныя ці французскамоўныя школы? Якія вялікія педагогі і стратэгі сацыяльнага і духоўнага развіцця краіны да такога дадумаліся? Ці гэта проста сацыяльна-класавая прыхамаць мяшчанска-бюракратычнага слою, якому вельмі ж не хочацца быць роўным з усім народам, з «рабацягамі», якому страшэнна хочацца адрозніваецца ад іншых прывілеяваным становішчам, у тым ліку — вельмі ўцешна думаць, што «нашы дзеткі» не такія, як усе, нашы вучацца ў спецыялізаванай школе, з ухілам. Ды яшчэ з якім ухілам! Не з нейкім там, скажам, беларускім, купалаўска-коласаўскім, а з англійскім. Або з французскім... Дзвесце гадоў назад рускія класікі ўшчэнт высмеялі падобную франкаманію — а бач ты, уваскрэсла, і вось — калі ласка — жыве!..

За самы апошні час ужо неаднойчы было выказана ўдзячнае прызнанне савецкай літаратуры за тое, што яна — сіламі сваіх лепшых творцаў — рыхтавала маральна-псіхалагічную глебу для перабудовы, спяліла ўмовы і тым самым набліжала час гэтых незвычайных рэвалюцыйных перамен. Зразумела, што добрага слова заслугоўваюць перш за ўсё тыя аўтары, якія таленавіта, шчыра і мужна адлюстроўвалі ў сваіх творах праўду жыцця і для якіх вернасць свайму чалавечаму і грамадзянскаму сумленню была вышэй за ўсё іншае. Зразумела і тое, што такіх праўдзівых, сацыяльна змястоўных, грамадска значных твораў магло б быць больш, калі б на агульным стане літаратуры не адбілася, як сказана ў дакладзе М. С. Гарбачова на студзеньскім (1987) Пленуме ЦК КПСС, «ідэалогія і псіхалогія застою». Давайце яшчэ раз паспрабуем унікнуць у сутнасць крытычных ацэнак, заўваг і высноў, якія прагучалі з трыбуны Пленума: «Знізіліся крытэрыі ў ацэнках мастацкай творчасці. Гэта прывяло к таму, што побач з творамі, у якіх падымаліся сур'ёзныя сацыяльна - маральныя праблемы, адлюстроўваліся рэальныя жыццёвыя калізіі, выходзіла нямала пасрэдных, безаблічных твораў, якія нічога не давалі ні розуму, ні пачуццям». І далей: «У дзейнасці творчых саюзаў не хапала прынцыповасці, патрабавальнасці, сапраўднага клопату аб развіцці і падтрымцы талентаў. Часта пытанні першаступеннай важнасці, якія датычаць стану сферы культуры, заставаліся без належнай увагі з боку кіраўніцтва саюзаў. І ў той жа час расцвілі казёншчына і фармалізм, паявілася крайняя нецярпімасць да крытыкі. У шэрагу выпадкаў непамерныя амбіцыі сталі браць верх над рэа-

Васіль Быкаў і Уладзімір Карпаў.

лістычнымі ацэнкамі і самаацэнкамі».

На вялікі жаль, усё сказанае вышэй у поўнай меры датычыць і нас з вамі, жыццядзейнасці нашай пісьменніцкай арганізацыі, сучаснага стану беларускай літаратуры. Таму і ўяўляецца, што наша сённяшняя размова павінна быць у вышэйшай ступені самакрытычнай.

Гэта, вядома, не азначае, што ў падрыхтоўку перабудовы беларуская літаратура не ўнесла свой уклад і што ў гэтым плане ёй няма чым пахваліцца і нават пагэнарыцца. Дазволю сабе тое-сёе напомніць. Напрыклад, вось гэты, апублікаваны больш чым трыццаць гадоў назад, верш:

Станкоў не знаюць, араць
не ўмеюць,
Да воза з гноем не йдуць і
блізка.
Разумнае, вечнае, добрае
сеюць
Між мас працоўных амаль з
калыскі.

Закончаць нешта з тугой
нацяжкай,
Запас прыдбаюць цытатаў
розных.
Дзяцей у школе вучыць ім
цяжка,
Лягчэй, выгодней вучыць
дарослых.

Ідуць насустрач грашовай
справе,
На пафас голы яны не
клюнуць.
Маліцца будуць, калі ты ў
славе,
Калі ты ў горы — з
насмешкай плюнуць.

І, ўладкаваўшыся адмыслова,
Чужыя думкі прыстойна
крадуць.
Зусім забылі жывое слова
І занядбалі людскую праўду.

Так, гэта строфы са знакамітых «Прыстасаванцаў» Пімена Панчанкі. Трыццаць з гакам гадоў прайшло з таго часу — а гучыць так, нібы сёння напісаны, нібы прадыктаваны ідэалагічнымі задачамі перабудовы. І як шкада, што такі ювеналаўскай сілы сатырычны гнеў не выкарыстоўваўся належным чынам для сацыяльнага і маральнага выхавання! Не помню, каб артысты чыталі яго са сцэны, ці з эфіру, ці з экрана. А ўявім на імгненне, які быў бы выхаваўчы плён, калі б гэты верш гучаў па радыё літаральна кожную раніцу — як тая фіззарадка ці гімнастыка!

Прыгадаем і аповесць Аляксея Кулакоўскага «Дабрасельцы», апублікаваную ў 1958 годзе і фактычна выкінутую на дзесяткі гадоў з літаратуры. Дабрэнная, вартая высокай пахвалы была кніга! Таленавіта, праўдзіва, і галоўнае — своечасова паказаў Кулакоўскі, якая бяда насоўваецца на нашу вёску, які ў ёй пачынае панаваць злачынна-шкодны тып бессаромнага п'яніцы і абіралы, што разбэшчвае сваёй амаральнасцю ўсіх і ўсё. І зноў жа міжволі падумаеш: а калі б тады хапіла ў адказных таварышаў мудрасці і, замест аб'яўленага ёй астракізму, яе паставілі ў прыклад іншым? Ды ўвесь час перавыдавалі, ды абавязалі ўсіх сельскіх і раённых начальнікаў чытаць яе!..

А ўспомнім выступленне Васіля Быкава аб праблемах рэалізму на 5-м з'ездзе пісьменнікаў Беларусі ў 1966 годзе. К таму часу ў беларускай літаратуры аб вайне ўжо адбыўся яго знакаміты быкаўскі прарыў да праўды. З ланцугоў акружэння, якое мацавалася аб'яднанымі сіламі схематызму і зададзенасці, псеўдарэалізму і псеўдарамантызму, ён вырваўся на стратэгічны прастор строга рэалістычнай, бясстрашна праўдзівай творчасці. Быкаў тады быў ва ўзросце нашых сённяшніх саракагадовых і жылося яму — ох як нясоладка ў асадзе арганізаванай умельцамі-спецыялістамі траўлі. Але ён, прайшоўшы загартоўку ў гарніле народнага сумлення, не зламаўся, і з трыбуны з'езда ягоны голас прагучаў, як выбух бомбы... І зноў жа з горыччу думаеш: у зале тады многія дружна, адкрыта падтрымалі яго пазіцыю, чым засведчылі гатоўнасць нашай літаратуры працаваць на сённяшнюю перабудову, але ж не падтрымалі тыя самыя ўмельцы-спецыялісты, і ў выніку рух эстэтычнай думкі ў нас, а галоўнае — мастацкай практыкі пэўным чынам прытармазіўся, замарудзіўся.

Чаму сёння ёсць патрэба ўспомніць гэтыя цікавыя, паказальныя факты нашай нядаўняй літаратурнай гісторыі? Ды таму, што ўрокі мінулага забываць нельга, з іх абавязкова трэба рабіць разумныя высновы, каб не паўтараць сёння і заўтра памылкі папярэднікаў.

Я спаслаўся на факты ў пэўным сэнсе выключныя, але спяшаюся сказаць, што і ў цэлым беларуская літаратура апошніх двух-трох дзесяцігоддзяў — гэта не толькі застой і руціна, як можа хтось скарапалам падумаць, не толькі шэрасць, хаця, вядома, і гэтага «дабра» ў ёй хапае. Разумны гаспадарскі погляд вымушае прызнаць, што і ў акрэслены перыяд у нас паявілася нямала твораў, якія і сёння добра кантактуюцца з душой чытача і будзяць яго сумленне, твораў, якія значна ўзвысілі аўтарытэт усёй нашай літаратуры і якія мы, ахопленыя настроем абнаўлення, успамінаем з удзячнасцю. У таго ж Пімена Панчанкі, якога я цытаваў, ёсць не толькі «Прыстасаванцы». Прачытайце ўсё, што ім напісана за перыяд пасля XX з'езда КПСС — усе яго кнігі. Вы не знойдзеце ў іх ні аднаго верша, пра які можна было б сказаць: гэта — сёння не гучыць, састарэла! Увогуле, яго сапраўды партыйная, сапраўды ленінская ідэйная пазіцыя, не кажучы пра яркасць таленту і майстэрства, выклікае пачуцці самай глыбокай павагі і захаплення. І невыпадкова, што менавіта ён першы прыняў раўненне на заклік перабудовы і задаў у паэзіі новы тон. Пачытайце вершы і паэмы 70-х гадоў Аркадзя Куляшова — якой гэта магутнай інтэлектуальнай і эмацыянальнай сілы таран супроць усялякай мярцвячыны на дарозе жыцця, супроць бюракратызму і раўнадушнасці, коснасці і руціны! Пачытайце вершы апошніх кніг лірыкі Максіма Танка — гэтыя дзіўна яркія іскры з неаслабна напружанага току яго роздуму аб жыцці і часе. А крута замешаная на салдацкай мужнасці і сціпласці, на чалавечай міласэрнасці і нацыянальнай годнасці, ачышчаная болем за лёс народа ад фальшывых памкненняў і гукаў лірыка незабыўнага Аляксея Пысіна! А несціхана балючыя мары пра шчасце роднага краю Уладзіміра Караткевіча! Хіба ўсё гэта не дапаможа сучасніку адкрыць сваю душу насцеж — насустрач свежым, веснім вятрам абнаўлення?.. Гэта — усяго некалькі, на выбар, імён, і толькі ў паэзіі. А паставім побач вялікую і з вялікай літары Кнігу сучаснай беларускай літаратуры — «Палескую хроніку» Івана Мележа, — глыбока праўдзівую эпапею народнага жыцця, з рэдкім мастакоўскім і чалавеказнаўчым пранікненнем у лёс людзей на балоце, а па сутнасці — у лёс усяго беларускага сялянства, беларускай вёскі. Ды дабавім у гэты ж рад аповесці і апавяданні Янкі Брыля, неадменна прасветленыя трохі тужлівай марай аб гарманічна прыгожых, высакародных людзях,—марай і верай, што такія людзі на свеце ёсць, на свеце — і нашай роднай зямлі таксама. Ды кнігі несправядліва прызабытага Аркадзя Чарнышэвіча — мастака адметнага, удумлівага і з дакладным сацыяльным бачаннем. Ды кнігі гэтаксама недаацэненага Міколы Лупсякова — дасканалага знаўцы жыцця і побыту самага размаітага працоўнага люду. Ды забойчай сілы камедыю Кандрата Крапівы «Брама неўміручасці», — бязлітасна з'едлівую сатыру на пачварныя адхіленні ад сацыяльных і маральных ідэалаў нашага грамадства. І само сабой зразумела — паўтара дзесятка аповесцей Васіля Быкава, пра якога толькі што гаварылася. Вось ізноў жа — усяго некалькі імён з прозы і драматургіі, з якімі несумненна звязаны працяг і развіццё лепшых традыцый беларускай савецкай класікі, а менавіта — традыцый праўдзівасці, народнасці, дэмакратычнасці, грамадзянскай сумленнасці і мужнасці.

Пра тое, што нам, сённяшнім чорнарабочым літаратуры, ёсць у каго павучыцца і дэмакратычнасці, і мужнасці, і рэвалюцыйнай непрымірымасці да бюракратызму, могуць пасведчыць наступныя радкі з адной беларускай аповесці, напісанай яшчэ ў канцы 20-х гадоў: «...Агульначалавечае шчасце можна толькі заваяваць у жорсткім змаганні. Мы яго заваёўваем, але яшчэ не заваявалі. Але ў нас ужо і цяпер ёсць такія, што забяспечылі сваё асабістае існаванне, засеўшы ў кабінетах сацыялістычнай дзяржавы. Яны мысляць, што іхняя місія скончана і што яны маюць права на сваю долю шчасця ад таго агульначалавечага. Яны сёння гатовы ўжо сесці ў мяккія крэслы сваіх кватэр, у якія (крэслы) так шчыльна ўмяшчаюцца іх тоўстыя зады, і ўспамінаюць аб бітвах рэвалюцыі, як пра нешта мінулае. Яны гатовы скрозь вывесіць шыльды з лозунгамі аб рэвалюцыі і заваяваным ёю, назваць вуліцы гарадоў імёнамі вялікіх рэвалюцыянераў, абвясціць сацыялізм пабудаваным... Яны гатовы ўвагнаць сацыялізм у форму бронзавых і гіпсавых статуэтак і помнікаў, каб гэтым паралізаваць яго дзейсную сілу».

Калі, зачытаўшы гэтыя радкі, я спытаў на адным сходзе, хто іх напісаў, — нехта з прысутных у зале адказаў: Ленін. Напісаў іх, вядома, не Ленін, а выдатны беларускі пісьменнік Платон Галавач; аднак вельмі паказальна, што было названа імя правадыра рэвалюцыі. Таварышы адчулі, што і пафас, і гучанне радкоў — ленінскае. Што гэта, несумненна, ленінкая пазіцыя. Так глыбока і арганічна быў прасякнуты іх аўтар ідэямі і духам ленінізму.

Што і казаць: як бы добра было сёння прачытаць у нашых часопісах моцныя, мастацка яркія творы, у якіх усё ад Леніна: ленінская партыйная прынцыповасць, ленінская бескампраміснасць у змаганні за ідэалы сацыялізму, ленінская бясстрашнасць перад тварам праўды! Мы цягам цэлых дзесяцігоддзяў голасна і ўрачыста гаварылі, што жывём і працуем з Леніным у сэрцы, — гаварылі так часта і так лёгка, што амаль механічна, амаль не задумваючыся: а ці заўсёды гэта так? А ці сапраўды — ва ўсім і ўсюды мы звяраем свае думы і справы па Леніну? Пытанне не здымаецца і сёння, бо калі б мы паслядоўна і непахісна ва ўсім ішлі ад Леніна — перабудова ў краіне разгортвалася б куды больш ращуча і зрухі былі б куды больш прыкметныя. У краіне — і, зразумела, у літаратуры.

Наколькі сур'ёзна і блізка да сэрца прынялі перабудову дзеячы савецкай літаратуры і мастацтва, наколькі глыбока зразумелі яе неабходнасць, могуць сведчыць наступныя радкі з артыкула вялікага акцёра нашай эпохі Міхаіла Ульянава: «Або мы пойдзем далей да канца, або спынімся на паўдарозе, згорнем гэту перабудову, і тады зноў — балоцістая нерухомасць, дрыгва, з якой нам ужо не выбрацца ніколі».

Цяпер вельмі часта — і ў друку і па тэлебачанні — ставіцца пытанне: а як трэба разумець перабудову ў літаратуры і ў літаратурным жыцці? Напэўна, так як і ва ўсім іншым: рэзка павысіць патрабавальнасць да сябе. У творчасці гэта азначае: пісаць праўду і толькі праўду, у жыцці — строга кіравацца прынцыпамі камуністычнай маралі. Як-то кажуць: проста і ясна. Але гэта на словах. А на справе? Як, скажам, перайсці на бескампрамісныя ў дачыненні да жыццёвай праўды пазіцыі? Што для гэтага трэба зрабіць? Думаю, што без масавага забойства тут не абысціся. У

На пярэднім плане Іван Чыгрынаў і Іван Шамякін.

Беларусі ў актыўным творчым страі некалькі сот пісьменнікаў. Дык вось трэба задушыць некалькі сот баязлівых і нікчэмных рэдактараў. На кожнага прыпадае ўсяго толькі адзін — не больш. Вы здагадаліся, што размова ідзе пра рэдактара, які сядзіць у кожным з нас. Узненавідзь гэтага рэдактара ў самім сабе, перамажы яго і пачні пісаць гранічна шчыра. Акадэмік Д. С. Ліхачоў нядаўна пісаў: «Літаратура — гэта сумленне грамадства, яго душа. (...) Літаратура, у якой не б'ецца трывога сумлення, — гэта ўжо хлусня. А хлусня ў літаратуры, пагадзіцеся, — **горшы** від хлусні». І далей: «У літаратуры за апошнія дзесяцігоддзі ўзяў верх дух спажывецтва. Паявілася тэндэнцыя пісаць на продаж, тое, што пройдзе напэўна» («ЛГ», 1.01.1987).

Сёння, аднак, справа безнадзейная — спадзявацца на поспех у чытачоў, пішучы ў рамках рэгламентаванай праўды і заверанай пячаццю грамадзянскай смеласці. У літаратуры па нечых рэгламентацыях і рэцэптах адкрыцця не зробіш; ідэйна-мастацкі пошук павінен быць свабодны, а не стрыножаны. У сувязі з гэтым, я думаю, неабходна па-новаму глянуць на некаторыя звыклыя лозунгі, накшталт: пісьменнікі, глыбока вывучайце жыццё! Лозунг нібыта правільны: без ведання жыцця добрую кнігу не напішаш. Але ў ім думка выказана недакладна і такім чынам робіцца няслушнай сама зыходная ўстаноўка. Трэба, каб лозунгам было: пісьменнікі, жывіце шчыра, сумленна і абавязкова — актыўным грамадзянскім жыццём, жывіце тымі клопатамі, радасцямі і трывогамі, якімі жыве народ! І нічога больш. І тады прыйдуць тэмы, знойдуцца героі, і напішуцца на ўзроўні вашага таленту творы, і іх прыме чытач.

Мы яшчэ, відаць, не зусім усвядомілі адну рэч: адбываецца рэзка змена масавага чытача. Разбуджаны іншы, з іншымі патрабаваннямі, з іншымі ідэйнымі і маральнымі меркамі чытач. Ён выспяваў дзесяцігоддзямі і — выспеў: схамянуўся, працёр вочы, агледзеўся. Ён будзе рашуча не прымаць белетрыстыкі і вершатворства без адзнакі новага мыслення, новага самаадчування, новага погляду на стан рэчаў, на жыццё, на духоўную сутнасць і прызначэнне чалавека. Тых літаратараў, хто гэтага не ўсвядоміць і адпаведным чынам не перабудуецца, — чакае вялікае засмучэнне: давядзецца бачыць свае творы на паліцах кнігарань і бібліятэк незапатрабаванымі. Сам чытач прымусіць нас пераадолець своеасаблівую міфалагізацыю мастацкага мыслення, якая спеляноўвала літаратуру цягам дзесяцігоддзяў, прымусіць смялей ісці насустрач бескампраміснаму рэалізму, даваць дарогу жывому пачуццю, вострай аналітычнай думцы, інтэлектуальнаму пісьму. Паэтаў і публіцыстаў прымусіць пераадолець нашу традыцыйную — ад культаўскіх часоў — фальшыва-напышлівую патэтыку, чыноўна - казённую рыторыку і псеўда - рамантычнае пустаслоўе. І ў прозе, і ў паэзіі, і ў драматургіі прымусіць нас загаварыць цішэй і больш натуральна, цвярозым, а не штучна ўзвінчаным голасам, і простай, звычайнай чалавечай мовай. Адным словам — як у класікаў: давядзецца пісаць на іх узроўні. А калі сур'ёзна — давядзецца ісці да іх на вывучку, прайсці пад іх наглядам перакваліфікацыю.

Што да паэзіі, то хацеў бы тут затрымацца на яе праблемах трохі асобна. Ад усяго таго, што сёння друкуецца ў форме верша, уражанне самае супярэчлівае. Побач з сапраўды таленавітым чытачу выдаецца процьма рыфмаванага ці верлібраванага слоўнага шалупіння. Гэтага шалупіння, гэтай мякіны так многа, што ў ёй нядзіўна згубіцца зерням сапраўднай паэзіі. У краіне і ў нас на Беларусі адбыліся падзеі, якія — хто-хто—а паэт ніяк не можа абысці міма, успрыняць спакойна, як нешта звычайнае. Партыя абвясціла курс на перабудову. Ускалыхнулася ўсё грамадства, узрушана загаварыла жаданне і воля мільёнаў перайначыць жыццё. Чарнобыльская аварыя, можна сказаць, сфакусіравала ў сабе многія сацыяльна - маральныя праблемы і, няйначай, падкрэсліла неабходнасць рашучых перамен. Значыць, для ўсіх нас павінен быў бы пачацца, па сутнасці, новы адлік часу, наступіць новае мысленне, разуменне свайго абавязку на іншым, больш высокім узроўні адказнасці. Калі сказаць коратка — жыць і пісаць па-ранейшаму нельга. На вялікі жаль, паэзія, — гэты, здавалася б, найбольш чуйны орган грамадскай самасвядомасці — у цэлым яшчэ не засведчыла жаданага зруху, пералому ў сваім грамадзянскім самапачуванні, у сваёй ідэйна - маральнай настраёвасці. Вядома, сёе-тое ў самы апошні час паявілася і паяўляецца. Падборкі вершаў П. Панчанкі і Г. Бураўкіна, «Рэтушоры» Г. Каржанеўскай, «Балючая памяць» С. Грахоўскага і «Зона» У. Някляева — на старонках «ЛіМа», вершы А. Вялюгіна і паэма С. Законнікава «Кульмінацыя» ў «Полымі», «Зажураны трыпціх» Р. Барадуліна і вершы Л. Тарасюк у «Маладосці», лірычны маналог «Боль» Т. Бондар, а таксама падборкі вершаў А. Разанава і М. Мятліцкага ў «Беларусі»... — вось, бадай, самыя прыкметныя рэчы, у якіх выявілася тая трывожная ўзрушанасць настрою, што павінна была б сёння

(Працяг на стар. 4).

ПЛЕНУМ ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ

(Працяг. Пачатак на стар. 1—3).

быць у нашай паэзіі дамінуючай, вызначальнай. Зразумела, апублікавана нямала і іншых добрых ці неблагіх паэтычных твораў — добрых, але напісаных яшчэ як бы ў ранейшым тоне, без выхаду на новыя ідэйна-светапоглядныя і эмацыянальна - псіхалагічныя рубяжы. У той жа час друкуюцца касякі вершаванай руціны, псеўдапаэтычнай рыторыкі і альбомшчыны, чытаючы якую, міжволі хочацца ўскрыкнуць: «Апомніцеся, браткі! Дзе і калі мы жывём? Паглядзіце, што дзеецца навакола і ў свеце!.. Пра што і дзеля чаго вашы метафары, вашы рыфмы?..» Прывяду хаця б два прыклады з часопісных публікацый гэтага года:

Бывай! Ад'язджаю ўжо
назаўсёды.
Хвалююць і маняць другія
агні...
Трывогі дарожныя, мары,
нязгоды,
Пероны, вакзалы, надзеі,
цягнік...
Дарэмна суцешыць мяне
хоча вецер,
Дарэмна адзіная зорка
мігціць.
Я ведаю, што нізавошта на
свеце
Не зможам сустрэцца
з табой мы ў жыцці.

І гэтак далей — яшчэ некалькі строф. Зачытаныя радкі належаць прадстаўніцы слабага полу, хаця ў літаратуры скідкі на гэта не робіцца. Але ж і мужчыны патанаюць у такім жа трывіяльна-альбомным, дробязным інтыме:

І ты да ранку не заснеш:
Сустрэнемся — хаваеш
вочы...
Мне не лягчэй, што нашы
ночы
Другому скупа аддаеш.
А мне хіба што дорыш сны...
Забыць бы ўсё, навек
адрынуць...
Але трывожаць успаміны —
Тры тыя нашыя вясны.

Таварышы, не будзем абурацца: навошта пісаць такое? Хто як можа — так і піша. Зрэшты, бываюць жа і творчыя няўдачы. Але навошта іх друкаваць —няўдачы? Якая патрэба? Што — не хапае мужнасці адхіліць, адмовіць? Дык знайдзіце гэтую мужнасць, калі ласка! Вам даверана выданне —часопіс ці газета — не для таго, каб тыражыраваць альбомную лухту. Вось чаму неабходна сёння падкрэсліць: уся віна цалкам кладзецца на тых, хто бласлаўляе падобнае вершатворства ў друк.

Сацыяльныя і маральныя праблемы ў жыцці — гэта і ёсць тое, чым штодзённа заняты і заклапочаны нашы людзі, якія побач з намі і наўкола нас, гэта іх працоўныя будні, іх турботы, іх трывогі і перажыванні. Якія ж яны і чым яны жывуць — калі меркаваць па нашых кнігах? Што такое сёння беларускі народ паводле беларускай жа літаратуры? Як, напрыклад, сённяшні беларус — нашчадак Лявона Зябліка, Міхала і Ганны, Лабановіча, Андрэя Летуна, Тварыцкага і Зосі — ставіцца да працы, да зямлі, да хлеба? Да багаццяў прыроды? Да памяці вайны? Да ідэалаў рэвалюцыі і прынцыпаў сацыялізму? Як ён глядзіць на грошы і багацце? На каханне і сям'ю? На ўзаемаадносіны бацькоў і дзяцей? На духоўную спадчыну продкаў? Як ён разумее свой грамадзянскі абавязак? Як уяўляе сабе, што ёсць дабро і што ёсць зло? Што ёсць чалавечая годнасць і што ёсць ганьба? Якія яго сённяшнія няпісаныя законы, норавы, звычаі, завядзёнкі?..

Пытанняў, як бачыце, многа, і марных сярод іх няма, — усё, чаго яны датычаць, з'яўляецца істотным у нашым грамадскім жыцці і ўсё моцна ўзаемазвязана: паруш адно — пачынае разбурацца другое. Ці дае наша сённяшняя творчасць на гэтыя пытанні дастаткова пераканаўчы, сацыяльна, маральна і эстэтычна змястоўны адказ? Зусім абегла я кранулся толькі некаторых з гэтых пытанняў, спадзеючыся, што таварышы, якія выступяць, істотна мяне дапоўняць.

Алесь Жук і Аляксей Дударaў

Тэма працы была, ёсць і будзе ў нашай літаратуры галоўнай, магістральнай — як бы ўпарта нехта з нас не забываўся пра гэта, ахвяруючыся на другараднае і дробязнае. Даўно было абвешчана: «Владыкой мира будет труд». Рэальнае панаванне працы і ёсць сапраўдная сутнасць сацыялізму. Чаго варты чалавек, яго аўтарытэт і значэнне, яго права на ўвагу і павагу, — у сацыялістычным грамадстве ўсё гэта вызначаецца адным крытэрыем — яго адносінамі да працы. На вялікі жаль, галоўныя прынцыпы нашага сацыяльнага ладу — «хто не працуе, той не есць» і «ад кожнага па магчымасці, кожнаму па працы» — для многіх сталі неабавязковымі, пачалі проста ігнаравацца. Задача літаратуры — раскрыць закладзеную ў гэтых прынцыпах невычэрпную маральную сілу, іх глыбокі гуманістычны сэнс, памагчы ўсвядоміць іх як аснову сацыяльнай і маральнай вартасці чалавека, аснову ўсяго таго добрага, што мы, людзі, не маем права траціць. Менавіта таму, а не выпадкова, вялікую ўвагу чытачоў і крытыкаў выклікалі такія творы найноўшай беларускай прозы, як «Алімпіяда» І. Пташнікава, «Пасеяць жыта» А. Кудраўца, «Паляванне на апошняга жураўля» А. Жука — творы, у цэнтры якіх вобразы шчырых, да самаахвярнасці добрасумленных працаўнікоў. І Уліма Падаляк. і Ігнат Сцяпанавіч Вапшчэткі, і Сцяпан Дзямідчык — гэта носьбіты той слыннай беларускай працавітасці, якая, на шчасце, яшчэ засталася ў нашым народзе і пра якую сумленнейшы сярод сумленных рускіх пісьменнікаў І. А. Васільеў зусім нядаўна пісаў: «Аднойчы, вярнуўшыся з паездкі па Беларусі, я выказаў сваім землякам папрок у ляноце. На мяне пакрыўдзіліся... Але я бачыў, як працуюць нашы суседзі і як працуем мы. На жаль, параўнанне не ў нашу карысць» («Комсомольская правда», 29.03.1987). Названыя толькі што творы — не рытарычны, а мастацка пераканаўчы заклік — даражыць гэтай нерастрачанай якасцю нацыянальнага характару, даражыць і культываваць яе ў душах чалавечых, паглыбляць і ўмацоўваць у свядомасці народнай. Калі дзе і не трэба баяцца прыёмаў гэтак званай паэтызацыі — дык гэта ў паказе працы. Граху не будзе. Бо нідзе і ні ў чым чалавек не бывае такі прыгожы, нідзе так поўна не раскрываецца яго духоўная сутнасць, як у таленавітай і самаадданай, грамадска карыснай працы. І, думаю, зусім слушна крытык Г. Шупенька называе раман І. Пташнікава «апафеозам працы чалавечай». Сапраўднае хараство душы працоўнага чалавека, яго сацыяльная актыўнасць і маральная высакароднасць — прадмет мастацкага даследавання ў многіх найноўшых творах беларускай літаратуры, розных як па жанру, так і па ідэйнай праблематыцы. Прыгадайма Мар'яна Знаўца з Казьковай «Хронікі дзетдомаўскага сада» — апантанага жыццёвай марай садзіць і даглядаць на роднай зямлі сад, што для яго азначае — і гадаваць у чалавеку гістарычную памяць, пачуццё духоўнай еднасці пакаленняў, пераемнасці народных традыцый. Прыгадайма старога Антося з аповесці «Вырай» В. Блакіта і такога ж старога, адзінокага Лаўрэна Маркевіча з рамана «Карані» А. Карпюка: што іх неадольна цягне на роднае котлішча, у сваю хату? Пражытае там доўгае працоўнае жыццё — пражытае сумленна, з годнасцю, без той дробязнай мітуслівасці, што стала сутнасцю маральна не ўгрунтаванай душы іхніх адарваных ад зямлі дзяцей. Прыгадайма вобразы простых вясковых людзей з апавяданняў Х. Лялько—тых, якім аўтар шчыра і горача сімпатызуе: Яся з «Касцоў», Гэльку з «Лёгкага хлеба», Сцяпана Забелу з «Бярэзніка на загонах»... Колькі ў іх добрай жыватворнай сілы, колькі веры ў сваю правату — правату гаспадара гэтай зямлі, і разам з тым — колькі горкага суму і болю!.. Прыгадайма санітарку Ліду з апавядання І. Жарнасек «Санітарка» — нястомную ў сваёй гатоўнасці дапамагаць людзям, поўную міласэрнай дабрыні, якую так лёгка пакрыўдзіць. Апавяданне ўражвае сілай унутранага, маральнага пратэсту: чалавек на кожным кроку робіць дабро, і ён жа на кожным кроку вымушаны цярпець ад людзей жорсткіх, фанабэрыстых, хамаватых... Прыгадайма, нарэшце, героя п'есы А. Дударава «Вечар» — лепшай, на маю думку, з усіх п'ес драматурга. Якая глыбіня і моц сапраўды народных, панароднаму цэласных характараў!..

Я называю творы прозы і драматургіі, а між тым у стварэнні абагульненага вобраза сучаснага беларуса немалая заслуга належыць і паэзіі. І неабавязкова эпічнай паэме. Нагадаю, для прыкладу, кнігі вершаў «Пара любові і жалю» і «Каліна зімы» Яўгеніі Янішчыц. Янішчыц — паэт - лірык, і лірык выдатны, усесаюзнага ўзроўню і маштабаў, паэт рэдкай сілы лірычнай пранікнёнасці. А ў вершах у яе столькі народных вясковых характараў, тыпаў, чалавечых лёсаў — як у добрай эпапеі. Маці і бацька, дзядзькі і цёткі, дзяды і бабулі, суседзі, суседкі, аднавяскоўцы, і зноў маці, і яшчэ шмат разоў маці — бясконца прывабны вобраз простай беларускай жанчыны. І якімі ж трапнымі, псіхалагічна дакладнымі, эпічнымі мазкамі ды штрыхамі ўсе яны намаляваны! Гэта першы паказчык, чым жыве паэт, на што скіраваны зрок яго душы і сэрца.

Можна было б прывесці і яшчэ нямала падобных прыкладаў, але абмяжуюся гэтымі: бо іначай і да майго даклада прыкладуцца горка-невясёлыя радкі паэта В. Сахарчука:

Герояў смелых, непадманных,
Як ні ўздыхай, як ні круці,
Найбольш — у вершах і
раманах,
І вельмі мала — у жыцці.
(«Маладосць», 1985, № 8).

Думаецца, што ў нашым жыцці людзей «смелых і непадманных» усё-такі больш, чым здаецца паэту. Можа быць, каму-небудзь з нас проста не шанцуе на сустрэчу з такімі героямі. Што ж датычыць раманаў і вершаў, г. зн. літаратуры, то папрок паэта я разумею як незадаволенасць слабым гучаннем у ёй чалавечага болю і трывогі, выкрывальна-самакрытычнага пафасу. Незадаволенасць, скажам, тым, што ў нас пакуль яшчэ не паявіліся такія творы — пра нашу сучасную рэчаіснасць,—як «Пажар» В. Распуціна, «Сумны дэтэктыў» В. Астаф'ева, «Плаха» Ч. Айтматава, — творы такога ж нізкага балявога парога і такой жа гранічнай бясстрашнай, самаахвярнай непрымірымасці да бяздумнага спажывецтва, да крывадушша, да подласці і ўсякага іншага гадства. Хачу на гэта сказаць, што ў нас такі твор ёсць, толькі ён напісаны не прозай, а вершамі. Гэта новая кніга паэзіі Пімена Панчанкі «І вера, і вернасць, і вечнасць». Крык душы, які рвецца з гэтай кнігі, нічуць не слабейшы за той, што так глыбока і балюча працяў нашы сэрцы са старонак названых вышэй твораў.

Увогуле ж голас сумлення ў нашай літаратуры мацнее, пафас непрымірымасці да маралі бюракратаў і перараджэнцаў, да пазіцыі душэўна атлусцелых, да філасофіі мяшчан і абывацеляў — нарастае, набірае сілу.

Зямля не любіць пуставаць —
жадае быць жытнёвым полем;
не будзем сеяць — і
куколлем
пачне патроху зарастаць.
Душа не любіць пуставаць —
жыве надзеямі на шчасце;
будзіць не будзем — і ў
мяшчанства
пачне паціхеньку ўрастаць.
(«Маладосць», 1985, № 10).

Гэта — Алесь Каско, яго пранікнёнае слова. З найноўшых твораў у гэтым сэнсе вылучаецца публіцыстычная паэма С. Законнікава «Кульмінацыя».

А ўсе маўчаць і вочы
закрываюць,
І лічаць — праўда знойдзецца
сама.
Мы пачакаем — наша хата
з краю...
А краю нейкага ў жыцці
няма!
(«Полымя», 1987, № 4)

Думаю, што гэты антымяшчанскі настрой і ў паэзіі, і ў прозе, і ў драматургіі, і, вядома, у публіцыстыцы будзе шырыцца і глыбець, набываць усё больш бескампрамісны характар, і, можа быць, у гісторыі беларускай ды і ўсёй савецкай літаратуры канец 80-х гадоў будзе калі-небудзь названы антымяшчанскім перыядам. Натуральна, калі ў гэтым часе, у такіх грамадскіх умовах пачне ажываць і гаварыць сваё важкае слова неверагодна заняпалая ды і занядбаная ў нас сатыра. Толькі што пастаўленая купалаўцамі вострая, з'едлівая камедыя М. Матукоўскага «Мудрамер» — будзем спадзявацца — адна з першых ластавак блізкай вясны ваяўнічага, наступальнага смеху.

Узмацненне голасу душы, якой ведамы мукі, нарастанне прагі маральнага ачышчэння адчуваецца не толькі ў творах аб сучаснасці. Гэта прыкметна і ў кнігах пра нядаўняе мінулае — пра вайну і перадваенныя гады. Што да творчасці В. Быкава, дык у яго ад самага пачатку суд сумлення — пастаянная ідэйная дамінанта. І на гэты суд выносяцца ўсё больш складаныя, экстрэмальныя сітуацыі, ад чаго паўней і глыбей раскрываецца маральная філасофія пісьменніка. Рускі крытык У. Васільеў нядаўна пісаў: «Кар'ер» Быкава — рэч, дзе падспудна адчуваецца духоўная прысутнасць Талстога». Гэта бясспрэчна так. Вернасцю духу найвялікшага пісьменніка-гуманіста вызначаецца і новая, толькі што апублікаваная ў «Полымі» аповесць Быкава «У тумане». Не ведаю, што пра яе скажуць крытыкі, я ж пакуль што зазначу: па-першае, прытчавы пачатак у ёй бадай ці не мацнейшы, чым у любой з яго ранейшых аповесцей; па-другое, вобраз Сушчэні — новая значная творчая ўдача пісьменніка.

Напружанымі маральнымі пошукамі жывуць героі трэцяга рамана В. Адамчыка «І скажа той, хто народзіцца». Клопатам пра чысціню свайго чалавечага і партыйнага сумлення, пра перамогу справядлівасці жывуць і героі рамана І. Новікава «Ачышчэнне».

Адна з самых вялікіх і актуальных сёння сацыяльна-маральных праблем нашай рэчаіснасці — праблема сям'і, сямейных узаемаадносін, бацькоў і дзяцей. Здаецца, мы пачынаем ужо горка шкадаваць, што ні сама грамадскасць, ні літаратура доўга не надавалі ёй належнага значэння. Кажу: і літаратура, хаця на гэту тэму пісалася і пішацца ў нас вельмі многа. Што з гэтага мноства працягвае добрыя традыцыі беларускай класікі? Таксама нямала. Іван Шамякін — да яго гонару — не абмінуў гэтай тэмы бадай што ні ў адным сваім буйным творы, і ў самых апошніх таксама, паглядоўна захоўваючы вернасць аснозам народнай сямейнай маралі і педагогікі. З найноўшых твораў, у якіх зроблены сур'ёзныя спробы разабрацца ў складаных сямейных калізіях, у сацыяльных і псіхалагічных прычынах распаду сям'і, я назваў бы раман І. Навуменкі «Летуценнік». У абарону сям'і, калі можна так сказаць, і супраць мяшчанскай маралі напісаны аповесці «Сучасны канфлікт» А. Карпюка, «Дождж на світанку» А. Вараніовіча, раман В. Гігевіча «Мелодыі забытых песень» і многія іншыя. Бяда, аднак, у тым, што пераважнай большасці твораў гэтай тэматыкі чагосьці істотнага нестае. Можа быць, якраз той вышыні маральнага ідэалу, якой вымяраўся пагляд працоўнага народа на сям'ю і сямейныя справы. Назіраецца пэўная, а часам і вялікая ўступка сучаснай літаратурнай і кіношнай модзе на «клубнічку», на аблегчаны падыход да ўзаемаадносін «яго і яе», да ўтварэння сям'і, на нейкую, я сказаў бы, «партатыўную» мадэль кахання. Відаць, усё-такі наша літаратура слаба супрацьстаіць гэтай небяспечнай пошасці.

Праблема сям'і і дзяцей — гэта, па сутнасці, праблема становішча, правоў і абавязкаў жанчыны. Ці ўсё ў гэтых адносінах у нас добра? Не думаю. Бяда пачалася з гадоў вайны. Мы не сказалі тысячнай долі праўды пра трагедыю, якая спасцігла мільёны нашых жанчын, навек аўдавелых або навек астаўшыхся незамужнімі. Пазней жанчына пачала траціць жаноцкасць у выніку непадрыхтаванасці да гэтак званай эмансіпацыі, да новага сацыяльнага становішча. На вытворчасці і на службе не жанчыны ўплывалі дабратворна на мужчын, а мужчыны на іх, і зусім недабратворна. Мужчыны не дапамаглі ім выстаяць, а няйначай подла радаваліся, бачачы, як апускаюцца, духоўна і маральна, многія нашы мадонны.

Яшчэ ў горшым становішчы сёння праблема «бацькоў і дзяцей». Яна набыла крызісны характар і блізкая да таго, каб мы зусім зайшлі з ёй у тупік. Дзіця не можа нармальна выхоўвацца ў той сям'і, якой фактычна няма: ёсць агульная кватэра, гаспадарка, дача, машына

ПЛЕНУМ ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ

— але не сям'я, не маналіт з кахання і павагі. Ужо не кажучы пра дзяцей-бязбацькавічаў, колькасць якіх расце не па днях, а па гадзінах. Выхаваўчая роля школы — па прычыне, што яна сама ў заняпадзе — яўна нездавальняючая. А што ж літаратура — перш за ўсё дзіцячая і юнацкая? Якая ад яе дапамога? Вельмі слабая! Назавіце яркую, моцную кнігу, якая б выхоўвала ў дзіцяці любоў да бацькі і маці, вучыла б шанаваць бацькоў і наогул старэйшых? Я такой кнігі — паўтараю: яркай і моцнай — не ведаю.

Натуральна запытацца: а як да ўсіх найбольш важных сацыяльна-маральных праблем грамадства ставіцца наша мастацкая публіцыстыка і эсэістыка? Адказаць не проста: сцвярджаць, што ставіцца з прахалодцай, без пачуцця абавязку і адказнасці,— нельга, гэта было б несправядліва. Сцвярджаць, што да гэтых жанраў-першапраходчыкаў у нашых чытачоў няма прэтэнзіі,— значыла б гаварыць няпраўду. На маю думку, у нас ёсць бясспрэчна цікавыя, змястоўныя творы, якія апраўдваюць высокае прызванне і годнасць пісьменніка-публіцыста. Напрыклад, артыкулы аб школе і дзецях В. Віткі, дакументальныя аповесці А. Казловіча, нарысы І. Дуброўскага, нарысы і артыкулы В. Якавенкі, Я. Будзінаса, эсэічныя публікацыі С. Алексіевіч і М. Вайцяшонак...

Аб тым, як плённа наша эсэістыка можа працаваць на вялікую, сацыяльна і маральна значную тэму, добра сведчыць толькі што апублікаваная ў «Полымі» падарожная аповесць-эсэ Віктара Карамазава «Глядзіце ў вочы лемура». Звыклы для беларускай літаратуры пафас інтэрнацыяналізму, дух брацтва людскога выказаны ў ёй вельмі натуральна, шчыра і проста, без фарсіравання тону, без наўмыснага падкрэслівання. І яшчэ: уражваюць і запрашаюць на роздум старонкі, у якіх расказваецца пра давер жывой прыроды да чалавека. І горлінка, і чайкі з крачкамі, і акіянскія рыбы ў прыбярэжных водах, і чарапаха, і мімоза—нішто на Сейшэльскіх астравах яшчэ не баіцца чалавека!... Як не задумацца сапраўды, бачачы, у што абярнуўся даавер прыроды да нас на нашай роднай зямлі.

Як своеасаблівая палітычная падсветка тым нашым унутраным праблемам, пра якія мы гаворым, успрымаецца выдадзеная ў пачатку гэтага года кніга А. Вярцінскага «Нью-Йоркская сірэна», з якою ён выступіў у якасці публіцыста-міжнародніка.

Пры ўсім тым даводзіцца прызнаць, што ў цэлым беларуская публіцыстыка і эсэістыка не заваявалі ўзагу шырокага чытача, прагнага сёння да літаратуры дакумента, факта, думкі. Яны ў нечым істотным уступаюць гэтым жанрам у сучаснай рускай літаратуры. У чым канкрэтна? Можа быць, у смеласці, у вастрыні, у ваяўнічасці; нестае ім і сапраўднай філасофіі факта, і, мушу падкрэсліць, высокай культуры размовы з чытачом, культуры пісьма, бляску стылю, моўнага майстэрства... Вось і атрымліваецца, што далёка не кожны нумар нашых літаратурных выданняў дорыць чытачам радасць сустрэчы з разумным, баявітым, гарачым публіцыстычным словам. А гэта ўжо кепска; з увагі ж на час, у які мы жывём, гэта, скажам папраўдзе, і зразумець немагчыма. Часопіс без публіцыстыкі — без усхваляванага жывога голасу самога часу — выбачайце, не часопіс. Гэта хутчэй літаратурны зборнік або альманах, няхай сабе і штомесячны. Сардэчным вузлом і пульсам часопіса спакон веку была публіцыстыка. Пра гэта гаворыць і этымалогія самога слова «часопіс». Так што задача і перад калектывамі рэдакцый, і перад усімі намі стаіць зусім ясная: пара стварыць моцную і дзейсную беларускую публіцыстыку. Публіцыстыку, якая разбудзіла б, нарэшце, у беларускіх чытачоў гарачую цікавасць да гэтага жанру і прымусіла б іх саміх браць слова ў гаворцы, у спрэчках-дыскусіях, якая прыцягвала б іх да абмеркавання вялікіх міжнародных і ўнутраных праблем і спрыяла б росту іх палітычнай і маральнай свядомасці, іх грамадскай актыўнасці.

Асабліва крыўдна, што ў нас зусім мала публіцыстыкі, якая б вызначалася глыбокім паяднаннем праблем асабовых і глабальных, нацыянальных і агульналюдскіх, у якой бы мудра спалучаўся клопат пра чалавека з клопатам пра лёс планеты. Ідэю гэтага паяднання выдатна, на маю думку, выказала ў сціслай паэтычнай формуле Любоў Тарасюк:

Я ратую душу ад распаду.
Можа, з ёй уратуецца свет.

Так, каб не распаўся свет — трэба засцерагчы ад распаду душу чалавечую, іншага спосабу няма.

Зусім зразумела, што сучасны пісьменнік не можа моўчкі назіраць за тым, як устрывожанае чалавецтва прымае ўсемагчымыя захады, каб уратаваць мір і жыццё на зямлі. Голас беларускіх літаратараў — абаронцаў міру — ва ўсе пасляваенныя гады гучаў і гучыць вельмі напружана і чуцен далёка. Гучыць і ў мастацкіх творах, і ў дакументалістыцы, і ў публіцыстычных выступленнях. Згадаем вершы і паэмы А. Куляшова, П. Панчанкі, Максіма Танка, Р. Барадуліна, Г. Бураўкіна, А. Вярцінскага, С. Гаўрусёва, В. Зуёнка, аповесці В. Быкава, дакументальныя кнігі А. Адамовіча, Я. Брыля і У. Калесніка, С. Алексіевіч... Асабліва хацелася б адзначыць надзвычай актыўную ў гэтым кірунку публіцыстычную дзейнасць А. Адамовіча. Адно бянтэжыць, што ў нас пачалося якоесьці празмернае захапленне апакаліпсічнымі сюжэтамі, відовішчамі «ядзернай зімы»—дарэчы, у мастацкіх адносінах досыць бляклымі. Зварот да такіх сюжэтаў Адамовіч лічыць для сучаснага пісьменніка «звышзадачай». У дыялогу з крытыкам Н. Івановай («ЛГ», 1.10. 1986) ён гаворыць: «Ды і не цікава мне ўжо самому не рашаць звышзадачы. Ну, хоць бы такую: што і як скажа **сабе**, застаючамуся без нас Сусвету апошні на Зямлі забойца?..» Хочацца запытаць: няўжо гэта—звышзадача для мастацкай літаратуры? Уявіць, што скажа сабе маньяк або нелюдзь, які загубіў свет? Што, напрыклад, сказаў бы сабе Адольф Гітлер, калі б ён застаўся на свеце адзін?.. Нешта ўва мне супраціўляецца супроць такога сюжэта, такога падыходу, і я пакутліва думаю: што? Я горача падтрымліваю заклік, што трэба несціхана і ўсё мацней біць у набат Розуму і Сумлення, каб уратаваць свет ад тэрмаядзернай катастрофы, каб не дапусціць пагібель чалавецтва, каб людзі ясна зразумелі, якое жахлівае тое «нічога», што застанецца ў выніку апакаліпсіса. Што ж тады ўсё-такі мяне бянтэжыць? Можа быць, нейкая маральная нявыверанасць у гэтым сюжэце пра забойства жыцця на Зямлі? Можа, нейкі перакос у гэтай страшнай гульні фантазіі? Пэўная няўзгодненасць з мараллю і філасофіяй самога жызога чалавека?

Баюся, што выказаная мной трывога — небеспадстаўная. Калі з гэтым пытаннем не разабрацца і не адрэгуляваць яго ў грамадскай свядомасці, то захапленне апакаліпсічнымі сюжэтамі можа ў руках спрытных рамеснікаў перарасці ў спекуляцыю на тэме, на страхах-жахах. Пойдуць касякамі і раманы, і аповесці, і паэмы, у якіх не будзе ні таленту, ні жывога чалавечага сэрца.

Адна з выяўна вострых сёння сацыяльна-маральных праблем у нас на Беларусі — гэта нашы адносіны да сваёй гісторыі, да нацыянальнай мастацкай культуры, да роднай мовы, да духоўнай спадчыны народа. Думаецца, што гэтыя адносіны покуль што добрага слова не заслугоўваюць. Вазьміце наша веданне гісторыі Беларусі — зямлі, на якой жывём і патрыётамі якой быць абавязаны. Для насельніцтва рэспублікі, паколькі яно прайшло праз нашы школы, гэта гісторыя пачынаецца фактычна з рубяжа XX стагоддзя, а што было датуль —на працягу добрых дзесяці вякоў — амаль нічога невядома. Галоўная наша бяда ў тым, што беларускія вучоныя-гісторыкі ў большасці сваёй усё яшчэ сядзяць пад абэцэдарскім калпаком і баяцца выткнуць з-пад гэтага калпака галаву. Спадзявацца на іх падмогу нам, пісьменнікам, на вялікі жаль, не прыходзіцца. Трэба самім церабіць сцежкі да гістарычных фактаў і адкрываць іх народу. Асабліва важна рабіць гэта ў дачыненні да гісторыі нашай культуры, таму што, як пісаў у газеце «Правда» Сяргей Залыгін, «няма культуры без гісторыі культуры, і пачынаецца яна там, дзе пачынаецца яе гісторыя» (26.09.1986).

Як у Расіі, так і ў нас у Беларусі, нядобрыя сілы стараліся нашу гістарычную памяць усыпіць. Вядома, песенькай: люлі-люлі, баю-бай. Ну, а калі песенька не памагала і ў нянькі канчалася цярпенне, тады і злосным вокрыкам: «Спі, а то дам! Спі, кажу табе!..» Але гістарычная памяць народа—не дзіцятка, яна спаць не можа і не павінна. І яе трэба не ўсыпляць, а будзіць. Без гістарычнай самасвядомасці цяжка вырашаць усе іншыя жыццёва важныя для нацыі і нацыянальнай культуры пытанні. Што можа зрабіць на карысць беларускай культуры гаспадарнік або адміністратар, у якога пры імені Каліноўскага, Багушэвіча, Цёткі, Купалы, Коласа, Багдановіча не здрыганецца гарачым трапятаннем сэрца, які не скажа сабе пранікнёна, як малітву: «Ды гэта ж тыя, што запалілі светач, каб вывесці тваіх цёмных дзядоў у людзі! Гэта ж тыя, без якіх ні самой беларускай нацыі, ні беларускай дзяржавы проста не было б! І будзеш ты бяздомным прыблудам, а не сынам гэтай зямлі, калі для ўшанавання іх памяці не зробіш тое, што ад цябе залежыць!»

Адной з прычын распэўсюджанага ў Беларусі прыніжанага пачуцця нацыянальнай годнасці якраз і ёсць тая сумная акалічнасць, што недаразальна мала кніг пра выдатныя падзеі і пра вялікіх людзей Бацькаўшчыны за цэлае тысячагоддзе: ад першых полацкіх і тураўскіх князёў і да нашых дзён. Вось чаму раскатурханне гістарычнай самасвядомасці ў масах беларускага чытача — надзвычай актуальная задача нашай літаратуры. Трэба з прыемнасцю адзначыць, што бадай ва ўсіх яе жанрах за апошняе дзесяцігоддзе адбыўся прыкметны паварот да мастацкага асэнсавання айчыннай гісторыі, вобразнага ўзнаўлення яе пэўных момантаў, значных падзей і выдатных асоб. Пісьменнікам як бы нарэшце стала сорамна заставацца ўбаку ад грамадзянскага і творчага подзвігу незабыўнага У. Караткевіча. Гістарычнай або гісторыка-рэвалюцыйнай тэме прысвячаюць свае раманы, аповесці, апавяданні, п'есы І. Шамякін, Л. Дайнека, В. Хомчанка, Э. Ялугін, В. Іпатава, У. Мехаў, Л. Арабей, Э. Скобелеў, А. Петрашкевіч і іншыя. Асабліва знамянальна, што паявіліся празаікі, якія што называецца з галавой акунуліся ў нашу гістарычную даўніну. Маю на ўвазе У. Арлова і К. Тарасава. Побач з прозай і драматургіяй загаварыла мовай пашаны да айчыннай гісторыі паэзія. Прыгадаем паэмы А. Куляшова, Максіма Танка, В. Зуёнка, М. Арочкі, Р. Баравікоўай, В. Коўтун, Т. Бондар, балады Я. Сіпакова, Р. Семашкевіча, Р. Барадуліна, А. Разаназа, вершы Д. Бічэль-Загнетавай, М. Пракаповіча, С. Панізніка, А. Каско, Л. Тарасюк, Ю. Голуба і — прашу прабачэння — многіх іншых. Выдатна, што асэнсаванне гістарычнага лёсу беларускага народа, роздумы пра яго культуру і мозу мы знаходзім і ў многіх творах, якія да ўласна гістарычнай тэматыкі не аднясеш. Спашлюся — дзеля эканоміі часу — толькі на два прыклады. Першы — многія старонкі «Палескай хронікі» І. Мележа. Другі — рэтраспекцыйныя раздзелы ў аповесці В. Быкава «Знак бяды», якія істотна паглыбілі ідэйна-філасофскі змест твора, і некаторыя моманты з ягонай жа аповесці «Кар'ер». Несумненна, што Быкаў, упершыню кінуўшы зусім выразны пагляд на пэўныя падзеі ў гісторыі беларускага народа з удзелам у іх канкрэтных гістарычных асоб, зрабіў у сваёй творчасці вельмі важны крок наперад.

Такім чынам, зрух у асвятленні нашай літаратурай гісторыі Беларусі намеціўся, але нам пазнна быць ясна, што мы стаім яшчэ ў самым пачатку вялікай работы. Я ўжо дзесьці гаварыў прынародна і сёння скажу яшчэ раз: калі мы напішам і апублікуем хаця б дзвесце таленавітых гістарычных раманаў, аповесцей, п'ес, паэм — тады мы, як-то кажуць, пабачым і паглядзім, якое ў нашых чытачоў будзе самаадчуванне. Заадно глянем і на фізіяноміі сённяшніх скептыкаў і песімістаў, якія не вераць у заўтрашні дзень беларускай культуры. Пры гэтым хацелася б ладкрэсліць, што пісаць добрыя, значныя гістарычныя творы цяжка. Апрача таленту, патрэбны вялізныя веды, навукова аб'ектыўная і класава дакладная пазіцыя. Патрэбна належная ўзброенасць марксісцка-ленінскай метадалогіяй. Марксісцка-ленінскай, а не яе абэцэдараўскай інтэрпрэтацыяй. Дарэчы, нашым нядобразычліўцам на Захадзе лёгка біць менавіта абэцэдаршчыну і іншыя разнавіднасці дагматызму ў гістарычнай навуцы. Але яны бяссільныя змагацца з праўдзівым, навукова-аб'ектыўным асвятленнем гісторыі. Яны робяцца адразу абяззброенымі, таму што праўда—гэта наша зброя, а не іх:

Выхаванне пачуцця павагі да гісторыі Бацькаўшчыны неадрыўна ад выхавання любові да роднага краю, да яго культуры і мовы. На апошнім пленуме СП СССР у Маскве востра крытыкавалася ідэйна-маральная няслушнасць вядомых песенных радкоў: «Мой адрас — не дом і не вуліца...». Гаварылі аб тым, што на фронце кожны салдат пры сабе, дзе-небудзь у надзейнай кішэньцы хаваў свой адрас — менавіта з указаннем і дома, і вуліцы. На выпадак смерці... Як жа можна было 20 гадоў круціць амаль штодзённа і на ўсю краіну гэту шкодную для патрыятычнага выхавання песню? А круцілі! І думалі, што ў імя і на карысць інтэрнацыяналізму. Першы віноўнік гэтага — чыноўніцка-бюракратычны страх перад чалавечай любоўю да роднага дому, да роднай мовы і песні,

Старшыня праўлення Саюза мастакоў БССР Уладзімір Сталмашонак і Генадзь Бураўкін.

страх перад ростам нацыянальнай самасвядомасці. Між тым, рост нацыянальнай самасвядомасці ва ўсіх рэспубліках Саюза — гэта самы непасрэдны вынік ажыццяўлення сацыяльных ідэалаў рэвалюцыі. Кастрычнік адкрыў мільёнам людзей доступ да асветы, да навукі, да культуры, а ў такіх умовах усведамленне сваёй нацыянальнай годнасці непазбежнае. Гэта цёмны чалавек можа заставацца ў становішчы несвядомага тутэйшага, а чалавек адукаваны раней ці пазней пачынае разбірацца ў сабе. 70 гадоў родная Савецкая ўлада і ленінская партыя яму спрыялі ў гэтым. І калі сёння ўсё-такі яшчэ многа ў нас нацыянальных нігілістаў — значыць, былі нейкія перашкоды таму, каб яны сталі нацыянальна свядомымі.

Думаю, што адна з галоўных перашкод — гэта звужэнне сферы карыстання беларускай мовай у Беларусі. Па гэтаму пытанню ў апошні час гаварылася і гаворыцца ў нас многа, і я не буду запыняцца на ім падрабязна. Адзначу толькі зусім коратка некалькі момантаў. Першае: ёсць няпісаны маральны закон, паводле якога, як натуральна для чалавека дыхаць, піць і есці па нараджэнні — гэтак жа павінна быць натуральна, каб дзіця, нарадзіўшыся на гэтай зямлі, пачынала гаварыць на мове гэтай зямлі. Гэта — у інтарэсах самога дзіцяці, у інтарэсах яго маральнага і наогул духоўнага развіцця, дзеля станаўлення яго чалавечай асобы. І гэта зусім не значыць, што пазней дзіця не авалодае іншымі мовамі. Другое: зямля і мова, у сэнсе — уся навакольная прырода і мова, зямля і душа народа, мова і душа народа, мова і гісторыя народа, гісторыя яго культуры, — усё гэта існуе ў цэласнасці і непарыўнасці, гэта нельга разрываць, таму што іначай — крах патрыятычнай свядомасці, крах

(Працяг на стар. 6).

ПЛЕНУМ ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ

(Працяг. Пачатак на стар. 1—5).

маралі, крах культуры, а замест усяго гэтага — бездухоўнасць, цынізм, пошласць, спажывецкая псіхалогія, корць разбурэння, дыктат нізменных жывёльных інстынктаў. Трэцяе: мова, якая не ўдзельнічае ў арганізацыі працы, у арганізацыі грамадскага жыцця, больш таго — нават у арганізацыі сямейнага быту, — траціць жыццёвую сілу, кансервуецца, пераходзіць у разрад музейнай экзотыкі. Іншымі словамі — спыняецца ў развіцці. Што ж яе чакае? У элементарных падручніках па дыялектыцы напісана: тое, што не развіваецца, — памірае.

Зыходзячы са сказанага, выснову можна зрабіць толькі адну: трэба ўсямерна садзейнічаць таму, каб наша мова нармальна функцыяніравала ва ўсіх сферах грамадскага жыцця, каб ёю — скажам так — не саромеліся карыстацца ўсюды і скрозь гэтак жа, як рускай

Віктар Карамазаў, Анатоль Грачанікаў і Анатоль Кудравец.

мовай. Яна выдатна распрацавана як мова літаратурная і гатова абслугоўваць жыццядзейнасць грамадства на ўсіх магчымых узроўнях. Менавіта ў гэтым і заключаецца парадаксальнасць сітуацыі. З аднаго боку — сапраўдны росквіт філалагічных навук, шматтомныя выданні самых розных слоўнікаў, шматлікія энцыклапедычныя выданні, 40-томны звод нацыянальнага фальклору, набывалі размах выдання нацыянальнай літаратурнай класікі і многае іншае, што яшчэ гадоў трыццаць назад магло нам толькі сніцца. І ўсё гэта, зразумела, кладзецца ў фундамент далейшага развіцця нацыянальнай культуры. Разам з тым — з другога боку — усё больш прыкметнае звужэнне сферы, у якой мы карыстаемся родным словам.

Такі рэальны стан рэчаў і такім яго трэба цвяроза ўспрымаць — з тым, каб не сядзець склаўшы рукі, а шукаць выйсце са становішча, рабіць канкрэтныя захады да выпраўлення сітуацыі. І першае, з чаго мы павінны пачаць, — гэта рашуча адкінуць той песімізм у паглядах на будучыню нашай мовы, які выказваюць нават некаторыя нашы калегі. Я звяртаюся да іх з просьбай: дарагія таварышы і сябры, усё што хочаце — толькі не песімізм! З песімізмам мы, як-то кажуць, і з месца не скранемся. Сацыяльны песімізм увогуле штука нядобрая — і не для нас. Нам патрэбна вера і толькі вера. Тым больш у такі час, калі грамадства знаходзіцца на гістарычным пераломе. І гэта не танны казённы аптымізм. Гэта — адзінае, на што мы маем маральнае права. На песімізм такога права ў нас няма. За нашымі плячамі — тысяча гадоў развіцця нашай пісьменнасці, літаратурнай мовы, самой літаратуры і ўсёй духоўнай культуры народа. Гэта прызнана ўсім светам. Як жа мы, беларускія літаратары, павінны пачувацца, ведаючы, што за намі — тысячагадовы шлях пакут і барацьбы многіх пакаленняў, ведаючы, якая велізарная духоўная спадчына нам дасталася? Не толькі — з якою гордасцю мы павінны думаць пра гэта, а перш за ўсё — з якою адказнасцю? Тысячу гадоў збіраўся, накопліваўся, нарастаў духоўны скарб народа — і цяпер нехта мае права паставіць на ім крыж? Нікому з нас, сёння жывучых, такога права не дадзена, нікому! Не намі пачалося— і не намі кончыцца. Наш абавязак — прадоўжыць і перадаць наступнікам, нашчадкам. І менавіта перад лёсам нашчадкаў амаральна думаць: на мой век, маўляў, хопіць, а там — хоць трава не расці!.. Вось чаму песімізму некаторых нашых старэйшых таварышаў я хачу проціпаставіць веру і ўпэўненасць маладых, добра выказаную ў вершы 23-гадовай Вольгі Куртаніч:

Адчыніце дзверы, людцы,
Адсюль хай далятае:
Словы родныя куюцца...
Кросны родныя снуюцца...
Песні родныя пяюцца...
Мова,
Мова
Нас вітае!

(«Маладосць», 1987, № 5).

Вось—і пазіцыя, і настрой, і талент! З такім настроем будзем глядзець у будучыню.

Усё, што было тут сказана пра неабходнасць павагі да сваёй гісторыі, да культуры, да мовы, — гэта элементарныя і агульнавядомыя ісціны. Табліца множання ў прымяненні да тэорыі і практыкі нацыянальнага будаўніцтва ў нашай шматнацыянальнай краіне. Пра гэта цяпер гаворыцца ва ўсесаюзным друку амаль кожны дзень. Пытанне — не дыскусійнае. У Праграме КПСС — новая рэдакцыя — зусім ясна вызначана магістральная лінія ажыццяўлення ленінскай нацыянальнай палітыкі, згодна з якою ў нашай краіне будзе адбывацца далейшы росквіт кожнай нацыі і яе культуры і праз гэты росквіт—іх збліжэнне. Іншая рэч, што існуе і такі ўзровень разумення праблемы, які лічыць магчымым развіццё нацыянальнай культуры без развіцця нацыянальнай мовы — г. зн. культуры без свайго аблічча і без свайго ўласнага голасу. Што гэта будзе за культура і каму яна такая будзе патрэбна — пра гэта на ўказаным узроўні не задумваюцца. Наколькі лёгка будзе нам пераадолець вось такі ўзровень разумення праблемы, пасведчыў артыкул члена нашай пісьменніцкай арганізацыі С. Букчына, змешчаны нядаўна ў «Литературной газете». Ёсць у артыкуле асобныя слушныя заўвагі, але ёсць і такое, з чым рашуча пагадзіцца нельга. Папершае, цытату з майго выступлення на пленуме СП СССР аўтар неяк хітра прывязаў да сваёй думкі, якую я катэгарычна не прымаю, а менавіта, што ўмовы, у якіх апынулася наша родная мова, склаліся натуральна і што сама сённяшняя моўная сітуацыя ў Беларусі — натуральная. Па-другое, Букчын лічыць, што вярнуць беларускай мове прэстыжнасць ніякія захады і мерапрыемствы не памогуць. А што можа памагчы? Толькі адно: пішыце свае беларускія кнігі на такім высокім узроўні, каб яны не залежваліся. Пішыце, гаворыць ён, на ўзроўні Быкава, Караткевіча і Разанава. Ну, а паколькі аўтар артыкула сам пісьменнік і яго кнігі, мабыць, таксама не залежваюцца, — значыць, і на мастацкім узроўні Сямёна Букчына. Як усё проста вырашаецца! Аказваецца, мы, беларускія пісьменнікі, перш за ўсё і вінаваты ў сённяшняй непрыстыжнасці нашай роднай мовы. У народзе ў такім выпадку кажуць: і б'юць, і плакаць не даюць. Тым, хто разлічвае на наіўных і хоча зацямніць справу, адкажу зусім ясна: прэстыжнасць беларускай мовы залежыць не толькі ад тых, хто на ёй піша, але і ад таго, як увогуле ставяцца да яе ў грамадстве.

І яшчэ — ужо ў сувязі з праблемай маралі і маральнасці. Калі сённяшні боль усёй беларускай інтэлігенцыі за сваё роднае слова некаму не баліць, калі некага зусім не хвалюе, што ў нашых гарадах англійскія школы ёсць, а беларускіх няма, дык элементарная маральнасць павінна падказаць гэтаму некаму — не сыпце соль на раны, не можаце дапамагчы — дык хоць маўчыце.

Прыкра бачыць баязлівую падмену праўды хітрымі маніпуляцыямі і падтасоўкамі там, дзе справа датычыць праблем развіцця нашай нацыянальнай культуры. Колькі разоў даводзілася нам чытаць артыкулы або слухаць выступленні, у якіх людзі адукаваныя, вучоныя, дзяржаўныя людзі спрабавалі камусьці даказаць, кагосьці пераканаць, што ніякіх вострых праблем у сучаснай беларускай культуры няма. «Всё хорошо, прекрасная маркиза!» Пры гэтым, вядома ж, аперыравалі фактамі і лічбамі. І выходзіла так, што ўсё — выдатна!.. Прабачце, выдатна — ды не зусім. І вось пра гэта «не зусім» шаноўныя аўтары — ні слова. І як быць, што думаць сумленнаму чытачу, які ведае, што за агульным валам лічбаў і назваў хаваюцца неверагодна мізэрныя тыражы беларускіх выданняў, у выніку чаго іх практычная роля ў развіцці нацыянальнай культуры, у патрыятычным і камуністычным выхаванні зусім нязначная.

Пачуццё Бацькаўшчыны, гістарычная памяць народа, яго душа, матчына песня, роднае слова — усё гэта разам узятае ёсць «святая святых» для кожнага культурнага чалавека, ёсць тая сфера духоўнасці, дзе мацней за ўсё азываюцца і боль, і сорам, і наогул — першародны голас чалавечага сумлення. Нішто не можа так акрылёна ўзвысіць чалавека, як усведамленне сваёй арганічнай далучанасці да духоўнай велічы свайго народа, і нішто не можа балючэй ударыць, страшней абразіць чалавека, як прыніжэнне нацыянальнай годнасці яго народа. Калі, вядома, пачуццё гэтай годнасці знаёма яму самому — чалавеку. Калі народ і Радзіма — для яго не проста звыклыя словы. У новым рамане маскоўскага пісьменніка С. Шуртакова «Одолень-трава» браканьеры і парубшчыкі душаахоўнай зоны названы «рускімі людзьмі без Расіі ў сэрцы». Правільна названы, дакладна. Ну, а ці ёсць у нас у рэспубліцы «беларускія людзі без Беларусі ў сэрцы?» Ці ёсць? Ды страшна падумаць, колькі іх! І колькі сярод іх тых, на каго ўскладзены непасрэдныя абавязкі клапаціцца пра нашы цудоўныя лясы, рэкі і азёры, пра помнікі беларускай гісторыі і культуры, пра беларускі тэатр і мастацтва, і самае галоўнае — пра будучыню Беларусі: пра нашых дзяцей, пра беларускую школу.

Яшчэ адно пытанне, якое блізка прымыкае да папярэдняга. У апошнія гады на старонках нашага літаратурнага друку — і рэспубліканскага і ўсесаюзнага, а таксама на нашых сходах неаднойчы ўзнікала тэма правінцыялізму як паняцця, канечне ж, і сацыяльна і маральна не эфемернага, а досыць канкрэтнага і пэўнага. Праўда, нейкага адзінага погляду на гэту з'яву духоўнага, у тым ліку літаратурнага жыцця, —няма. Меркаванні і сцверджанні выказваюцца самыя розныя. Віктар Астаф'еў, напрыклад, мяркуе так: «Правінцыялізм — паняцце не геаграфічнае. У Маскве яго, думаю, не менш, чым у якой-небудзь глушы. Наш правінцыялізм — пераймальніцтва. Гэта датычыць усіх галін культуры». («Книжное обозрение», 4.01.1987). Як бачым, па Астаф'еву, правінцыялізм — гэта пераймальніцтва, іначай сказаць — некрытычнае захапленне чужым, прыносным або наносным, на шкоду свайму, айчыннаму, духоўна самастойнаму, нацыянальна самабытнаму. Вядома, гэта не поўная характарыстыка такога шматаблічнага з'явішча, як правінцыялізм. Але рыса названа дакладная. Бясспрэчна, пераймальніцтва заўсёды характарызавала паводзіны культурнай правінцыі. Пераймальніцтва і — як адваротны бок медаля — адмаўленне нацыянальнай самабытнасці. З другога боку, замыканне толькі ў сваім нацыянальным, няздольнасць успрымаць і засвойваць духоўныя багацці іншых народаў, набыткі іншых культур, — таксама ёсць верная адзнака правінцыялізму. Мне заўсёды здавалася, што гэтыя азбучныя ісціны дастаткова трывала засвоены нашымі пісьменнікамі яшчэ ў школьныя гады. Проста немагчыма дапусціць, каб хтосьці з сучасных беларускіх літаратараў не разумеў гэтага і ўсур'ёз мог заняць пазіцыю духоўнай самаізаляцыі, нацыянальна-культурнага герметызму. Ды і праяў чаго-небудзь падобнага — ні ў саміх мастацкіх творах, ні ў тэарэтычных даследаваннях — не відно. Вось чаму мяне моцна заўсёды дзівіла абвінавачванне ў хутарскіх настроях і хутаршчыннай пазіцыі, якое было адрасавана некаторым беларускім пісьменнікам сваімі ж беларускімі крытыкамі. На думку апошніх, нібыта не ўсе з нас разумеюць, што каб полымя літаратуры шугала найлепш, яно павінна быць для ўсіх вятроў адкрытае. Хто гэтага не разумее—я асабіста не бачу; што за гэткія вузкалобыя нацыянальныя капшукі, што супроць засваення сусветнай культуры? У наш час — і такое дзікунства? Дазвольце не паверыць. Што ж да хутара, хутарскога цяпельца і хутаршчыны — то хацеў бы сказаць наступнае. У канцы 20-х — пачатку 30-х гадоў гэтыя калярытныя слоўцы ўжо былі ў ходу. Імі карысталіся — з вялікім імпэтам, з размахам, з аргвывадамі — дастапрысна памятны Бэндэ і яго кампанія. Гэтак званыя вульгарныя сацыёлагі. За «хутар» і «хутаршчыну», за паэтызацыю «кулацка-хутарскіх» ідэалаў яны дратавалі Купалу і Коласа, драпежылі Зарэцкага, Чорнага, Пушчу і многіх-многіх яшчэ, большасць з якіх апынуліся далёка ад родных сядзіб, і дзе іх магілы — мы ніколі ведаць не будзем. У канцы 50-х гадоў у беларускім літаратуразнаўстве і крытыцы з вульгарным сацыялагізмам было пакончана. Асабліва вялікія заслугі ў барацьбе з яго рэцыдывамі належалі тады Алесю Адамовічу: зайздросна граміў ён спадчыну вульгарызатараў, аглабельшчыкаў, ярлычнікаў. Тым, хто сёння зноў бярэ на ўзбраенне слоўцы «хутар», «хутарское», ці як варыянт, «павятовае» і спрабуе карыстацца імі ў размове аб нашай сучаснай літаратуры, я горача раю пачытаць публіцыстыку Алеся Адамовіча канца 50-х гадоў. Хай яго высокі аўтарытэт дапаможа зразумець, што ярлыкамі і іншымі моцнымі эпітэтамі праўдзе не паслужыш. Дый удумаемся, таварыш, пра што можа ісці спрэчка? Што пісьменніку трэба трымацца родных каранёў і вытокаў, здаровых нацыянальных традыцый? А каму гэта даказваць? Хто гэтага не разумее? Ці — што пісьменніку трэба авалодваць дасягненнямі сусветнай культуры, жыць з адкрытай для паэзіі ўсяго свету душою? А каму гэта даказваць? Хто гэтага не разумее?.. Ды нібыта няма такіх недарэкаў. Тады — для чаго ўсё гэта? Васіль Быкаў аднойчы — па іншаму, праўда, поваду — сказаў: «Не трэба штучна ствараць для сябе праблем, хопіць нам тых, што стварае само жыццё». Вельмі мудра сказаў наш Васіль Уладзіміравіч!..

У сённяшняй размове нам, канечне ж, не абысціся без пытання, якое месца ў літаратуры сацыяльна-маральнай праблематыкі займае крытыка, як яна садзейнічае пісьменнікам у асвятленні названых праблем і як іх разумее сама. Тут, як і ва ўсіх іншых жанрах літаратуры, усё залежыць ад асобы крытыка, ад яго грамадзянскай пазіцыі і таленту. Таму гаварыць пра ўсю крытыку агулам: так, садзейнічае і разумее, або: не, не разумее і не садзейнічае, — нельга. Мне, напрыклад, шмат дае чытанне кніг і артыкулаў тых крытыкаў, у якіх ёсць свой уласны погляд на стан рэчаў, ці іначай —свая канцэпцыя, сваё асабістае ўспрыманне твора ў яго шматлучных сувязях з рэчаіснасцю, свае ўласныя падыходы, спосабы і прыёмы аналізу, нарэшце, свой почырк, свае фарбы пісьма — псіхалагічнага, інтэлектуальнага, эмацыянальнага, іранічнага... Адным словам, усё тое, што і ў творчасці пісьменнікаў любога іншага жанру. Глыбока перакананы, што крытык павінен быць цікавым самастойным мысліцелем. І што ні ў якім разе яго задачай не з'яўляецца хваліць твор або ганіць. Ацэначная крытыка — гэта крытыка непазбежна суб'ектывісцкая, прадузятая, якая схіляецца да дзвюх аднолькава шкодных крайнасцей: або да наўмыснай пагромшчыны, або да свядомай кампліментаршчыны. У нас да гэтага часу пераважала апошняя. У абкурванні некаторых аўтараў фіміямам даходзіла да крайняй мяжы, я сказаў бы, да непрыстойнасці. Іншы раз так і хацелася сказаць аўтару рэцэнзіі ці артыкула: ну, што вы ў соты раз і ва ўвесь дух пампуеце пахвалу! Я і без вас, шаноўны, ведаю, што ўсе нашы масцітыя раманісты пішуць не горш за Дастаеўскага і Талстога! Нават яны самі ўжо гэта ведаюць! Вы пакажыце мне, у чым вы з пісьменнікам не згодны — у паглядах на прадмет, у мове, у ідэйна-маральнай і эстэтычнай пазіцыі? Ці ў вас свайго пагляду і сваёй пазіцыі няма? Калі няма, тады, прабачце, які ж вы крытык?

Дарэчы, менавіта гэтым і вызначаюцца крытэрыі, якімі трэба кіравацца супрацоўнікам рэдакцый нашых выданняў (ды і не толькі нашых). Трэба зрабіць няпісаным законам правіла: прымаць крытычны матэрыял да друку толькі тады, калі ў ім ёсць самастойны погляд, сваё ўласнае разуменне праблемы і калі ён сапраўды крытычны. У таленавітага крытыка, як правіла, бывае ў чымсьці нязгода з аўтарам, і ён гэту нязгоду выказвае, спрачаецца па нейкіх пытаннях, даказвае і сцвярджае свой пункт гледжання, — і менавіта таму яго цікава чытаць. На жаль,

ПЛЕНУМ ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ

крытычных публікацый, якія цікава чытаць, у нашым друку паяўляецца яшчэ вельмі мала. На сёння, перагартаўшы свежыя нумары часопісаў, я не магу радасна ўскрыкнуць: «Ты бач, як яна загаварыла, наша крытыка! Проста не пазнаць! Крытыкуе! Вы толькі паглядзіце: не сцелецца лістам, не сыпле кампліменты, а — спрачаецца, робіць сур'ёзныя і непрадузятыя заўвагі, і нават з'едліва кпіць — высмейвае відочную лухту і глупства!...» На жаль, паўтараю, гэтага яшчэ няма, і да гэтага яшчэ не такая лёгкая дарога. Бо далёка зайшло ў другі бок. Трэба дабіцца пералому ў самой атмасферы нашага літаратурнага жыцця.

Давайце ж зразумеем, што без перабудовы ў крытыцы перабудова ў літаратуры ў цэлым не адбудзецца. Час крытыкі прабіў! З чаго пачынаць? А хоць бы з таго, каб зрабіць крытыку канкрэтнай. Досыць таўчы ваду ў ступе —частаваць чытачоў агульшчынай: «Трэба смялей, вастрэй, глыбей, больш патрабавальна!..» Да каго гэтыя заклікі? Каму трэба глыбей — Быкаву, Панчанку, Танку, Адамчыку, Кудраўцу? Каму? Бо Мікола Пэцкаль і Міхась Марзэкала чытаюць гэту агульшчыну і думаюць: «Ага, нам з Быкавым і Панчанкам трэба глыбей... Ну, але разам з імі, у адной кампаніі, мы не прападзём, хай **яны** перш за ўсё думаюць...» Пазбыцца кампліментаршчыны і агульшчыны — гэта і будзе здзейсніць перабудову ў крытыцы. А моцныя крытычныя сілы ў нас ёсць —і ёсць на каго разлічваць. Сілы ёсць, у тым ліку і творча маладыя, перспектыўныя, надзейныя. Але патрэбна разварушэнне — вялікае агульнае разварушэнне, пасля якога будзе немагчыма пісаць крытыку для абслугоўвання «патрэбных людзей» і сяброў, займацца выгадным калялітаратурным сервісам.

Сяргей Законнікаў і Тамара Каламіец (Украіна).

Баюся, мы і дагэтуль недастаткова ўсвядомілі, што той дух, які панаваў у літаратуры ў часы культу асобы, застаўся фактычна не пераадоленым. Крытычныя панегірыкі, кампліменты, захвальванне— хіба гэта не атрыбуты атмасферы культу? Знайдзіце аб'ектыўную, прынцыповую крытыку на тых, хто займаў ці займае пасаду, ад якой сёе-тое залежыць! Калі і знойдзеце — дык як рэдкае выключэнне. Мы паступова апусціліся да таго ўзроўню, пры якім пачалі кіравацца формулай: чые творы **можна** крытыкаваць, а чые — не, бо небяспечна, бо можа адпомсціцца. Практычна крытыкаваць не стала каго — паколькі кожны ад кожнага ў нечым залежыць. Гэты працуе сакратаром СП, той— у высокай інстанцыі, гэны — у выдавецтве, неабавязкова дырэктарам (і рэдактар можа з цябе гізунды выцягнуць), гэты працуе ў часопісе, той — на радыё ці не тэле, гэны — дацэнт ці прафесар філфака, будзе прымаць на вучобу маё чада... Хто ж застаецца, каго можна крытыкаваць? Хіба якога няшчаснага пенсіянера? Ну, а дзе ж залежнасць ад сумлення? Ад маральных прынцыпаў? Ад абавязку шчыра служыць літаратуры?.. Мужнасці гаварыць поўную праўду пра стан крытыкі нам доўгі-доўгі час неставала. Пятнаццаць гадоў назад была прынята вядомая пастанова ЦК КПСС «Аб літаратурна-мастацкай крытыцы». Пасля таго на кожнай справаздачы мы дакладвалі і самі сабе ўнушалі, што крытыка пачала развівацца лепш, што зроблены пэўны крок наперад, адбыўся зрух, ажыўленне. І гэта была няпраўда. Мы і некаму, і самі сабе хлусілі. Хлусілі не зламысна, а проста па звычцы. Бо як жа так, раз пастанова прынята — значыць, яна выконваецца! На яе ж адклікнуліся!.. І смець не смелі падумаць інакш. А пастанова тым часам не выконвалася! І ніякага зруху, ніякага кроку наперад не было. Наадварот — яшчэ мацней запаноўвала руціна. Бо што стаіць на месцы — тое плынь часу гоніць назад.

І — невялікі постскрыптум у завяршэнне размовы аб крытыцы. У артыкуле, пра які я ўжо гаварыў, Сямён Букчын піша: «Мы... цэнім прынцыповую пазіцыю Алеся Адамовіча, Віктара Каваленкі...» — і далей пералічвае цэлы рад крытыкаў. У гэтым пераліку няма імён У. Калесніка, А. Клышкі, Г. Шупенькі, С. Андраюка, Д. Бугаёва і многіх іншых, якім, на думку аўтара, мабыць, нестае прынцыповай пазіцыі. Хацеў бы запытаць у паважанага аўтара: «Мы цэнім» — гэта вы ад чыйго імя гаворыце «мы»? Ад імя Саюза пісьменнікаў Беларусі ці ад імя ўсіх беларускіх чытачоў? Таму што я, напрыклад, і як член Саюза і як чытач, з увагі менавіта на «прынцыповую пазіцыю», назваў бы і, можа, нават у першую чаргу тых, каго вы прапусцілі... Калі ж гэта ваш асабісты выбар, дык так і трэба пісаць: я цаню, я лічу... Бо ў разгар барацьбы за дэмакратычнасць — а вы ж нібыта таксама змагар за яе — дзіўна бачыць такое прысваенне сабе права гаварыць ад нейкага масавага «мы». Калі ж гэтае «мы» не масавае, дык так і скажыце: мы з таварышамі іксам і ігрэкам цэнім і лічым і г. д...

Партыя дала рэзка крытычную ацэнку праявам «беспрынцыпнасці і дзяляцтва» ў сферы мастацтва і літаратуры. На вялікі жаль, гэта — і пра нас сказана, і нас датычыць. І трэба гаварыць шчыра, адкрыта пра ўсё тое, што ў нашым асяроддзі не адпавядае духу камуністычнай маралі, традыцыйнай — ад Купалы і Коласа, ад Багдановіча і Гарэцкага —пісьменніцкай этыцы. Трэба шчыра сказаць, за што нам павінна быць сорамна, і чаму, аднак жа, нам не сорамна. Калі і як гэта стала, што яўна амаральныя, непрыгожыя справы мы не ўспрымаем як амаральныя і непрыгожыя. А калі ўспрымаем— дык чаму не асуджаем іх публічна? Чаму мы іх церпім?

Чаму, напрыклад, пісьменніку не сорамна хадзіць-выхаджваць для сябе прэмію, узнагароду, ганаровае званне? Як растлумачыць яму, што не пра гэта ён павінен думаць і клапаціцца, — асабліва, калі ў жыцці грамадства столькі ўсялякіх праблем, калі ў яго народа і краіны — столькі неймаверна цяжкіх турбот і клопатаў? На валаску вісіць мір, мільёнам людзей перавярнула душу чарнобыльская аварыя, пад пагрозай пагібелі самая зялёная ў свеце, лясная, рачная, азёрная зямля — беларускае Палессе, і не толькі Палессе, уся краіна што называецца ўсенародна рушыла ў наступ — на ўсіх франтах эканамічнага, сацыяльнага і культурнага будаўніцтва, а ён, пісьменнік, інжынер чалавечых душ, настаўнік людзей, асветнік будзіцель, прарок — ідзе «ў гэты час «наверх», да высокага начальства выклянчваць сабе чарговую прэмію ці ўзнагароду!

Або: чаму, напрыклад, віднаму пісьменніку не сорамна пладзіць, падтрымліваць, заахвочваць публічны падхалімаж у дачыненні да ягонай творчасці і самой яго асобы? Не сорамна акружаць сябе «закадычнымі» сябрамі-крытыкамі, што спяшаюцца навыперадкі біць у літаўры: «Гром победы, раздавайся!» Яшчэ раман у карэктуры, а ўжо хвалебныя рэцэнзіі гатовы — ідуць у друк! — каб хаця хто першы не напісаў праўду, што раманец-то — так сабе, досыць пасрэдны, ці, як сказаў бы адзін мой знаёмы,— «сярэдняй слабасці». І гэта ў той час, як гадамі не заўважаюцца і не рэцэнзуюцца кнігі, вартыя ўвагі.

Або: чаму нашым таварышам не сорамна, злоўжываючы становішчам, перавыдаваць свае творы ў Маскве і іншых рэспубліках штогодна і, вядома ж, за кошт выдавецкай квоты, адпушчанай на ўсю беларускую літаратуру? Паглядзіце хроніку выданняў у альманаху «Далягляды», убачыце, што ў 1977 годзе адзін наш масціты празаік выдаў на рускай мове чатыры кнігі, тры з іх — перавыданні, а ў 1978 годзе ён жа выдаў на рускай мове пяць кніг, з іх — чатыры перавыданні. Значыць, дзевяць выданняў толькі на рускай мове — і толькі за два гады! І з іх — сем кніг перавыданні! І каб хоць адна душа звярнула ўвагу на гэту ганебную арыфметыку, на гэты, прабачце, выдаўнічы разбой! Ніхто — ні слова! Усё — нармальна, усё — як мае быць. Павага і пашана таварышу — поўнай мерай! Між тым, калі б наш масціты таварыш урэзаў свае апетыты хаця б напалову, дык бы рускамоўны, г. зн. усесаюзны чытач за тыя два гады атрымаў бы, далікатна кажучы, не менш таленавітыя кнігі Караткевіча, Адамчыка, Кудраўца, Пташнікава; або не менш таленавітыя кнігі — Чарнышэвіча, Лупсякова, Кулакоўскага, Лобана, або кнігі таленавітых маладзейшых таварышаў — іх першыя кнігі на мове, якая б адкрыла іх шырокаму чытацкаму свету. І гэта было б так па-гаспадарску, і з увагі на ўзрост, так па-бацькоўску мудра...

Калі ўжо гаворка зайшла пра ненармальныя з'явы ў сферы кнігавыдавецкай, то можна сказаць і больш. Прынцып: ты выдаеш мяне, а я — цябе, гэткая ўзаемная «павага і любоў», — як правіла за кошт дзяржавы або грамадства, — набыла ў нас прыкметнае пашырэнне. Стала не сорамна дзейнічаць па прыкладу крылоўскіх Зязюлі і Пеўня. Я пра цябе артыкул у часопіс — ты на маю кнігу рэцэнзію для выдавецтва; я пра цябе па тэле— ты пра мяне па радыё; я напісаў прадмову да твайго выбранага —ты выдасі ў сваім выдавецтве маё выбранае... Вось і ўся прынцыповасць, пра якую мы так любім пагаварыць, пафіласофстваваць...

Часам не хапае элементарнага ўсведамлення, што непрыгожа, сорамна прасіць: браток, напішы пра маю кнігу рэцэнзію! Што сорамна пабірацца і жабраваць пахвалу «падайце, радзі бога, няшчаснаму!»—бо толькі ўбогія духам могуць сабе дазволіць гэта. Што, нарэшце, сорамна скакаць ад радасці, калі беспрынцыпны прымітыўны пісака курнуў табе фіміяму; калі ты сур'ёзны, таленавіты пісьменнік, то цябе павінна абразіць гэта, а не ўзрадаваць. На жаль, наша культура адносін да крытыкі яшчэ нярэдка вымяраецца элементарнай, я сказаў бы, дзетсадаўскай формулай: абы цёця пахваліла, абы сказала, што я цаца і ляля.

Аднак жа здаўна вядома, што чалавечая і грамадзянская годнасць пісьменніка — гэта не дробязь, якую можна беспакарана ігнараваць. Для таленту сапраўднага высокамаральнае жыццё ў літаратуры — непераступны закон. Закон няпісаны, вядома, і яго сутнасць кожны спасцігае сам. Чытач вельмі неабыякавы да таго, якая — ці высакародная? — жыццёвая і творчая пазіцыя пісьменніка, ці грунтуецца яго творчая мараль на сумленні. Гэта — архіважнае пытанне! Што можна чакаць ад пісьменніка, які ўсім сваім выглядам на кожным кроку падкрэслівае: ды начхаць мне на вашы праблемы і клопаты! У мяне адзін клопат: чаму вы не бачыце, які я вялікі і геніяльны? Або — што можна чакаць ад пісьменніка, які ўсім сваім выглядам крычыць і лямантуе: дайце! Дайце мне і гэта, і гэна, і тое, бо вы ж бачыце, што мне яшчэ мала! Дайце! — а то ўсё роўна сам вазьму!..

У новай кніжцы Пімена Панчанкі ёсць невялікі верш пра пісьменніцкі сход — праўдзівы, на жаль, абразок з натуры, балюча чытаць, бо гэта пра нас з вамі, але — што зробіш, лякарства заўсёды горкае.

Узнімаюць таміны тоўстыя,
Раздаецца праўдзівы крык:
Ад Дастаеўскага
Да Паустоўскага
Пачынаецца пералік.

. . . . . .

І натхнёна, і без абразы
Вельмі доказна кожны сапе.
І гавораць усе тут разам
Пра сябе, пра сябе, пра сябе...

Дарэчы, наконт гэтага «пра сябе». Яно кідаецца ў вочы не толькі на сходах. Пацікаўцеся, як праходзяць выступленні некаторых таварышаў на сустрэчах з чытачамі — пра што там ідзе размова? Ці пра жыццё і літаратуру — ці менавіта пра сябе? На жаль, самарэклама лічыцца ў нас нармальнай з'явай, і прапаганда беларускай літаратуры нярэдка зводзіцца да самапрапаганды: мой раман, мая аповесць, мая п'еса, мая паэма... Дзве гадзіны гаворкі — і ўсё пра сваю персону, пра сябе! Без элементарнага пачуцця няёмкасці!..

Хвароба, аб якой размова, мае сваю дакладную назву: мітуслівасць. Мітуслівае жыццё ў літаратуры. Хвароба гэта даўняя, застарэлая, і, вядома, не толькі наша нацыянальная. Можа быць, што дзесьці гэтай мітуслівасці сёння нават больш, чым у нас. Але гэта не павінна быць для нас суцяшэннем. Лепш задумаемся аб тым, чаму калісьці яе было менш у асяроддзі беларускіх літаратараў, а цяпер назіраецца больш. Адна з самых вызначальных адзнак гэтай мітуслівасці — гігантаманія, пагоня за колькасцю тамоў, кніг, публікацый, што непазбежна адбіваецца на якасці. Прыжываюцца і культывуюцца якіясьці не толькі не прыдатныя, але і шкодныя для літаратурнай творчасці спартыўныя норавы: гайда, навыперадкі — хто каго абгоніць! Але ж гэтак, у абгонку, займацца творчасцю небяспечна, дарагі таварыш! Як вясковы чалавек скажу, што гэткім чынам можна і дыхавіцу нагнаць свайму Пегасу. А што за Пегас з дыхавіцай? Куды ты на такім Пегасе заедзеш? Пегас павінен быць здаровы!..

Вельмі хацелася б, каб над усімі гэтымі маральнымі праблемамі нашага жыцця ў літаратуры як мага больш думалі ма-

Анатоль Вялюгін і Янка Брыль.

ладыя. Мы абавязаны дапамагчы ім разабрацца ў духоўна-маральнай сітуацыі, якую яны заспелі, у ідэйна-мастацкай спадчыне, якая ім дасталася, у павіннасцях і задачах, якія кладуцца на іх плечы... Баюся — яны яшчэ слаба ўяўляюць, што ад іх чакаецца. Але ж нейкай іншай маладой змены ў нас няма, ёсць толькі яны, і якімі яны ўвойдуць у літаратуру, якімі будуць мастакамі, творцамі, мысліцелямі, якімі акажуцца гаспадарамі і рупліўцамі на роднай літаратурнай і шырэй— нацыянальна-культурнай ніве, — гэта ў вялікай ступені залежыць ад нас, ад таго, як мы, усе старэйшыя, сёння пра гэта паклапоцімся. Думаю і спяшаюся сказаць, што ніякай пабліжлівасці і патуранню тут не павінна быць месца. Будзем патрабавальнымі! Будзем — у імя будучыні той справы, якой мы — добра ці не надта добра — служылі і служым. Будзем — кіруючыся тым жа пачуццём адказнасці, якога мы ўсё ж не страцілі.

(Працяг на стар. 8).

ПЛЕНУМ ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ

(Працяг. Пачатак на стар. 1—7).

Мы абавязаны шмат чаго сказаць нашым маладым таварышам, а ў першую чаргу, можа быць, наступнае: не давайце волі нядобраму і злому ў душы сваёй! Не дайце злу разрасціся, стрымайце і забіце яго ў сабе, пакуль не позна! Агледзьцеся, задумайцеся і зразумейце, што няма ў вас і ні ў кога з нас права на раздзьмухванне непрыязні і варажнечы, а толькі ёсць права на згуртаванне, на кансалідацыю ўсіх таленавітых, здаровых творчых сіл.

Мы абавязаны сказаць маладым, што трэба выхоўваць у сабе вялікую грамадзянскую мужнасць. Сцверджанне і ажыццяўленне абвешчаных Кастрычнікам высакародных сацыяльных і маральных ідэалаў — без барацьбы, без змагання не магчымыя. А што можна без барацьбы — проста і лёгка? Шмат чаго можна! Напрыклад, грамадзянскую пазіцыю пісьменніка, яго асабісты ўдзел у перабудове. Абмяркоўваліся таксама пытанні культурнай і гістарычнай спадчыны народа, захавання і развіцця беларускай мовы.

Я ўсёй душой з тымі, сказаў **Янка БРЫЛЬ**, хто не траціць надзеі на перамогу ленінскіх норм у справе нацыянальнай палітыкі, хто верыць, што гэта вельмі патрэбна і неадменна. У адказ на беспадстаўны недавер, няслушныя падазрэнні, здзекліва-колкія кепікі і халоднае мудрагельства палітыканаў хочацца сказаць: не трэба лішне баяцца, што наша любоў да рускага слова, рускай літаратуры, рускага народа можа паменшаць або пахіснуцца ад таго, што мы любім і сваё, роднае — слова, літаратуру, песню, мінулае і сучаснасць.

Так, нам патрэбна родная школа, патрэбен патрыятычна свядомы чытач, нам патрэбна законнае месца ў гісторыі братніх народаў, патрэбна здаровая, інтэрнацыянальная гордасць сваім народам, не горшым за іншыя ў працы, у барацьбе за светлыя ідэалы ленінізму, за мір і дружбу, за чалавечнасць.

Усё гэта вельмі сугучна нашаму часу.

На ўсіх этапах будаўніцтва сацыялізму місія літаратуры складалася з усталявання прынцыпаў сацыялістычнага гуманізму, фарміравання новай маралі, садзейнічання духоўнаму ўзбагачэнню людзей. На кожным этапе ўзнікалі праблемы, якія патрабавалі неабходнай увагі. Такія праблемы існуюць і сёння, калі савецкае грамадства ўступіла на новы этап свайго развіцця, на шлях рэвалюцыйнага абнаўлення.

Аб гэтым і гаварылі ўдзельнікі пленума, абмяркоўваючы даклад першага сакратара праўлення СП БССР Н. Гілевіча. Прамоўцы падкрэслівалі неабходнасць найбольш поўнага і глыбокага адлюстравання ў мастацкіх творах пазітыўных змен, што адбываюцца ў жыцці грамадства. Асаблівая ўвага была звернута на сацыяльную і грамадзянскую пазіцыю пісьменніка, яго асабісты ўдзел у перабудове. Абмяркоўваліся таксама пытанні культурнай і гістарычнай спадчыны народа, захавання і развіцця беларускай мовы.

Я ўсёй душой з тымі, сказаў **Янка БРЫЛЬ**, хто не траціць надзеі на перамогу ленінскіх норм у справе нацыянальнай палітыкі, хто верыць, што гэта вельмі патрэбна і неадменна. У адказ на беспадстаўны недавер, няслушныя падазрэнні, здзекліва-колкія кепікі і халоднае мудрагельства палітыканаў хочацца сказаць: не трэба лішне баяцца, што наша любоў да рускага слова, рускай літаратуры, рускага народа можа паменшаць або пахіснуцца ад таго, што мы любім і сваё, роднае — слова, літаратуру, песню, мінулае і сучаснасць.

Так, нам патрэбна родная школа, патрэбен патрыятычна свядомы чытач, нам патрэбна законнае месца ў гісторыі братніх народаў, патрэбна здаровая, інтэрнацыянальная гордасць сваім народам, не горшым за іншыя ў працы, у барацьбе за светлыя ідэалы ленінізму, за мір і дружбу, за чалавечнасць.

Усё гэта вельмі сугучна нашаму часу.

хлусіць, пісаць няпраўду, халтурыць, пампаваць грымучую дэмагагічную рыторыку, рыфмаваць прысягі і клятвы... На гэта ніякай ні мужнасці, ні смеласці не трэба. У беларускай кніжцы балгарскага паэта Хрысты Радзеўскага ёсць такія радкі:

Праграматык ці рамантык
ты выразны —
жыццё бой: яно даецца
дорага.
І толькі ідыёт першаразрадны
не мае ворагаў.

Жыць сумленна ў літаратуры — значыць адстойваць праўду, справядлівасць, дабро, а гэта ў сваю чаргу значыць — непазбежна ўступаць у паядынак з няпраўдай, несправядлівасцю, злом. Толькі так! Талент без сумлення і мужнасці — што птушка без крыл.

Што яшчэ мы абавязаны гаварыць маладым? Што трэба пастаянна вучыцца, паглыбляць сваё веданне гісторыі цывілізацыі і культуры, пашыраць свой духоўны кругагляд. Як ні парадаксальна для веку НТР і як ні горка пра гэта гаварыць, — у нас, у нашым асяроддзі яшчэ мнагавата невуцтва. Мы скардзімся, што нашых кніг не чытаюць. Пачнём з сябе: малавата чытаем. Або, можа, не тое чытаем. Ва ўсякім разе, наша прафесійная адукаванасць, мякка кажучы, кідаецца ў вочы не вельмі. Баюся, што выдадзеныя нам дыпломы не заўсёды адпавядаюць таму, што ў іх пасведчана.

Каб не склалася ўражанне, што сказанае выклікана нейкай асаблівай трывогай за культурны ўзровень і творчыя магчымасці нашых маладых таварышаў, спяшаюся зазначыць, што гэта не так. Проста вельмі хочацца, каб свае магчымасці, у якія я моцна веру, літаратурная моладзь рэалізавала як мага паўней. Зрэшты, найбольш таленавітыя з іх гэта выдатна разумеюць самі, і іх творчы рост, сталенне майстэрства, бясспрэчна, у значнай меры абумоўлены павышэннем узроўню іх агульнай духоўнай культуры, развіццём іх маральна-этычных і эстэтычных поглядаў. Маю на ўвазе не самых маладых, вядома, а тых, што працуюць у літаратуры ўжо наймала дзесятак гадоў і, думаю, пачуваюцца поплеч са старэйшымі досыць упэўнена. Іншая рэч, што ў масавасці празаічнага і вершаванага хламу не кожнага з іх мы бачым. Ці ўсе, напрыклад, заўважылі, як прыкметна выраслі і ўздужэлі каля «берасцейшага вогнішча» паэты М. Пракаповіч, А. Каско, В. Сахарчук? Прычым, уздужэлі ад той сілы, якую дае трывалая, непарыўная повязь з роднай зямлёю, з бацькаўшчынай, з лёсам народа:

Адзін у полі — не воін,
Калі гэта поле — чужое.
Устану ў полі адзін я,
Калі гэта поле — Радзіма.

Так пачуваецца на абранай жыццёвай пазіцыі лірычны герой Пракаповіча.

Не навучыўшыся мітусіцца і шумець, незаўважанай застаецца ў нашай літаратуры Л. Тарасюк — і паэт з божай ласкі, і таленавіты, дасведчаны, удумлівы крытык, чалавек сучаснай філалагічнай культуры. Парадуемся, што не крыўдзіць няўвагай крытыка такіх набываючых сталую сілу паэтаў, як Л. Галубовіч, Л. Дранько-Майсюк, М. Мятліцкі, празаікаў Х. Лялько і У. Арлова. Пашкадуем, што гэткай жа ўвагі не хапае іх літаратурным равеснікам — А. Пісьмянкову, У. Маруку, В. Шніпу, І. Жарнасек. Своечасова заўважыць і падтрымаць таленавіта заяўлены голас — пачэсны абавязак усіх старэйшых таварышаў. Найлепшая падтрымка — выданне кнігі маладога пісьменніка. Гэтым кіраваўся і я, блаславіўшы да друку ў мінулым годзе першую

На ўсіх этапах будаўніцтва сацыялізму місія літаратуры складалася з усталявання прынцыпаў сацыялістычнага гуманізму, фарміравання новай маралі, садзейнічання духоўнаму ўзбагачэнню людзей. На кожным этапе ўзнікалі праблемы, якія патрабавалі неабходнай увагі. Такія праблемы існуюць і сёння, калі савецкае грамадства ўступіла на новы этап свайго развіцця, на шлях рэвалюцыйнага абнаўлення.

Аб гэтым і гаварылі ўдзельнікі пленума, абмяркоўваючы даклад першага сакратара праўлення СП БССР Н. Гілевіча. Прамоўцы падкрэслівалі неабходнасць найбольш поўнага і глыбокага адлюстравання ў мастацкіх творах пазітыўных змен, што адбываюцца ў жыцці грамадства. Асаблівая ўвага была звернута на сацыяльную і

Яўгенія Янішчыц, Уладзімір Арлоў і Хрысціна Лялько.

Перабудову трэба пачынаць перш за ўсё з самога сябе, са свайго найбліжэйшага калектыву, працягваў прамоўца. Згадваюцца тры вечары ў нашым Доме літаратара — зусім нядаўнія і сумна характэрныя. Вечар Уладзіміра Караткевіча з нагоды выхаду яго кнігі «Быў. Есць. Буду». 95-годдзе з дня нараджэння Рыгора Раманавіча Шырмы. І вечар памяці Аркадзя Чарнышэвіча. Тры вельмі значныя імёны, тры светлыя вобразы: Караткевіч — арыгінальны, яркі паэт, празаік, драматург, публіцыст, слаўны таварыш; Шырма — чалавек подзвігу, жыццёвага і творчага, асоба з высокім маральным аўтарытэтам; Чарнышэвіч — таленавіты апавядальнік і раманіст, які зрабіў бы намнога больш, каб не бязлітасны цяжар несправядлівага лёсу.

А ў зале на тых вечарах, даволі людных дзякуючы прыхільнікам роднага слова, нашага брата-пісьменніка было трычатыры, ну пяць чалавек, амаль заўсёды адных і тых. Такое паўтараецца і часта, і даўно. Ні старэйшых не ўбачыш, ні маладых. Цяжка ўявіць, што менавіта ў тыя вячэрнія паўтары-дзве гадзіны недзе за мноствам пісьмовых сталоў ствараюцца суцэльныя шэдэўры.

Далей Я. Брыль гаварыў аб іншых негатыўных з'явах, што маюць месца ў жыцці Саюза пісьменнікаў, у нашым літаратурным жыцці. У рэдакцыях, часопісных і выдавецкіх, правіць, працаваць з аўтарам у добрым сэнсе гэтага слова не надта ўмеюць і хочуць. Збольшага толькі ў асноўным стыліст ды карэктар. Толькі цэнзураваць стараюцца, многіх штатных апераджаючы ў сваёй палахлівай звышпільнасці.

У гэтым сэнсе ўспамінаецца горкі лёс трэцяй кнігі трылогіі Міколы Лобана «Шэметы», зазначыў Я. Брыль. Добрая проза, грунтоўная ў сваёй праўдзівасці і майстэрстве, яна была так пільна зарэдагавана ў «Полымі», што толькі рэбры засталіся. Выдавецтва, у сваю чаргу, палічыла за лепшае, спакайнейшае ў асноўным пайсці за часопісам. Блізкія да Міколы Паўлавіча людзі ведаюць, колькі ўсё гэта каштавала таварышу ў гадах, хваравітаму, двойчы цяжка параненаму франтавіку, абаяльнаму ў сваёй змястоўнай сціпласці чалавеку, які гэта быў фінал сумленнага пісьменніцкага шляху... Міколы няма, ён не можа пакарыстацца свежым паветрам галоснасці, сам не верне страчанае, і я лічу, што тут фармальна падыходзіць нельга,—маўляў, апошняе прыжыццёвае выданне, тэкст, так сказаць, кананічны... Можа, варта стварыць аўтарытэтную камісію па творчай спадчыне Лобана, каб камісія гэтая мела права дапамагчы таленавітай трылогіі загучаць на поўны голас, так, як яна была напісана?

Адзін толькі прыклад. І гаворка, што справа не ў тым, каб з прыстрасным ментарствам вінаваціць кагосьці персанальна, ад іншых патрабаваць перабудовы. Як член рэдкалегіі «Полымя» і рэдсавета «Мастацкай літаратуры», і я нясу сваю частку віны перад светлай памяццю Лобана. Той «недарэзаны» трэці том я чытаў у рукапісе, па просьбе аўтара і рэдакцыі, абараняць прыйшлося тое ўжо, што засталося, каб хоць яно прайшло, а на добры лад мне трэба было прыдаць гэтай справе розгалас, паваяваць за ўвесь аўтарскі тэкст, за права пісьменніка на шчырасць.

Гэта ўсё праўда, і не толькі ў адным выпадку ды ў адным часопісе. Аднак праўда і тое, што нашы рэдкалегіі і рэдсаветы далёка не заўсёды запрашаліся для вырашэння складаных пытанняў. Калі ж такія пытанні і выносіліся на калектыўнае абмеркаванне, як было, напрыклад, з дзённікавымі запісамі Івана Мележа, то за купюры ў іх галасоў аказалася вырашальна больш, чым супраць. І за купюры ў большасці былі якраз тыя ахоўнікі законнасці, якія рукапісу не чыталі, затое добра і даўно ўжо ведалі і ведаюць, што купюры заўсёды і ўсюды вельмі патрэбны. Класічнае, жывучае «трымаць і не пушчаць»!.. Дарэчы, так адбылося раней з дзённікам Кузьмы Чорнага,— у апошняй кнізе яго васьмітомніка дзённік, выдатны творчы і грамадзянскі дакумент свайго часу, пайшоў у абскубленым выглядзе. Запісы Мележа — таксама. У сакавіцкім нумары «Нёмана» надрукаваны фрагмент з дзённіка ссыльнага Барыса Мікуліча. Цікавая, патрэбная публікацыя. Мала хто ведае, аднак, што дзённік гэты, падоўжаны пісьменнікам на адноснай волі, ужо ў Беларусі, меўся быць надрукаваным у тым самым «Нёмане» гадоў пятнаццаць таму назад, але стараннямі зацікаўленых асоб свету тады не пабачыў. Мікуліч рэабілітаваны, ён друкуецца, і дзённік яго, яшчэ адну споведзь чыстага сэрца, трэба аддаць чытачу. Памятаем мы і тое, як наш «ЛіМ» прымушаны быў перадрукаваць са «Звязды» злосны, блізарука-дылетанцкі артыкул супраць адной з аповесцей Быкава, і шмат што іншае.

Што было — тое было. І не ва ўсім яно залежала ад аўтара, рэдактараў і рэдкалегій. Толькі б такое не паўтаралася!...

А тое, што можна выправіць — трэба рабіць неадкладна. Беларускаму і ўсесаюзнаму чытачу трэба вярнуць Алеся Гаруна, Цішку Гартнага, Усевалада Ігнатоўскага, праца якога па айчыннай гісторыі вартая навуковага перавыдання. Дарэчы, як і «Гісторыя беларускай літаратуры» Максіма Гарэцкага. Па добраму прыкладу нашых рускіх братоў, якія з мудрым гаспадарскім клопатам вяртаюць чытачам нашай вялікай краіны беспадстаўна забытыя ці неразумна адкінутыя скарбы народнай культуры.

А што да новага, дык тут вельмі надзённа і важна даць выйсце і дапамогу рэвалюцыйнай шчырасці ў слове.

Прамоўца асудзіў праявы нясціпласці сярод асобных членаў творчай арганізацыі, не заўсёды справядлівае размеркаванне дзяржаўных і іншых прэмій. Ён таксама закрануў пытанне прыёму ў Саюз пісьменнікаў. Не паўзводна трэба прымаць, як часам здаралася, а па два-тры прэтэндэнты за адзін раз, з большай грунтоўнасцю калектыўнага абмеркавання. А то ж у нас амаль кожны другі акандыдачаны філолаг і кожны больш-менш прыстойны журналіст лічыць нялішнім займець яшчэ і пісьменніцкае званне. І прымаем. Бывае, што нават проста з літасці, за кампанію з папярэднімі нялепшымі або каб адчапіцца ад чарговага прабіўнога назолы. Некаторыя з маладых таксама, на жаль, любяць моднае паняцце «выбіць», могуць часам і выенчыць. Зборнічак яшчэ цёплы ад друкарскай машыны, а ўжо нясецца подбегам у камісію па прыёме. Тут зноў жа скідка на гады. Але ж успомнім і святлоўскае: «Маладосць — гэта не заслуга, а ўсяго толькі ўзрост». І ў маладых таленавітасць вельмі хораша бачыцца ў спалучэнні са сціпласцю.

Трэба штосьці кардынальнае рабіць і з нашым Бюро прапаганды мастацкай літаратуры. Колькі яно існуе — столькі і клопату з мастацкім і этычным узроўнем гэтай прапаганды. Залішне часта, паслухаўшы людскія водгукі пра паасобных прапагандыстаў, і сораму можна паспытаць, і падумаць, што карысці і гонару нашай літаратуры такая, з дазволу сказаць, прапаганда не прыносіць,— наадварот!

Так пачуваецца на абранай жыццёвай пазіцыі лірычны герой Пракаповіча.

Не навучыўшыся мітусіцца і шумець, незаўважанай застаецца ў нашай літаратуры Л. Тарасюк — і паэт з божай ласкі, і таленавіты, дасведчаны, удумлівы крытык, чалавек сучаснай філалагічнай культуры. Парадуемся, што не крыўдзіць няўвагай крытыка такіх набываючых сталую сілу паэтаў, як Л. Галубовіч, Л. Дранько-Майсюк, М. Мятліцкі, празаікаў Х. Лялько і У. Арлова. Пашкадуем, што гэткай жа ўвагі не хапае іх літаратурным равеснікам — А. Пісьмянкову, У. Маруку, В. Шніпу, І. Жарнасек. Своечасова заўважыць і падтрымаць таленавіта заяўлены голас — пачэсны абавязак усіх старэйшых таварышаў. Найлепшая падтрымка — выданне кнігі маладога пісьменніка. Гэтым кіраваўся і я, блаславіўшы да друку ў мінулым годзе першую

Тэма размовы на пленуме надзвычай актуальная, так пачаў сваё выступленне **Віктар КАВАЛЕНКА**. Сёння, пасля многіх гадоў штучнага абмежавання і стрымлівання аналітычнай і рэалістычнай думкі, узнікае асаблівая грамадская неабходнасць у глыбокім сацыяльным мысленні літаратуры і крытыкі. Аднак узровень менавіта сацыяльнага асэнсавання жыцця даецца нам пакуль што паранейшаму цяжка.

Бясспрэчна, і ў апошнія дзесяцігоддзі, якія прынята называць застойнымі, беларуская літаратура дала нямала сацыяльна вострых і рэалістычна пераканальных твораў. Мы можам ганарыцца, што ў лепшых сваіх дасягненнях, такіх, як проза В. Быкава з яе філасофскай і грамадзянскай прагай сапраўдных чалавечых каштоўнасцей, як паэзія П. Панчанкі з яе шчырым пафасам маральнага самаачышчэння і сацыяльнага наступу (можна назваць яшчэ імёны), беларуская літаратура дасягала той энергіі і сілы, якая ўласціва самым развітым літаратурам свету. І ўсё ж дастатковага суцяшэння гэтая ісціна не прыносіць, бо залішне вельмі сацыяльна невыразным было агульнае аблічча мастацкай творчасці ў рэспубліцы. Сацыяльныя пытанні ў пераважнай большасці твораў абыходзяцца зусім, і мы ўжо звыклі, што літаратура ўсе недахопы, парушэнні законаў, усё зло, якое ёсць у нашым жыцці, тлумачыць толькі асабістымі маральнымі якасцямі чалавека. І гэта, бадай, адна з самых паказальных прыкмет застою літаратурнай думкі.

Паглыбленне сацыяльнага мыслення, падкрэсліў В. Каваленка, адзін з самых магістральных шляхоў перабудовы ў культурнай і духоўнай сферы. Несумненна, што гэты працэс будзе плённым і паспяховым толькі тады, калі ўся атмасфера літаратурнага жыцця будзе садзейнічаць яго ажыўленню.

Аднак у характары літаратурнага жыцця рэспублікі пакуль што мала адчувальных змен. Мы ўсё яшчэ жывём па старой мадэлі літаратурных узаемаадносін, да якой моцна прывыклі.

Як і раней, пішуцца творы і артыкулы з разлікам не на чытача, а з аглядкай на прапускныя патрабаванні выдавецтва і рэдакцый. Дзейнічае, амаль не змяніўшыся, стары кодэкс адносін паміж аўтарам і рэдактарам, калі рэдактар можа папраўляць аўтарскую канцэпцыю разумення жыцця і літаратуры. Вострыя, палемічныя артыкулы пра арыгінальныя сучасныя творы друкуюцца з з цяжкасцю і нікім не заказваюцца. Асабліва кідаецца ў вочы адсутнасць аналітычных ар-

ПЛЕНУМ ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ

кнігу самастойнага, арыгінальнага паэта А. Жамойціна. Грамадскі савет выдавецтва ўхваліў намер выдаць яго кнігу ў 1988 годзе. Аднак выйшаў з друку канчаткова зацверджаны план — кнігі Жамойціна ў ім няма. Нечая асабістая воля перакрэсліла волю грамадскага савета — цалкам у духу часу, у духу дэмакратызацыі і публічнасці. Сёння Жамойціну трыццаць з гакам. Значыць, дацягнем да сарака — і тады выдадзім першы зборнік маладога саракагадовага паэта. Між іншым, гаворка ідзе пра аўтара, які якраз вельмі дбае пра сваю прафесійную культуру і наогул пра свой духоўны багаж: працуючы памочнікам машыніста на чыгунцы, Жамойцін паспяхова заканчвае аспірантуру пры АН БССР і піша дысертацыю па гісторыі нацыянальнай мастацкай культуры. Я ўспомніў пра Жамойціна і для таго, каб запытацца: як жа нам ўсё-такі быць са своечасовым выданнем першай кнігі маладога аўтара? Справа зайшла ў нейкі — шчыра скажам — тупік. У 1958 годзе ў Беларусі выйшла пяць першых зборнікаў маладых паэтаў, у 1959 годзе — дзевяць, у 1966 годзе — шэсць; у 1988 годзе выйдзе адна першая кніжачка паэзіі, ды і тая — праз пяць гадоў з часу паступлення рукапісу ў выдавецтва. Падкрэслю, што ўсе тыя: і пяць, і дзевяць, і шэсць аўтараў першага зборніка — занялі сваё месца ў літаратуры, памылкі, ва ўсякім разе вялікай, не было. Яшчэ падкрэслю: усе тыя — калі сплюсаваць — дваццаць маладых паэтаў, за выключэннем аднаго ці двух, былі ва ўзросце да трыццаці гадоў, а некаторыя — і да дваццаці пяці гадоў. Што ж здарылася? Дзе прычыны? Хто вінаваты?

Зараз прынята ўрадавая пастанова штогод выдаваць да 12 першых кніжак маладых у выдавецтве «Мастацкая літаратура». Значыць, за кошт існуючага выдавецкага аб'ёму, а не дадаткова ў бібліятэчцы «Маладосці», пытанне пра якую так і застаецца нявырашаным.

Між тым, калі б гэта бібліятэчка пачала выходзіць, то ўжо ў наступным, 1988 годзе чытачы атрымалі б зборнікі вершаў таго ж А. Жамойціна, Л. Пятруль, С. Шах, С. Сокалава, А. Дэбіша, Г. Івановай, Л. Баршчэўскага, А. Цвяха, Т. Мельчанка, С. Валодзькі, В. Куртаніч, кніжкі прозы Л. Неўдаха, В. Мудрова, І. Клімянкова, Л. Марушка, Ф. Сіўко, А. Казлова, У. Міхно... Бачыце, налічыў ажно васемнаццаць. І, на маё перакананне, гэта ўсё, несумненна, здольныя маладыя паэты і празаікі. Зрэшты, некаторыя з іх не такія і маладыя — і па ўзросту, і па творчаму вопыту. Запомнім іх прозвішчы і прасочым, калі дзяржаўнае выдавецтва выдасць іх першыя кнігі. Мы занадта добра ведаем выдавецкую практыку, каб сумнявацца, што сёй-той з іх дачакаецца гэтай радасці толькі праз 5—7 гадоў. І гэта пры нашым становішчы, калі мы так зацікаўлены ў кожным паэтычным парастку, у тым, каб гэта маладая рунь «буйна ўскаласіла» і дала багаты творчы плён!..

Мы перажываем ключавы момант. Сёння ў нас пытанняў больш, чым адказаў на іх, і гэта, бадай, натуральна, бо пытанні накопліваліся доўгі час і не ўздымаліся. Але заўтра такая сітуацыя ўжо не будзе лічыцца натуральнай. Калі ў працэсе перабудовы мы не зможам атрымаць практычны адказ на самыя важныя пытанні — значыць, мы ўпусцім дадзены самім часам шанц.

Ва ўсёй нашай далейшай рабоце будзем помніць галоўнае, а іменна: сацыяльныя і маральныя ідэалы нашага грамадства — гэта камуністычныя ідэалы. Перабудова — не адмаўленне іх, а наадварот, самае рашучае, самае энергічнае сцверджанне. У тым ліку і паэтычным, мастацкім словам. Сцягу, на якім напісана — народнасць, партыйнасць і рэалізм, або праўда жыцця і часу — мы не мяняем. Гэты сцяг — сцяг новага, рэвалюцыйнага мастацтва — быў высока і горда ўзняты ў агні класавых бітваў за набліжэнне і перамогу сацыялістычнай рэвалюцыі, 70-годдзе якой мы будзем неўзабаве ўсенародна святкаваць. Мы — і з намі ўсё прагрэсіўнае чалавецтва. Увесь няпросты і нялёгкі шлях ад Вялікага Кастрычніка і аж да сёння наша літаратура прайшла пад гэтым сцягам. Радасна ўсведамляць, што ён, як і раней, над намі.

Усіх нас чакае вялікая нялёгкая праца. Пажадаем жа адзін аднаму поспехаў і багатага творчага плёну.

тыкулаў на старонках газет «Звязда» і «Советская Белоруссия», хоць у «Правде» і «Известиях» такая практыка існуе. Як аказалася, мы не вельмі сумуем і па сапраўдным дэмакратызме ў літаратурным працэсе: дыскусій ніякіх не вядзём і не пачынаем. Паводзім сябе так, нібыта наогул абмяркоўваць няма чаго. Між тым, існуюць праблемы як гістарычнага плана, так і сучаснай фармацыі, якія патрабуюць неадкладнага і сур'ёзнага навуковага абмеркавання.

Віктар Каваленка і Міхась Мушынскі

Успрыманне гісторыі і сучаснасці мае адну светапоглядную аснову. Таму якраз сёння, калі ў грамадстве выспяваюць важныя, рэвалюцыйныя перамены, з асаблівай выразнасцю адкрываецца, што ў гісторыі беларускай літаратуры патрабуе больш глыбокага асэнсавання, каб яно магло па-сапраўднаму служыць надзённым задачам сённяшняга дня.

Час патрабуе ад літаратуразнаўства і крытыкі, гаварыў далей В. Каваленка, нанова вярнуцца да праблемы вытокаў метаду сацыялістычнага рэалізму ў беларускай літаратуры. Заўважаецца, што, бадай, мы залішне перабольшвалі светапоглядны разрыў паміж рэвалюцыйнай дэмакратыяй і сацыялістычнымі накірункамі мыслення. У выніку ідэйны змест беларускай літаратуры пачатку XX ст. міжвольна недаацэньваўся, а часам і супрацьпастаўляўся пралетарскай ідэалогіі. Па гэтай жа прычыне ўзнікненне метаду сацыялістычнага рэалізму ў беларускай літаратуры неяк само сабою адрывалася ад нацыянальных духоўных вытокаў і выглядала ледзь не чыстым працэсам запазычання.

Думаецца, на новым вітку грамадскага развіцця варта з глыбейшай навуковай аб'ектыўнасцю разгледзець «нашаніўскі» перыяд у развіцці духоўнай культуры беларускага народа. Пра гэты перыяд ужо сказана шмат правільнага і ў навуковых адносінах цікавага. Аднак відавочна, што і недагаворанага яшчэ шмат.

Да гэтай пары амаль не вывучаны перыяд грамадзянскай вайны ў гісторыі беларускай літаратуры. Чамусьці было не прынята асабліва цікавіцца гэтым перыядам, быццам у тыя гады ў беларускай літаратуры дзеялася немаведама што. На самай жа справе тады ўсё адбывалася так, як і павінна было быць у рэвалюцыйны, пераломны, надзвычай напружаны момант гісторыі.

У метадалагічных адносінах асабліва актуальным з'яўляецца аб'ектыўнае вывучэнне літаратурнага працэсу 20-х гадоў, духоўная атмасфера якіх стваралася пад непасрэдным уздзеяннем ленінскай практыкі культурнага будаўніцтва. У літаратуразнаўстве ж аж да гэтага часу існавала недаацэнка гэтага перыяду ў станаўленні маладой савецкай літаратуры.

На думку крытыка, даследаванне сацыяльнага зместу сучаснай літаратуры, устанаўленне яе больш поўнага ідэйна-эстэтычнага аблічча патрабуе не ў апошнюю чаргу пашырэння факталагічнага аналізу. У нас ёсць пісьменнікі, вядомыя і заслужаныя, творчасць якіх яшчэ не разглядалася крытыкай у цэласным, абагульняючым падыходзе. Гэта А. Вялюгін, А. Русецкі, С. Грахоўскі, А. Зарыцкі, В. Зуёнак, А. Асіпенка, А. Васілевіч, А. Кудравец, В. Казько, А. Жук, А. Разанаў, А. Дудараў. Мы прапанавалі выдавецтвам «Універсітэцкае», «Вышэйшая школа» падрыхтаваць, выдаць цыкл нарысаў творчасці пра кожнага з гэтых пісьменнікаў, але пакуль што не ўпэўнены, што наша задума ажыццявіцца.

Адбыліся пленумы праўлення Саюза пісьменнікаў РСФСР і СССР, надрукаваны стэнаграмы, справаздачы. Не ведаю, як у каго, а ў мяне справаздачы разам з пачуццём задавальнення, што сучасныя задачы літаратуры разумеюцца многімі пісьменнікамі рэалістычна і пранікліва, менавіта ў духу новага часу, выклікалі і пачуццё пэўнай трывогі. Залішне шырокім, нават пагражальным здаўся мне фронт зацятага імкнення ўтрымліваць старыя пазіцыі ў мастацкай творчасці.

Не цяжка заўважыць, што вельмі распаўсюджаным, я сказаў бы, таранным сродкам удару па сучасных пераменах у духоўным жыцці стала непрыняцце сацыяльнага пафасу мастацтва. Сацыяльнасць атакуецца, вядома, не адкрыта, а пад знешнім камуфляжам зусім прыстойных тэарэтычных ісцін, напрыклад, пад прыкрыццём абароны сапраўднага мастацтва, вялікай культуры. Дзіўна, але якраз у асяроддзі часткі савецкіх пісьменнікаў моднымі сталі гэткі, ведаеце, снабізм, вяршынна-элітарная пазіцыя, алімпійскі спакой перад бурнымі падзеямі часу. Акцэнт робіцца на тым, што факт — гэта яшчэ не ісціна, што сацыяльная вастрыня — гэта яшчэ не мастацтва. Палажэнні гэтыя ў агульных рысах правільныя, але яны патрабуюць істотных агаворак, бо усё ж такі і факт — момант ісціны, з яго вырастае праўда мастацтва, і сацыяльны змест неадрыўны ад мастацкага прызначэння твора. Аднак галоўнае тут у тым, да якіх канкрэтных падзей літаратурнага жыцця прыстасоўваюцца гэтыя палажэнні. А перш за ўсё да апошніх публікацый сацыяльна вострых і надзённых твораў, якія атрымалі шырокі грамадскі рэзананс.

Шкада, што зманлівы балотны светлячок элітарнасці вабіць таго-сяго і з беларускіх пісьменнікаў, прарочачы ім ні многа ні мала як толькі крызісны стан творчасці.

Да таго ж, варта задумацца над тым, што ўсё гэта было ўжо ў гісторыі літаратуры. Як толькі ўмацоўваліся перадавыя тэндэнцыі ў творчым развіцці, кансерватыўныя і ахоўныя сілы пачыналі крычаць пра мастацкую няздатнасць літаратурнай традыцыі.

Таіса Бондар і Вольга Іпатава.

В. Каваленка падтрымаў асноўны пафас выступлення Н. Гілевіча на апошнім пленуме праўлення СП СССР, выказаўшы сваю нязгоду з некаторымі прыватнымі момантамі.

У заключэнне ён сказаў:

— У працэсе перабудовы нам наканавана лёсам яшчэ прайсці праз агонь барацьбы, шмат што перажыць, з многім сутыкнуцца і весці вострую палеміку. Гэта непазбежна, бо інакш не будзе створана ідэйная і духоўная аснова для трывалага яднання ўсіх здаровых сіл беларускай літаратуры ў адзіным імкненні да вялікіх мэт мастацтва. Хай разгараюцца самыя гарачыя дыскусіі, як таго патрабуе час, але хай пры гэтым це страчваецца грунт высокай маральнай культуры, хай не знікаюць пры гэтым дружалюбнасць і павага. Бо толькі сур'ёзнымі калектыўнымі намаганнямі, калі не будуць марна траціцца сілы на пустую амбіцыёзнасць, на абарону прэтэнцыёзных самалюбстваў, можна дасягнуць высокага ўзроўню сацыяльнага мыслення — мыслення стваральнага і ў поўным значэнні гэтага слова пераўтваральнага.

Гаворку прадоўжыў **Генадзь БУРАЎКІН**. У парадку дня нашага пленума няма слова «перабудова», сказаў ён, але без яе, без гэтага рэвалюцыйнага працэсу, рашуча распачатага партыяй, нельга ўявіць ні сур'ёзнай гаворкі па праблемах сацыяльных і маральных, якія яшчэ зусім нядаўна былі зняважліва адціснуты гаспадарнікамі на другі, а то і на трэці план, ні той атмасферы грамадзянскай смеласці і шчырасці, якая і сёння палохае некаторых бюракратаў. За той, на жаль, даволі доўгі перыд нашай айчыннай гісторыі, які бескампрамісна названы «застойным», паўсюдна, і ў нашым творчым саюзе таксама, буйна ўзнялася і ўпэўнена набрала сілы цэлая кагорта паважных маўчуноў, якія па-філасофску ўсміхаюцца збоку ад гарачых дыскусій, з матэматычнай дакладнасцю вылічваюць так званы канчатковы вынік і сваю сытую мяшчанскую раўнадушнасць аб'яўляюць жыццёвай мудрасцю. Можа, і цяпер у некаторых кабінетах іх пазіцыя здаецца патрыятычнай і разумнай, хаця, акрамя хітрасці і ўласнай выгоды, за ёй практычна нічога не стаіць. Але як добра, што ў пераважнай большасці людзей яна ўжо не выклікае ні павагі, ні жадання да яе далучыцца. Гаварыць па сутнасці, адкрыта і, калі трэба, рэзка становіцца правілам—і я хачу пакарыстацца гэтым правілам разам з вамі.

Я хачу падзяліцца думкамі па так званым нацыянальным пытанні, абнадзеяны і захвочаны словамі Міхаіла Сяргеевіча Гарбачова на студзеньскім (1987 г.) Пленуме ЦК КПСС: «Трэба прызнаць, што памылкі, дапускаемыя ў сферы нацыянальных адносін, іх праяўленні заставаліся ў ценю і гаварыць аб іх было не прынята. Гэта прывяло да адмоўных вынікаў, з якімі цяпер прыходзіцца мець справу».

Я не буду прыводзіць цытат славутых і любімых мною і вамі людзей, пастараюся стрымаць эмоцыі, якіх, дарэчы, было дастаткова і ў вядомай «лімаўскай» гаворцы і ў кулуарных ды інструктыўных каментарыях да яе. Вазьму сабе за памочніка лічбы. Прытым не так званыя «вывадныя», якія дазвалялі пры ўмелым жанглiраванні імі рапартаваць аб не-

(Працяг на стар. 10).

ПЛЕНУМ ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ

(Працяг. Пачатак на стар. 1—9).
існуючых манбланах першаякаснай бавоўны і ненароджаных атарах шашлычных ягнят. Вазьму лічбы ў іх натуральным выглядзе, змешчаныя ў агульнадаступных статыстычных даведніках, і пакладу іх на шалі спрэчкі, напрыклад, аб тым, што трывогі аб развіцці беларускай нацыянальнай культуры дарэмныя і выступленні некаторых інтэлігентаў на гэту тэму, мякка кажучы, прадыктаваны нядобрымі намерамі. Дык вось— некалькі лічбаў.

Выданне кніг і брашур на нацыянальных мовах — сярэдні гадавы тыраж у мільёнах экземпляраў: на рускай мове: 1940 год — 345,7, 1981 год — 1565,8; украінцы: 1940 год — 41,3, 1981—99,2; латышы: 1940 год — 2,4, 1981 год — 12,9; эстонцы: 1940 год—2,2, 1981 год —13,3 і г. д. Беларусь: 1940 год 7,8, 1981 год—7,9.

Далей прамоўца прывёў лічбы, якія характарызуюць колькасць выданняў на кожнага прадстаўніка той ці іншай нацыянальнасці. Ён гаварыў таксама аб зніжэнні тыражу беларускамоўнага буквара, аб некаторых асаблівасцях дэмаграфічнай сітуацыі ў рэспубліцы.

Словам, сказаў Г. Бураўкін, ідзе відавочная, цяжкая вызначальная агульнасаюзнай нашай братэрскай логікай тэндэнцыя на звужэнне ўжывання беларускай мовы, а значыць і на згортванне развіцця нацыянальнай культуры.

Мне могуць сказаць: а што вы хочаце, права кожнага чалавека — выбіраць сабе месца жыхарства і мову. Калі народ адмаўляецца ад сваёй мовы — значыць, яна яму не патрэбна. Давайце не будзем спяшацца з прысудам і зноў звернемся да лічбаў.

Перапіс 1979 года. У рэспубліцы роднай мовай лічаць беларускую 69,8 працэнта ўсяго насельніцтва, рускую — 28,3 працэнта. Роднай мовай беларускую назвалі 83,5 працэнта беларусаў і 16,5 працэнта рускіх. Валодаюць беларускай мовай 82,6 працэнта ўсіх жыхароў рэспублікі, рускай — 81,9 працэнта. Ці не ранавата залічыць беларускую мову ў «неперспектыўныя»?

Вялікі Кастрычнік даў нашай мілай старажытнай мове новы ўзлёт дзяржаўнасці. Вялікі рускі народ вялікадушна і высакародна даў нам сваю магутную, багатую і прыгожую мову як сродак сувязі і паразумення ў агромністай шматнацыянальнай сям'і. І як сардэчны старэйшы брат, мудры і адукаваны, ён не папрасіў нічога ўзамен. Сапраўдныя інтэрнацыяналісты не могуць паважаць і лічыць надзейнымі сябрамі тых, у каго няма пачуцця ўласнай годнасці, хто не адчувае сваіх каранёў, хто не хоча прадоўжыць лепшае, што выпеставана і перададзена нам продкамі.

Ёсць у нас факты адмаўлення ад роднай мовы? Ёсць. Не трэба рабіць выгляд, што іх няма або што яны зусім рэдкія. Гаворка ідзе пра тое, як ацэньваць гэтыя факты. Калі адмаўленне, адрачэнне ад старых бацькоў або няўцямных немаўлят мы дружна і гнеўна асуджаем у прэсе і на сходах як недаравальнае адступленне ад сацыялістычнай маралі, дык ці варта хаця б і ў падтэксце выдаваць за прагрэсіўнае адцуранне ад роднага слова?

Як тут не ўспомніць Уладзіміра Ільіча Леніна: «...трэба ўвесці найстражэйшыя правілы адносна ўжывання нацыянальнай мовы ў іншанацыянальных рэспубліках, якія ўваходзяць у наш саюз, і праверыць гэтыя правілы асабліва старанна. Няма сумнення, што пад выглядам адзінства чыгуначнай службы, пад выглядам адзінства фіскальнага і т. п. у нас, пры сучасным нашым апараце, будзе пранікаць мноства злоўжыванняў... Для барацьбы з гэтымі злоўжываннямі неабходна асаблівая вынаходлівасць, не гаворачы ўжо аб асаблівай шчырасці тых, якія за такую барацьбу возьмуцца». Гэта з апошніх пісем і артыкулаў Ільіча, з яго палітычнага завяшчання.

Васіль Гігевіч, Генадзь Пашкоў і Сцяпан Лаўшук.

У заключэнне, сказаў Г. Бураўкін, прашу вас не сумнявацца, што мае горкія і абвостраныя развагі па вельмі складаным, тонкім і балючым пытанні, якім з'яўляецца нацыянальнае, выкліканы не нацыянальнай палітыкай у нашай дзяржаве (яна ў нас ленінская, вызначаная і акрэсленая Канстытуцыяй СССР, праграмай КПСС, партыйнымі рашэннямі і дакументамі), а штодзённай практыкай у нашай рэспубліцы. Таксама прашу не сумнявацца, што выдатныя дасягненні беларускай літаратуры, беларускай школы, беларускай навукі і мастацтва мне добра вядомыя і вельмі дарагія. Мне толькі дужа хочацца, каб яны былі яшчэ большымі, у што я веру, і каб у іх была ясная і светлая перспектыва. Падтрымлівала мяне ў маёй шчырасці ў гэтым выступленні ў год 70-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі зноў жа ленінская думка аб тым, што найлепшы спосаб адзначыць юбілей або свята — сканцэнтраваць увагу на нявырашаных пытаннях.

Наступным выступіў **Сяргей ЗАКОННІКАЎ.** Ён, у прыватнасці, сказаў:

— Мы сёння вядзём зацікаўленую гаворку аб тым, як мабілізаваць творчыя рэсурсы і рэзервы, актывізаваць удзел нашай літаратуры ва ўсенароднай барацьбе за паскарэнне сацыяльна-эканамічнага, духоўнага развіцця грамадства. Важная частка гэтай работы кладзецца на літаратурныя выданні рэспублікі, у якіх праходзяць апрабацыю, каб прыйсці ўпершыню да чытача, новыя творы. Як непасрэдныя ўдзельнікі сучаснага літаратурнага працэсу, мы адчуваем сваю адказнасць і стараемся як мага лепш рабіць даручаную справу.

Мы разумеем, што часопіс «Полымя» павінен быць тым выданнем, дзе змяшчаюцца лепшыя здабыткі нашай літаратуры. І таму яго старонкі будуць прадастаўляцца творам беларускіх пісьменнікаў, якія найбольш таленавіта, поўна і глыбока паказваюць гісторыю народа, наш час. Асаблівы наш клопат — работа аддзелаў публіцыстыкі, крытыкі і літаратуразнаўства.

Надаючы асаблівае значэнне ўмацаванню дружбы народаў, «Полымя» пастаянна публікуе творы пісьменнікаў усіх братніх рэспублік нашай краіны, а таксама краін сацыялістычнай садружнасці і прагрэсіўных літаратараў Захаду. Вось, напрыклад, такі цікавы факт: у даваенны час членамі рэдакцыйнай калегіі нашага часопіса былі такія сусветнавядомыя пісьменнікі, як Юліус Фучык і Іёганес Бехер. Раман І. Бехера «Люізіт», які на радзіме забараніла друкаваць нямецкая рэакцыя, упершыню быў апублікаваны на беларускай мове ў «Полымі».

Гэтыя традыцыі працягваюцца і зараз. Сёлета ў юбілейны год Вялікага Кастрычніка ў «Полымі» будуць апублікаваны падборкі вершаў рускіх, украінскіх, чувашскіх паэтаў, а дзесяты нумар часопіса пазнаёміць чытачоў з лепшымі апавяданнямі, эсэ, вершамі літаратараў усіх пятнаццаці братніх рэспублік. Абменьваемся мы таксама ў бліжэйшы час нумарамі з украінскім часопісам «Вітчизна».

Як галоўны рэдактар часопіса «Полымя» С. Законнікаў спыніўся на асобных праблемах і цяжкасцях, з якімі сутыкаюцца на сённяшні дзень рэдакцыйныя работнікі. Ён адзначыў, што наша пісьменніцкае слова, на жаль, яшчэ не набыло належнай баявітасці, адкрытасці, страснасці.

Я далёкі ад катэгарычнага выраду адносна ўсёй нашай літаратуры, сказаў С. Законнікаў. У нас ёсць выдатныя прыклады тых пісьменнікаў, каму не трэба перабудоўвацца, хто ўсё сваё жыццё не падладжваўся пад абставіны, а быў вышэй іх, хто сумленна і мужна змагаўся за высокія народныя ідэалы, пісаў праўдзіва, з гранічнай душэўнай адкрытасцю. Маю на ўвазе перш за ўсё нашых пастаянных аўтараў — народнага паэта Беларусі Пімена Панчанку, народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава.

І ў гады застою з'яўляліся ў нашай літаратуры творы, якія ўзнімалі менавіта тыя сацыяльныя і маральныя праблемы, над вырашэннем якіх сёння працуе партыя і ўвесь народ. Іншая справа, што сумленнае, трывожнае, балючае, горкае слова нават лепшых, вядомых нашых пісьменнікаў у свой час не заўважылася, не пачулася. Чаму ж людзі застаюцца глухімі да неспакойнага шчырага голасу літаратараў? Чаму пісьменніцкае слова не выкарыстоўваецца ў практычнай дзейнасці тымі, хто адказвае за духоўнае здароўе народа?

Парадаксальнасць сітуацыі, калі беларуская літаратура мае сёння такі высокі аўтарытэт і прызнанне на ўсесаюзным узроўні, а ў сябе дома ўсё ж страчвае чытачоў і прыхільнікаў, абумоўлена ў пэўнай меры тым, што, як ні дзіўна, літаратура, а таксама іншыя гуманітарныя навукі не ўключаны на поўную сілу ў шматгранны працэс выхавання людзей. Мы ведаем, колькі непрадуманасці, непаразумення ў школьных праграмах і падручніках (і з класікай, і з сучаснымі творамі), як нядбайна, прымітыўна выкладаецца літаратура ў многіх школах, вучылішчах, тэхнікумах і нават вышэйшых навучальных установах, як і тое, што многія бібліятэкі—школьныя, дзяржаўныя, прафсаюзныя і г. д. — не маюць падпісак на рэспубліканскія літаратурныя часопісы, што ў дзіцячых бібліятэках не хапае нават тых кніг, якія ўключаны ў праграму, што надзвычай кепска прапагандуюцца, выкарыстоўваюцца ў ідэйна-выхаваўчай, культурна-масавай рабоце творы беларускіх пісьменнікаў. Няма стройнай паслядоўнай сістэмы далучэння да літаратуры шырокіх мас людзей, іх літаратурнай адукацыі. Эпізадычнасць, негрунтоўнасць гэтай работы прыводзіць да таго, што многія губляюць сяброўства з кнігай ужо ў школьныя гады, а літаратура ж павінна ісці поруч з чалавекам праз усё жыццё. Ні тэлебачанне, ні кіно, ні тэатр, пры ўсёй павазе да іх, не могуць яе замяніць.

С. Законнікаў выказаў пажаданне, каб наша пісьменніцкая арганізацыя больш актыўна і мэтанакіравана павяла шэфства над школай, каб урокі літаратуры, якія праводзяць у школах В. Вітка і А. Клышка, сталі правілам.

Як ні балюча гаварыць аб гэтым, працягваў далей прамоўца, але ў страце чытачоў, павагі да нашай мовы і літаратуры вінаваты і мы самі — пісьменнікі. Вінаваты, у пэўнай ступені, нізкай якасцю сваіх твораў: другаснасцю, драбнатэм'ем у прозе, недахопам сацыяльнай актыўнасці, грамадзянскасці ў паэзіі, інертнасцю мыслення ў публіцыстыцы, заспакоенасцю, бяздумнай таўталогіяй у крытыцы. Вінаваты тым, што нават мова многіх нашых твораў — наш галоўны прафесійны рыштунак — неахайная, прымітыўная, канцылярская.

Мы адстаём ад наспелых праблем жыцця, а калі і вырашаем іх, то часта павярхоўна, легкадумна. Стала дэфіцытам натуральная, шчырая размова пісьменніка з людзьмі, з чытачамі. Многія выступленні, чытацкія канферэнцыі і іншыя масавыя мерапрыемствы робяцца наскокам, а таму няма збліжэння з людзьмі, часам, наадварот, адбываецца адчужэнне, скептычнае стаўленне да нялёгкай пісьменніцкай працы, да нашай літаратуры ўвогуле.

Вінаваты мы і ў тым, што ў самім пісьменніцкім асяроддзі, у яго маральным мікраклімаце ёсць хібы. Сёння, у такі адказны час, кожны з нас не мае права разменьваць свае здольнасці, талент на дробязную валтузню, задаволенне ўласных амбіцый, на ўсё мізэрнае, эгаістычнае. На нас пільна глядзяць людзі, і таму мы павінны жыць і працаваць па вышэйшай мерцы сумленнасці і адказнасці, праяўляць больш цярпімасці да думкі іншага, больш самакрытычнасці.

А зараз пра тое, самае набалелае, што надзвычай хвалюе сёння тых, хто знаходзіцца ў гэтай зале, а таксама шырокае кола грамадскасці рэспублікі, працягваў С. Законнікаў. У нашай мовы і літаратуры вялікі, слаўны і надта складаны, цяжкі лёс. Упершыню магчымасць свабодна развівацца яны атрымалі ў 1917 годзе, і звязана гэта з дарагім усім нам імем Уладзіміра Ільіча Леніна. Чаму ж цяпер — на 70-м годзе Савецкай улады—даводзіцца з такой трывогай гаварыць аб праблемах не толькі іх развіцця, але і існавання? Тут прысутнічаюць усе пакаленні пісьменнікаў. Старэйшыя памятаюць, якія негатыўныя працэсы ў нацыянальнай палітыцы адбываліся на пачатку, а затым у канцы 30-х гадоў, у першы пасляваенны перыяд. І сёння мы не можам сказаць, што, маючы безліч недахопаў у эканамічным, сацыяльным развіцці, у прыкладной і грамадскай навуцы, аб чым шырока гаворыцца і пішацца, за час застою не было зроблена ніводнай памылкі ў сферы нацыянальнай палітыкі. Пры ўсёй неабходнасці і аб'ектыўнасці развіцця двухмоўя, якое не аспрэчвае ніводзін жыхар рэспублікі, а, наадварот, вітае і выкарыстоўвае для свайго развіцця, усё ж у адносінах да беларускай мовы дапускаўся суб'ектывізм. Праблемы развіцця беларускай мовы ў сучасны момант вельмі спецыфічныя, не такія, як у іншых рэспубліках, вырашаць іх больш складана, але калі дбаць пра будучыню народа, нацыі, то займацца імі трэба. Неабходна без ажыятажу, спакойна, па-дзелавому разабрацца і там, дзе трэба, паправіць становішча. Развітое двухмоўе, якое існуе ў рэспубліцы, патрабуе ўважлівага вывучэння ўсіх з гэтым звязаных працэсаў і прыняцця разумных, прадуманых, неардынарных рашэнняў. І ў першую чаргу — нашы дзеці і ўнукі павінны мець магчымасць паралельна з рускай мовай не толькі вывучаць беларускую мову, але і навучацца на ёй, пачынаючы з дзіцячых садоў і затым з першага класа ў школе. А для гэтага неабходна рыхтаваць кадры выхавацеляў і настаўнікаў.

Гавару пра гэта з усёй адказнасцю за свае словы як камуніст, які перакананы інтэрнацыяналіст. Пачуццё інтэрнацыяналізму з маленства прывіў мне бацька—камуніст, франтавік, які больш сарака гадоў выкладаў у школе рускую мову і літаратуру, разам з маці выгадаваў пяцёра дзяцей. Сёння ў нашай сям'і ёсць беларусы, рускія, літовец, мардвінка. Усе мы выдатна валодаем рускай мовай, любім рускую літаратуру і культуру. І радасна яшчэ тое, што кожны з нас з павагай адносіцца да іншых, дзеліцца нечым сваім, узбагачае ведамі, нацыянальным духоўным здабыткам. Так павінна быць у кожнай малой, і ў нашай вялікай, дружнай, інтэрнацыянальнай сям'і братніх народаў Савецкай Айчыны. Мы—беларусы — гэтай дружбай даражылі і будзем даражыць.

Нашым сацыялістычным грамадствам пастаўлена высакародная задача гарманічнага развіцця чалавека. Але так адбылося, што ў апошнія дзесяцігоддзі менш увагі звярталася на духоўны пачатак, абсалютызаваліся матэрыяльныя асновы жыцця. Гэта несправядліва і ў дачыненні да сучаснікаў, а тым больш нашых наступнікаў. Самы неацэнны скарб, пра які ўсім нам — рабочым, калгаснікам, інтэлігенцыі — трэба дбаць, які перадаецца з пакалення ў пакаленне, — гэта культура, духоўнае багацце. Без яго не могуць існаваць ні эканоміка, ні палітыка.

У нашай краіне створаны фонд культуры. Ёсць яго аддзяленне і ў рэспубліцы. Ні ў якой меры не прымяншаючы значэння гэтай арганізацыі, хачу сказаць, што сёння ўсімі сродкамі, у тым ліку і літаратурай, нам трэба разгарнуць фронт культуры. Трэба пайсці гэтым фронтам у наступ на духоўную заскарузласць, грамадскую абыякавасць і апатыю, на масавую псеўдакультуру, якая атупляе людзей і можа быць прыраўнена да зброі масавага знішчэння, на хцівасць, рабскую спажывецкую псіхалогію, дапамагчы абудзіць у кожным чалавеку ўласную годнасць, пачуцці высокай маралі, жаданне прынесці сваёй самаадданай працай найбольшую карысць Савецкай Радзіме. Без гэтага наш імклівы рух наперад ва ўсіх галінах сацыяльна-эканамічнага развіцця немагчымы, — закончыў сваё выступленне С. Законнікаў.

Некаторыя аспекты перабудовы закранула ў сваім выступленні і **Святлана АЛЕКСІЕВІЧ.** Часам ствараецца ўражанне, што мы не ўмеем жыць ва ўмовах дэмакратыі, гаварыла яна. Быццам займаемся нейкім гіпнозам, пераконваючы адзін аднаго, што мяняемся.

Час патрабуе ад усіх нас вялікай мужнасці, высокай прынцыповасці. Патрэбны сапраўдныя ідэі, а за гэта нясе адказнасць і літаратура. Руская літаратура, напрыклад, яшчэ дваццаць—трыццаць гадоў на-

ПЛЕНУМ ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ

зад пісала аб тым, што ёй баліць. Цяпер, паведаміла С. Алексіевіч, я працую над творам, у якім будуць успаміны тых, хто перажыў падзеі трыццатых гадоў. Хацелася б запытацца, а ці ёсць у беларускай літаратуры раман, аповесць аб раскулачванні, аб трагедыі 1937 года?

Адбылася нейкая падмена ў нашым духоўным жыцці. Кожны дзень па тэлевізары паказваюць ваенны фільм. Што можа адбыцца з нармальнай псіхікай чалавека, калі чалавечае жыццё нічога не варта? Чаму, задала пытанне прамоўца, — усюды — у школах, ПТВ і г. д. толькі музеі Вялікай Айчыннай вайны? У нас жа такая багатая гісторыя. У выніку склалася сітуацыя, што ёсць дастаткова людзей, якія гатовы кінуцца на амбразуру, і мала людзей, якія разумеюць, што жыццё — гэта духоўная работа.

С. Алексіевіч не пагадзілася з ацэнкай дакладчыка некаторых момантаў творчасці А. Адамовіча.

Анатоль КУДРАВЕЦ зачытаў вытрымкі з чытацкага ліста, даланага нядаўна ў часопіс «Нёман». Слесар з горада Асіповічы выказаў свой боль і заклапочанасць з прычыны непаважлівага стаўлення да роднай мовы ў асяроддзі беларусаў, адсутнасці беларускіх школ і дзіцячых садоў у гарадах. Так, праблема ёсць, і не пісьменнікі яе прыдумалі. Пра яе з трывогай гаворыць, пішуць у рэдакцыі газет і часопісаў, на радыё і тэлебачанне настаўнікі, рабочыя, калгаснікі. Далей А. Кудравец сказаў:

— Наколькі наша сённяшняя культурнамоўная сітуацыя адпавядае і дапамагае духу перабудовы? Наколькі яна садзейнічае развіццю гарманічнай асобы — чэснай, патрыятычнай, незакамплексаванай ні нацыянальным эгаізмам, ні касмапалітычнай усяеднасцю? Перабудовы, у перспектыве разлічанай на тое, каб даць зямлі гаспадара, а чалавеку яго чалавечае Я — вартасць, годнасць, гордасць. Уменне, жаданне браць на сябе адказнасць і адказваць за яе. Мы жывём у адказнейшы час. Час, калі вырашэнне набалелых дзяржаўных праблем набывае глабальнае значэнне. Праблем у прамысловасці, у сельскай гаспадарцы, праблем моладзі, школы.

Усе гэтыя жыццёвыя праблемы — і праблемы літаратуры, гэта яшчэ ненапісаныя раманы, аповесці, драмы, вершы.

Галоўная сённяшняя трывога, і не толькі пісьменнікаў, — гэта падзенне духоўнасці і маралі. Падсякаючы нацыянальныя карэнні і традыцыі і не даючы ўзамен раўнацэннага, мы адкрываем шлюзы для наплыву замежнага, пошлага. Мы без бою здаём абагрэтыя і абжытыя дзядамі і бацькамі траншэі, каб потым з вялікай кроўю адваёўваць назад. На вялікі жаль, адваяваць не заўсёды ўдаецца.

Ажывіць у чалавеку пачуццё смеласці і чалавечай годнасці, упэўненасці і веры ў сваё вялікае прадвызначэнне і права заставацца чалавекам—гэта задача пад сілу толькі ўсяму грамадству, зазначыў у заключэнне А. Кудравец.

Вольга ІПАТАВА звярнула ўвагу на пытанні ўважлівага стаўлення да гістарычнай спадчыны, гаварыла аб вяртанні ў рэспубліку параскіданых па гарадах і краінах нацыянальных багаццяў. Даўняя, заскарузлая, састарэлая звычка ўсё, што тычыць клопату аб нацыянальнай беларускай культуры, працягвала яна, лічыць нечым ледзь не падазроным, жыве і сёння. Нам раяць узмацніць інтэрнацыянальнае выхаванне. Хто ж з гэтым спрачаецца! Але ж і праблемы трэба вырашаць!

Глыбока блізка мне, рускай па нацыянальнасці, гаварыла далей прамоўца, выказванне аб тым, што Беларусь сёння—рэгіён развітога двухмоўя. Але для таго, каб дзве мовы развіваліся нармальна і натуральна, мала толькі свабоднага волевыяўлення насельніцтва, патрэбны і дзяржаўны клопат. «Веданне мовы не перадаецца спадчынна, яе трэба вучыць і вучыць», — гэта з перадавога артыкула «Правды». Вучыць дзве мовы ўсюды — у гарадах і мястэчках, у ВНУ і ПТВ, на ўсіх узроўнях — ад школьніка да міністра, каб мова не стала анахранізмам, не засталася толькі на этыкетках і шыльдах.

Свабоднае волевыяўленне... Але скажыце, што гэта за такі рэзкі скачок волевыяўлення адбыўся, напрыклад, за шэсць гадоў у выдавецтве «Народная асвета», калі з 62 тысяч тыраж беларускага буквара ўпаў да 33 тысяч? Людзі выказаліся? Калі не — то хто і як вызначае патрэбную колькасць? Сацыялагічныя даследаванні? Попыт насельніцтва? Хутчэй за ўсё — зноў той жа факт голага адміністравання, непавагі да тых, хто хацеў бы вучыць сваіх дзяцей у школе з беларускай мовай навучання.

Чытаю зараз серыю гістарычных кніг, выдадзеных нашымі суседзямі-палякамі. З іх многае даведваюся пра ўласную культуру, таму што там, у суседзяў, хапае ўсяго — і сур'ёзных навуковых прац, разлічаных на спецыяліста, і белетрыстыкі для ўсіх, і перавыданняў класікі і някласікі пра гісторыю. «Дзве каралевы» Крашэўскага, «Каралева Ядвіга», «Як у даўняй Польшчы каралёў выбіралі». Уяўляю твары нашых кнігавыдаўцоў, калі б прынесла кнігу з падобнай назвай. Адзіная пакуль для шырокай публікі кніга, дзе пішацца пра агромністую, неабдымную нашу гісторыю,— «Памяць пра легенды» К. Тарасава,— каб выйсці ў свет, патрабавала сапраўды мужчынскай вынослівасці.

У беларускіх пісьменнікаў, як і ў інтэлігенцыі ўсёй краіны, шмат спраў па выпраўленню таго становішча, што склалася ў мінулыя гады. Вярнуць давер да слова, дабіцца галоснасці пры вылучэнні праектаў па экалогіі і па знясенні помнікаў культуры — а энтузіязм у нас ідзе ў асноўным знізу,— задача пісьменнікаў. Але нам патрэбна дапамагаць, да нас трэба прыслухоўвацца. Канечне, і патрабаваць ад нас кампетэнтнасці, адказнасці за слова. Працаваць сумесна, а не глядзець з недаверам. Галоснасць і дэмакратычнасць — патрабаванне часу. Пры жыцці нашага пакалення такая спроба ўжо была ў 60-я гады. Страшна падумаць, што перабудова можа захлынуцца, што па-ранейшаму будуць працвітаць бюракратызм і пустаслоўе. І хто тады будзе думаць, як ратаваць караблі нашай культуры ад пяскоў забыцця і раўнадушша? І якімі стратамі абернецца гэта для нашых дзяцей, для будучых пакаленняў?

На пленуме выступіў госць з Літвы, крытык **Альфрэдас ГУШЧУС**. Ён, у прыватнасці, сказаў:

— Выяўленне дыялектыкі барацьбы дабра са злом сёння яўна карэкціруе эстэтычныя прынцыпы літаратуры. Вось чаму нас ужо не задавальняюць хоць бы і вычварна паказаныя бытавыя перыпетыі, хоць бы і памайстэрску выкананы аналіз псіхалагічных калізій — твор, у якім за спінай героя, яго спраў, яго адносін з іншымі персанажамі не праглядваюцца прастор агульнага жыцця, гістарычны шлях народа, вялікія пытанні часу, што вырашаюцца яго сучаснікамі. Такі твор застаецца на перыферыі чытацкай свядомасці. Многае залежыць ад філасофскага размаху аўтара, ад яго мастацкай мэты, ад грамадзянскай пазіцыі, не толькі ад таленту — два аднолькавыя па моцы таленту аўтары створаць твор рознай вартасці, калі аднаму з іх нестае смеласці, моманту рызыкі, калі ён пабаіцца ўзварушыць сваю і чужую душу, калі не адважыцца парушыць інерцыю спакойнага, а дакладней сказаць — мяшчанскага існавання.

Далей А. Гушчус спыніўся на аповесці Р. Гранаўскаса «Жыццё пад клёнам», дзе знайшлі ўвасабленне многія негатыўныя з'явы сучаснасці. Так, выратаваць душу моладзі можна толькі комплексным выхаваўчым працэсам, у якім на першым плане павінна стаяць патрыятычнае выхаванне, а яно немагчыма без дапамогі роднай мовы, лічыць ён. Таму ўсе мы з вялікай увагай прыслухаліся да слоў на гэты конт першага сакратара Ніла Гілевіча, які выступаў на нядаўнім пленуме Саюза пісьменнікаў СССР. Так, адносіны да роднай мовы — адзін з галоўных крытэрыяў ацэнкі развіцця асобы. Бо мова ж нарадзілася не ў нейкай там лабараторыі, не які-небудзь цар або кароль яе вынайшлі. Яна ўзнікла ў працяглым сусветным гістарычным працэсе, таму яе трэба абараняць законам, як абараняюцца суверэннасць і граніцы дзяржавы.

Сумныя вынікі ў выкладанні, ва ўжыванні родных моў у некаторых нашых рэспубліках — гэта вынік скажэння ленінскай нацыянальнай палітыкі. Настаў час па-новаму, г. зн. нармальна глядзець на грамадзяніна, шчыра зацікаўленага станам сваёй роднай мовы, сваёй гісторыі, культуры, гістарычнай памяццю сваіх суайчыннікаў. Інтэрнацыянальнае збліжэнне савецкіх народаў нічога агульнага не павінна мець з асіміляцыяй нацыянальных моў, традыцый, звычаяў. Уніфікацыя добрая толькі ў матэматычных працэсах, у камп'ютэрызацыі, робатызацыі, а ў сацыяльнай сферы яна вядзе толькі да касмапалітызму, да прымітывізму, да шэрасці.

Літаратура мае шмат спосабаў уплыву на чытачоў, працягваў літоўскі крытык. Але самы сучасны спосаб, самая сучасная мастацкая канцэпцыя — гэта любоў аўтара да паказанага чалавека, вернасць праўдзе жыцця, якая стала не трыбунным лозунгам, а арганічнай часткай яго істоты. Але праўда, справядлівасць заўсёды былі дэфіцытам. Амаль усе ў нас ганьбяць пасляваенную літаратуру за яе павярхоўнасць, схематызм, дагматызм, пры гэтым самі сталі не заўважаць, што заражаюцца падобнымі хібамі. Колькі пасрэдных, шэрых, часта грамадска індыферэнтных твораў у нас з'явілася ў апошнія гады! Чаму? З-за адсутнасці таленту аўтараў? Не, таму, што многія літаратары сталі змагацца не за праўду жыцця, не за справядлівасць, а за свой уласны дабрабыт. Мы сёння адкрыта прызнаёмся, што перад многімі складанымі з'явамі жыцця проста заплюшчвалі вочы, не надта хваляваліся, калі ў бітве праўды і хлусні, дабра і зла перамагалі цёмныя сілы. Так, патрэбны немалыя духоўныя намаганні, вялікая грамадзянская смеласць, калі хочаш умяшацца ў гэтую барацьбу.

«Не літаратура вінавата, ці яна найменшым чынам вінавата ў тым, што праўда аб трагічных баках гісторыі нашага народа засталася нявыказанай. Але літаратура супярэчыла б сама сабе, калі б не старалася выказаць яе да канца, адчыняючы дзверы няўмольнай патрэбнасці памяці»,— так словамі В. Аскоцкага з часопіса «Вопросы литературы» закончыў А. Гушчус сваё выступленне.

Адмоўную рэакцыю сярод удзельнікаў пленума выклікала выступленне С. Букчына, змешчанае напярэдадні ў «ЛГ».

Алесь ПЕТРАШКЕВІЧ выказаў свае думкі адносна артыкула С. Букчына «Причуды местных амбиций», адзначыўшы наўмыснасць асноўных палажэнняў аўтара, яго спробы звесці асабістыя рахункі.

Прамоўца падкрэсліў, што калі ўважліва прыгледзецца да перамен, якія адбываюцца ў жыцці краіны, то без цяжкасці можна заўважыць размежаванне сіл, асабліва ў асяроддзі творчых работнікаў. Пацвярджэннем таму, у прыватнасці, сталі з'езды і пленумы творчых саюзаў. Становіцца зразумелым, хто ёсць хто, хто чаго хоча, хто да чаго імкнецца і якімі сродкамі дзейнічае. Адбываецца размежаванне і ў мастацкай крытыцы.

Сямён БУКЧЫН спрабаваў удакладніць некаторыя моманты свайго артыкула, змешчанага ў «ЛГ».

Я заўсёды з вялікай зайздрасцю і горыччу, сказала **Алена КОБЕЦ-ФІЛІМОНАВА**, чытаю ў «Литературной газете» артыкулы, у якіх гаворыцца аб тым, што ў маскоўскіх выданнях шырока адчынены дзверы для той літаратуры, якая доўга і ўпарта замоўчвалася, ляжала ў архівах. Такім чынам аддаецца належнае пісьменнікам, незаслужана забытым. Нежаданне друкаваць іх творы, як правіла, было прадыктавана негалосным аргументам: складанасць біяграфіі. Але ж аб чалавеку мяркуюць не па яго біяграфіі, а па яго справах.

Алена Васілевіч і Ніна Мацяш.

Далей А. Кобец-Філімонава гаварыла пра цяжкасці з выданнем выбраных твораў Рыгора Кобеца.

Відавочна, што літаратурнае жыццё цесна злучана з перабудовай, гаварыў у сваім выступленні **Кастусь ТАРАСАЎ**. Некаторыя з прысутных тут пісьменнікаў дзесяцігоддзі працавалі на перабудову. Не ўсе дачакаліся гэтых часоў, асветленых надзеяй. У ліку апошніх, тых, каго ўжо няма сярод нас, і Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч. Мноства штучных перашкод, створаных недасведчанымі, малапісьменнымі ў гісторыі і культуры асобамі, азмрочылі ягоны творчы шлях. Творчасць Караткевіча — гэтага надзвіжніка, сапраўднага «рыцаря без страха и упрёка», чалавека, адоранага унікальным талентам — была прысвечана мінуўшчыне роднага народа. Ён адлюстраваў не толькі трагічную гісторыю беларускага народа, ён выявіў тую моц народнага духу, той аптымізм, якія дазволілі вытрываць усе трагічныя выпрабаванні. Народ з павагай прыняў творы Караткевіча, яго боль, спадзяванні, духоўнае свята. Таму я звяртаюся да пленума, сказаў прамоўца, з наступнай прапановай: узняць пытанне аб прысваенні У. Караткевічу пасмяротна заслужанага ім 30-гадовай працай звання «народны пісьменнік Беларусі».

Усе мы, вобразна кажучы, у нейкай меры апынуліся ў ролі спячай прыгажуні з вядомай казкі,— пачала сваё выступленне **Раіса БАРАВІКОВА**. Прачнуліся, а ўжо, аказваецца, і час не той, і жыццё не тое, і праблем адразу навалілася столькі, што як і разабрацца!

З болем загаварылі мы пра становішча з роднай мовай у рэспубліцы. Ёсць і яшчэ адна праблема: мы аказаліся без прытоку яркіх, свежых сіл у літаратуру. Чатыры гады працую кансультантам пры «Чырвонай змене», дзе ў свой час мы ўсе надрукавалі свае першыя творы,— заўважу, не ў 25 і не ў 35 гадоў, а большасць з нас — у 15, 16... Дзе ж цяпер нашы юныя таленты? Мне могуць запярэчыць: маўляў, талент нараджае жыццё або сапраўдны талент заўсёды праб'е сабе дарогу. А навошта сапраўднаму таленту **прабіваць** сабе дарогу? Навошта ставіць заслоны, якія трэба прабіваць? І хто іх ставіць? Сапраўдны талент трэба заўважыць і прызнаць.

Мы зараз адкрыта гаворым пра негатыўныя з'явы ў 70-ых гадах, працягвала Р. Баравікова, а хіба гэтыя з'явы не закранулі і нас, наш творчы саюз? Хіба не было ў нас чынашанавання, хіба не было, калі, страчваючы пасаду, чалавек страчваў усё?...

Частка нашых праблем — толькі вынік нашага раўнадушша, нашай абыякавасці да ўсяго і ўсіх. Мы праспалі некалькі пакаленняў у літаратуры, пачынаючы ад маіх сяброў, саракагадовых, і заканчваючы самымі маладымі. Мы можам праспаць і наша будучае. Агульнавядома, што самы актыўны ва ўсіх сферах літаратурнага жыцця — далёка не самы таленавіты. Вось і атрымліваецца, што пакуль таленавіты працуе над сваімі творамі, актыўны заваёўвае месца пад сонцам. Дык давайце думаць пра таленавітае будучае. Два гады назад пры Саюзе пісьменнікаў была створана школа юнага літаратара. Што сталася з гэтай школай? Яна аказалася проста эксперыментам, які не даў адпаведных вынікаў, які сябе не апраўдаў. Мы адмовіліся займацца гэтай справай і пры гэтым разводзім рукамі.

З трывогай гаварыла Р. Баравікова пра слабы прыток у нашу дзіцячую літаратуру, пра тоўстыя «фаліянты», якія замест тонкіх чытэльных кніжачак выдае «Юнацтва» і якіх не асіліць ні бацькам, ні дзецям. Яна выказала шэраг сур'ёзных прэтэнзій да спектакля «Шукай ветру ў полі», які ўжо амаль дзесяць год ідзе на сцэне тэатра юнага гледача.

Не магу не сказаць некалькі слоў і пра Рэспубліканскае свята паэзіі, гаварыла далей паэтэса. Яно звялося фактычна да свята дзесяці-дванаццаці паэтаў. Відаць, трэба праводзіць яго больш шырока, ва ўсіх абласных цэнтрах рэспублікі, не пакідаючы за межамі свята і нашу моладзь. Гэта толькі дадало б аўтарытэту абласным аддзяленням. У таварыствах кнігалюбаў нашы кніжкі ўсё часцей ідуць «у нагрузку». Хто ж стане паважаць пісьменніка, твор якога набываецца такім чынам? «У нагрузку», між іншым, ідуць не тыя тоненькія паэтычныя кніжачкі па 20—40 капеек, а тамы выбраных твораў і перавыданняў. Дык да-

(Заканчэнне на стар. 12).

ПЛЕНУМ ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1—11).

вайце больш па-гаспадарску падыдзем да гэтага пытання. Ніхто не будзе займацца нашымі праблемамі, акрамя нас саміх.

Пісьменнікі былі ініцыятарамі, прапагандыстамі ідэі стварэння сістэмы Аграпрома, зазначыў **Яўген БУДЗІНАС,** змагаліся з міжведамаснасцю ў галіне нашай сельскай гаспадаркі. Здавалася б, радавацца трэба: замест шасці міністэрстваў створана адна арганізацыя. Але сумная гэтая ўрачыстасць. Сама ідэя стварэння Аграпрома зафармалізавана і абюракрачана. Узнікла гіганцкая нават для нашай краіны кантора, суперміністэрства, якое ўжо гатова пахаваць сябе пад паперамі, інструкцыямі, дырэктывамі.

Ці не так у нас атрымліваецца і з самой перабудовай? — пытаецца Я. Будзінас. Перамога слова пры поўнай затарможанасці справы. Кожнае пачынанне адразу абрастае забаронамі, інструкцыямі, кантралёрамі, рэвізорамі і г. д. Чалавек патрабуе свабоды і дэмакратыі дзеянняў, але калі толькі яму іх дазваляюць, палахліва хаваецца за загад, за ўзгадненне, за інструкцыю ці распараджэнне. З імі жыць спакайней, ні за што не трэба адказваць.

Але галоснасць і дэмакратычнасць—гэта зусім не безадказнасць. Ад літаратуры сёння чакаюць не столькі хлёсткіх фраз, калі вастрыня робіцца самамэтай, колькі глыбіні аналізу. Зразумець прычыну таго, што адбываецца,— вось што заўсёды было асноўным сэнсам літаратуры і асабліва публіцыстыкі.

Можна гаварыць пра неразбярыху, пра неразуменне сутнасці перабудовы, пра пасіўнасць і нават палахлівасць многіх, але галоўнае супраціўленне, сказаў Я. Будзінас, аказваюць перабудове людзі, якіх мы называем чыноўнікамі і якія на ўсіх узроўнях грамадскага жыцця чэпка трымаюцца за свае прывілеі.

Усе гэтыя пытанні, мяркуе Я. Будзінас, не могуць абыходзіць сваёй увагай пісьменнікі. Разам з тым неабходна вучыцца аператыўнасці. Прамоўца прывёў прыклады з уласнай практыкі, калі вымушаны быў друкавацца ў Маскве, бо ў рэспубліцы разгляд рукапісаў зацягваўся на гады. Наогул, пакуль што да публіцыстыкі ў нас ставяцца без належнай увагі. Ці не гэтым можна растлумачыць факт, што на ўсесаюзным семінары маладых публіцыстаў, што праходзіў у Доме творчасці «Іслач», не прысутнічала ніводнага публіцыста з рэспублікі.

Шэраг пытанняў арганізацыйнага жыцця Саюза пісьменнікаў узняў **Аляксей КАРПЮК.** Ён гаварыў аб неабходнасці ўважлівага стаўлення да роднай мовы, аб патрэбе сапраўднай галоснасці, аб падрыхтоўцы да юбілею Кастуся Каліноўскага.

Даклад Ніла Гілевіча мяне, як і большасць у гэтай зале, многім парадаваў. На жаль, у ім не закранута пытанне аб стане мастацкага перакладу, сказаў у сваім выступленні **Вячаслаў РАГОЙША.** А перакладчыцкая гаспадарка таксама не малая, не такая простая, нявырашаных, нават балючых пытанняў у ёй хапае. Гэта і пэўныя пралікі ў планавасці перакладных выданняў, і стаўленне да перакладу як да другараднай літаратуры з боку асобных рэдактараў перыядычных выданняў і выдавецкіх работнікаў, і слабасць, неаператыўнасць крытыкі перакладу, і адсутнасць мер заахвочвання ў гэтай галіне і г. д. Дарэчы, большасць з гэтых пытанняў пры жаданні можна было б вырашыць, так сказаць, у рабочым парадку, намаганнямі сакратарыята Саюза пісьменнікаў і Дзяржкамвыда БССР. Аднак ці тут знаходзіцца яно, тое галоўнае звяно, узяўшыся за якое можна зрушыць з месца гэты цяжкі, у некаторых месцах праржавелы, мнагадзённы і мнагазвонны «ланцуг» перакладчыцкіх і перакладазнаўчых праблем?

Нядаўна, прыслухаўшыся да голасу літаратурнай грамадскасці, улічыўшы выдавецкую практыку іншых рэспублік. Дзяржкамвыд БССР прыняў рашэнне распачаць выданне перакладной серыі «Скарбы сусветнай літаратуры» ў ста тамах. Я не буду аналізаваць тут сам праспект выдання, тым больш, што ён у стане абмеркавання, не мае яшчэ канчатковага выгляду. Выкажу толькі трывогу за рэальнасць ажыццяўлення гэтага намеру.

У сучаснай беларускай літаратуры нямала таленавітых пісьменнікаў, якія працуюць у галіне мастацкага перакладу. Але, на жаль, цяжка, а то і немагчыма назваць перакладчыка, які б, як мы кажам, калегіяльна, непасрэдна з мовы арыгінала ўзнавіў па-беларуску «Іліяду» і «Адысею» Гамера, «Энеіду» Вергілія, «Боскую камедыю» Дантэ, «Дон Кіхота», Сервантэса, «Дэкамерона» Бакачыо, «Гарганцюа і Пантагруэля» Рабле і шэраг іншых шэдэўраў замежнай літаратуры. Пра шэдэўры ж літаратур народаў СССР, за выключэннем хіба рускай, украінскай ды яшчэ дзвюх-трох, і гаварыць не даводзіцца, хоць на неабходнасць вывучэння моў народаў СССР у нас звярталася ўвага яшчэ ў 20-я гады. Ці не сорам нам прызнавацца ў гэтым сёння, на сёмым дзесятку існавання Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі? Вядома, сорамна. Чаму ж так атрымалася? А давайце глянем, дзе і як мы рыхтуем, а дакладней сказаць — дзе і як не рыхтуем, страчваем патэнцыяльных перакладчыкаў і «Адысеі», і «Боскай камедыі», і многіх іншых шэдэўраў сусветнай класікі.

Пачынаецца гэта, на думку прамоўцы, са школы.

Увогуле, сярэдняя школа Беларусі, што жыве ў атмасферы рэальнага двухмоўя, да гэтага часу амаль зусім не выкарыстоўвае вялікія магчымасці, якія дае практыка калі не замежна-нацыянальнага, то хаця б руска-беларускага ўзаемаперакладу для глыбейшага засваення той і другой мовы, для выпрацоўкі ў вучняў перакладчыцкіх навыкаў. У асобных рэспубліках нашай краіны, скажам, у суседняй Латвіі, ужо даўно ўведзены ў школьныя праграмы факультатыўныя курсы тэорыі і практыкі руска - нацыянальнага перакладу, праводзяцца штогоднія рэспубліканскія конкурсы сярод школьнікаў на лепшы пераклад з рускай мовы на латышскую (для вучняў латышскіх школ) і з латышскай мовы на рускую (для вучняў рускіх школ). Ці ведаюць, ці чулі пра гэта нашы мінасветаўскія работнікі? Думаю, што чулі. Тады чаму не выкарыстоўваюць вопыт іншых рэспублік? Адказаць на гэта цяжка.

Як вядома, сапраўдны перакладчык павінен валодаць дзвюма мовамі: той, з якой перакладае, і — асабліва дасканала — той, на якую перакладае, г. зн. замежнай і роднай. Дзе такія веды можна атрымаць патэнцыяльнаму беларускаму перакладчыку? Па сутнасці, няма дзе. У адрозненне ад большасці саюзных рэспублік, ні ў адным з універсітэтаў БССР няма факультэта ці хаця б аддзялення класічнай, а таксама славянскай філалогіі, на якіх рыхтавалі б спецыялістаў лацінскай, старажытнагрэчаскай, славянскіх моў і літаратур. Лепшая сітуацыя, на першы погляд, існуе з вывучэннем сучасных рамана-германскіх моў. Выпускнік школы, які хоча авалодаць англійскай, нямецкай, французскай або іспанскай мовай, можа паступіць у Мінскі педінстытут замежных моў, у якім, дарэчы, ёсць і асобны перакладчыцкі факультэт. Вось дзе, здаецца, гняздо беларускіх перакладчыкаў! Аднак чамусьці з гэтага гнязда за ўвесь час існавання інстытута вылецела ўсяго з паўдзесятка перакладчыкаў, сённяшніх членаў СП БССР. Няўжо сярод студэнтаў інстытута няма адораных хлопцаў і дзяўчат, якія з часам маглі б узбагаціць беларускую савецкую культуру шэдэўрамі іншаземнага пісьменства? Безумоўна, ёсць і, думаю, нямала. Але справа ў тым, што ў Мінскім педінстытуце замежных моў адсутнічае магчымасць, разам з вывучэннем замежнай мовы, не тое што ўдасканаліць свае веды па роднай мове, а хаця б не забыцца яе. Тыя 30 гадзін беларускай мовы на перакладчыцкім факультэце і 40 гадзін беларускай літаратуры — на педагагічных факультэтах, што маюцца цяпер у вучэбных планах інстытута, вядома, справы не выратоўваюць.

Дарэчы, працягваў В. Рагойша, у Мінскім інстытуце замежных моў існуе адзіная ў рэспубліцы кафедра тэорыі перакладу, якая, зразумела, павінна даследаваць і пытанні перакладу мастацкага. Але хто ў рэспубліцы ведае пра яе існаванне?

Справу са становішчам беларускай мовы і літаратуры ў гэтай установе, вядома, трэба папраўляць. Разам з тым, думаецца, праблему кадраў беларускіх перакладчыкаў з яшчэ большым поспехам можна было б вырашыць праз падрыхтоўку спецыялістаў замежных моў і літаратур з універсітэцкай адукацыяй. Як вядома, універсітэцкі вучэбны план адрозніваецца ад педінстытута сваёй разнастайнасцю і навуковай грунтоўнасцю, ён прадугледжвае абавязковае вывучэнне, побач з замежнымі, рускай і роднай моў і літаратур. Пры адным з універсітэтаў рэспублікі не складана было б арганізаваць факультэт замежнай філалогіі з аддзяленнямі класічным, славянскім і рамана-германскім. Спецыялісты замежных моў і літаратур з універсітэцкай спецыяльнай адукацыяй праявілі б сябе не толькі ў перакладчыцкай дзейнасці, але і ў народнай асвеце, культуры, навуцы.

Калі ў нас мала што робіцца з падрыхтоўкай беларускіх перакладчыкаў замежных літаратур, то што ўжо казаць пра перакладчыкаў з моў народаў СССР! Праўда, Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна пачаў саматугам зрушваць гэтую справу з месца. На аснове двухбаковага пагадненя паміж ім, з аднаго боку, і Тбіліскім і Ерэванскім універсітэтамі, з другога, у Мінску прайшлі курс навучання беларускай мове некалькі армянскіх і грузінскіх студэнтаў, якія цяпер даволі паспяхова перакладаюць і даследуюць беларускую літаратуру. Беларускі універсітэт гатовы быў бы і далей абменьвацца студэнтамі для ўзаемнага вывучэння моў, прычым літаральна з усімі сталічнымі універсітэтамі прыбалтыйскіх, закаўказскіх і сярэднеазіяцкіх рэспублік. Аднак стрымліваюць дзве акалічнасці. Папершае, Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР яшчэ афіцыйна не ўвяло такі абмен у практыку філалагічнага навучання. Падругое, планавыя органы рэспублікі не вырашылі пытання рацыянальнага размеркавання на працу такіх спецыялістаў-філолагаў — знаўцаў моў народаў СССР. У выніку дагэтуль справа дзяржаўнай важнасці вырашаецца, па сутнасці, самадзейна.

— Такім чынам, асноўнае звяно няпростага «ланцуга» перакладчыцкіх праблем — гэта праблема кадраў. Ад разумнага і зацікаўленага вырашэння гэтай праблемы залежыць вельмі многае, калі не ўсё. Хочацца верыць, што з дапамогай дырэктыўных органаў рэспублікі яна будзе ўрэшце належным чынам вырашана,— сказаў у заключэнне В. Рагойша.

Пра нацыянальна-моўную сітуацыю ў рэспубліцы, пра некаторыя з тых прычын, што яе абумовілі, гаварыў **Уладзімір ДАМАШЭВІЧ.**

На пленуме выступіў першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР **Уладзімір КАРПАЎ.** Мы пражылі больш года пасля XXVII з'езда КПСС, а ў ліпені споўніцца год пасля правядзення VIII з'езда пісьменнікаў краіны, сказаў ён. Год — тэрмін немалы. Аднак, зразумела, усе нашыя застойныя з'явы, недахопы, ідэалагічныя праблемы вырашыць за гэты час немагчыма. Аб гэтым, дарэчы, неаднойчы гаварыў Міхаіл Сяргеевіч Гарбачоў. Праграма перабудовы — праграма шматгадовая, рэвалюцыйныя пераўтварэнні ідуць паступова. Але і за гэты час, як паказаў маскоўскі пленум і як пацвярджае пачутае тут, на пленуме праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі, мы ўсе значна выраслі ў сацыяльным мысленні.

Выступленні на пленуме — не дробязныя, у іх гаварылася аб шырокіх, вялікіх праблемах, якія тычацца беларускай і ўсёй савецкай літаратуры, усяго нашага народа. Вядома, працягваў У. Карпаў, і ў вас, і ў нас ёсць групаўшчына. Аднак у вашых выступленнях не яна давала аб сабе знаць, а выяўлялася грамадзянская пазіцыя прамоўцаў, іх заклапочанасць агульнымі справамі, іх страснасць, імкненне палепшыць работу, выкараніць недахопы. Усё гэта пацвярджае, што наш пісьменніцкі калектыў, наш творчы саюз пытанні перабудовы ўспрыняў сэрцам, дбае аб ажыццяўленні пераўтварэнняў, і няма ў нашым асяроддзі тых, хто не прыняў бы саму ідэю перабудовы.

Тут гаварылася, што нам патрэбны новыя сілы, што трэба актывізаваць энергію пісьменнікаў, па-старому далей працаваць нельга. Сапраўды, менш бюракратыі, больш творчых спраў. І не забываць, што галоўная наша справа — гэта кнігі.

Дэмакратыя, гаварыў далей У. Карпаў,— вялікая заваёва савецкага грамадства. Але, на гэта неаднаразова ўказваў Міхаіл Сяргеевіч Гарбачоў, дэмакратыяй трэба ўмець карыстацца. Добра, што мы пішам і гаворым праўду, друкуем Гумілёва, Ахматаву і іншых пісьменнікаў, але ж неабходна і пачуццё меры. Набліжаецца 70-годдзе Вялікага Кастрычніка, выйшлі шостыя нумары часопісаў, але жыццё ў іх паўстае ў аднабаковым плане. Навошта ж мяняць ружовыя акуляры на чорныя? Ёсць негатыўныя з'явы, ды не з адных іх складваецца паўсядзённасць.

У. Карпаў падтрымаў клопат беларускіх літаратараў аб становішчы і развіцці роднай мовы. Праблемы неабходна вырашаць, сказаў ён.

У заключэнне У. Карпаў адказаў на зададзеныя яму пытанні.

З заключным словам выступіў дакладчык Н. Гілевіч. Ён падкрэсліў важнасць гаворкі, якая адбылася на пленуме, выказаў спадзяванне, што яна паспрыяе актывізацыі творчых сіл пісьменніцкай арганізацыі, павышэнню яе ролі ў агульнай справе перабудовы, абнаўлення нашага грамадства.

МУЗЫКА

ПРАЦА НАПРУЖАНАЯ, ДАПЫТЛІВАЯ, ТВОРЧАЯ



Канцэрт лаўрэата міжнародных конкурсаў піяніста Аляксандра Целякова ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі запомніўся як яркая мастацкая з'ява. Спрабуючы вызначыць творчую манеру музыканта, звяртаеш увагу, вядома, на высокі сучасны ўзровень яго піянізму. Усе тэхнічныя «прамудрасці» А. Целякоў вырашае за клавіятурай лёгка і нязмушана. Але дасканалае валоданне інструментам само па сабе наўрад ці сёння каго-небудзь здзівіць. Рух пальцаў павінен спадарожнічаць руху душы, інакш музыка стала б разнавіднасцю інтэлектуальнай гульні, нейкім гукавым пасьянсам.

А. Целякоў валодае яркай эмацыянальнасцю і воляй, але не дэманструе іх як нейкія спартыўныя дасягненні, а цалкам падпарадкоўвае ўсе выканаўчыя сродкі цяжкай мастацкай задачы — раскрыць вобразны свет твора, услухацца ў аўтарскую інтанацыю і дакладна перадаць яе, не скажаючы эмацыянальнай «адсябяцінай». Піяніст нібыта адсоўвае сябе ў цень, калі ўласныя пачуцці гучаць ва унісон з творам...

У «Баркароле» Ф. Шапэна не было ніякай салоннай млявасці, пустой сузіральнасці, наадварот: вялікая ўнутраная канцэнтрацыя эмоцый, воля ў цудоўным сплаве з глыбокім пачуццём. Такі Шапэн — мужны ў самай вытанчанай лірыцы—усё яшчэ палемічны. Некаторыя выканаўцы чамусьці пазбаўляюць яго музыку валявой накіраванасці. Ігра А. Целякова пераконвае, што гэта няправільна. Невыпадкова ж Ф. Шапэн напісаў «Рэвалюцыйны эцюд»!

«Венскі карнавал» Р. Шумана вымагае ад выканаўцы поўнага псіхалагічнага пераўвасаблення. Шуман перадае свае жыццёвыя ўражанні ў калейдаскопе непаўторных імгненняў, у кіпенні разнастайных, часам кантрастных пачуццяў, у іх надзвычай хуткай змене. І побач з гэтым — па-юнацку чыстая, даверлівая і давяральная лірыка, гэткая ж цудоўная, як у Шапэна, але зусім іншая!

«Мефіста-вальс» Ф. Ліста прагучаў надзіва свежа. У асобных эпізодах адчувалася штосьці амаль булгакаўскае, фантасмагарычнае. Лірыка ў гэтым творы асаблівая — з «барвовым» адценнем. Пад пальцамі піяніста ўся гэта «д'ябальшчына» робіцца незвычайным станам чалавечай душы, асаблівым рамантычным светаўспрыманнем.

У другім аддзяленні прагучалі санаты І. Лучанка і Р. Шчадрына: гэта строгі «графічны» каларыт, урбаністычная пейзажнасць, жорсткая дынаміка. Сучасны свет, сучасныя рытмы, рацыянальная псіхалогія чалавека другой паловы дваццатага стагоддзя перададзены піяністам досыць праўдзіва і пазнавальна.

На «бis» А. Целякоў натхнёна іграў вечна маладых А. Скрабіна і Ф. Шапэна.

Мінуў амаль год з часу VIII Міжнароднага конкурсу імя П. Чайкоўскага. У званні лаўрэата самага аўтарытэтнага музычнага спаборніцтва А. Целякоў шмат і паспяхова канцэртуе, развіваючы і ўдасканальваючы свой выканаўчы стыль. Нягледзячы на маладосць, яму ёсць што сказаць і сваім вучням — студэнтам Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. Ён памагае ім усвядоміць галоўнае: спасціжэнне музыкі — гэта праца, настойлівая, працяглая, дапытлівая.

Н. ЗЛАТКОЎСКАЯ.

НА ТЭМУ ДНЯ

ПАМЯТАЦЬ, БЕРАГЧЫ, АДНАЎЛЯЦЬ

6 ЧЭРВЕНЯ адбыўся II пленум Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, прысвечаны задачам арганізацый Таварыства па выкананні пастановы ЦК КПСС «Аб падрыхтоўцы да 70-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі». З дакладам на пленуме выступіў намеснік старшыні таварыства, намеснік міністра культуры Беларусі **У. А. Гілеп.** У дакументах XXVII з'езда КПСС, адзначыў прамоўца, распрацавана шырокая разнастайная праграма развіцця культуры, якая грунтуецца на ленінскіх прынцыпах адносін да культурнай спадчыны. Кіруючыся рашэннямі партыйных органаў, аддзяленні таварыства праводзяць пэўную работу па выяўленні і ахове помнікаў, прапагандзе матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей нашага народа, выхаванні моладзі на працоўных і баявых традыцыях, на лепшых культурных здабытках. Да юбілею Вялікага Кастрычніка ў рэспубліцы будуць адкрыты новыя помнікі У. І. Леніну ў Оршы і Светлагорску, вырашана пытанне аб устаноўцы памятных дошак на вакзальных будынках Брэста, Мінска, Оршы — тых станцый, праз якія праязджаў Ленін.

За мінулы год, праінфармаваў У. Гілеп, у рэспубліцы створана 320 новых первічных арганізацый таварыства, у яго шэрагі прынята 30 тысяч чалавек. Самы вялікі колькасны рост арганізацый адбыўся ў Брэсцкай, Мінскай, Гродзенскай абласцях. У Гродзенскім раёне членам таварыства з'яўляецца кожны другі дарослы жыхар. На такіх прадпрыемствах, як «Гарызонт» (Мінск), Баранавіцкае лакаматыўнае дэпо, «Маналіт» (Віцебск), у первічныя арганізацыі таварыства ўваходзіць большасць работнікаў.

Органы аховы помнікаў правялі вялікую работу па даследаванні памятных мясцін, складзены перспектыўныя планы рамонту і рэстаўрацыі. Рэстаўрацыйныя і рамонтныя работы па ўсіх помніках Беларусі патрабуюць агульных выдаткаў коштам 500 мільёнаў рублёў. Да 1990 года на штогодні аб'ём рэстаўрацыйных работ будзе выдзелена 10 мільёнаў рублёў, супраць 1,5 мільёна, якія выдаткоўваюцца зараз. Так што справа рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры прыпадзе на жыццё некалькіх пакаленняў, і мы абавязаны правесці ўсе неабходныя кансервацыйныя і рамонтныя работы, каб помнікі маглі дачакацца сваёй чаргі па планах рэстаўрацыі. У сувязі з гэтым даўно наспела патрэба перабудовы нашага мыслення, нашых адносін да помнікаў. Нельга лічыць нармальнай з'явай актывізацыю намаганняў на час месячнікаў аховы помнікаў і змяншэння ўвагі да іх у астатні час. Асабліва гэта тычыцца помнікаў баявой славы, захаванняў савецкіх воінаў. Вельмі непакоіць і стан помнікаў археалогіі, якія сёння часта знішчаюцца пры будаўніцтве, сельскагаспадарчых работах, меліярацыі. Летась толькі ў калгасе імя Гастэлы Мінскага раёна знішчаны 44 курганныя магільнікі. Галоўныя прычыны гэтай прыкрай з'явы — недасведчанасць тэхнічных спецыялістаў, кіраўнікоў гаспадарак і ўстаноў пра гістарычную і культурную вартасць помнікаў, а таксама адсутнасць на большасці помнікаў археалогіі ахоўных знакаў. Таварыству разам з органамі аховы помнікаў трэба неадкладна выпрацаваць эфектыўныя меры па зберажэнні археалагічнай спадчыны. Неабходна для гістарычнай і культурнай прапаганды выкарыстаць усе вялікія магчымасці нашых культурна-асветніцкіх устаноў, якіх у рэспубліцы больш за шэсць тысяч.

Удзельнікі пленума абмеркавалі шырокае кола актуальных задач. Старшыня навукова-метадычнага савета Рэспубліканскага савета таварыства **Э. Загарульскі** адзначыў відавочны спад краязнаўства ў рэспубліцы, змяншэнне колькасці краязнаўцаў, няўвагу да іх з боку раённых арганізацый таварыства. Не выкарыстоўваюцца для рамонту помнікаў і догляду за ім студэнцкія будаўнічыя атрады. І гэта пры той умове, што таварыства з году ў год не асвойвае сродкі, якія выдзяляюцца на ўзнаўленне помнікаў. Патрабуе ўдакладнення Закон аб ахове помнікаў, фармуліроўкі якога зараз не дазваляюць прыцягнуць да адказнасці віноўных у пашкоджанні нашай матэрыяльнай спадчыны мінулага.

Галоўны архітэктар Бярозаўскага раёна **А. Маразюк** падкрэсліў важнасць і неабходнасць стварэння музея ў былым канцэнтрацыйным лагеры Бяроза-Картузская, дзе пакутавалі 10 тысяч вязняў — змагароў за ўз'яднанне Заходняй і Усходняй Беларусі. Патрабуе неадкладнага вырашэння і лёс другога унікальнага помніка — былога кляштара картэзіянцаў, — у сценах якога зараз размешчаны свінарнік.

Дырэктар Віцебскага абласнога краязнаўчага музея **Н. Сулецкая** падзялілася сваім непакоем у сувязі з марудными тэмпамі рамонту музея, які не працуе ўжо шэсць год. Яна таксама адзначыла патрэбу навуковага даследавання тых 30 археалагічных помнікаў, якія трапілі ў зону затаплення вадасховішчам Даўгаўпілскай ГЭС, будаўніцтва якой прыпынена, але пакуль што не адменена.

Старшыня секцыі археалогіі Рэспубліканскага савета таварыства **П. Лысенка** прывёў шматлікія факты знішчэння курганных магільнікаў, гаварыў пра небяспечны наступ бульдозера і плуга. Патрабуе вырашэння і пытанне з кансервацыяй унікальнага Віцебскага замчышча, раскапанага 10 гадоў назад.

Пытанням рэканструкцыі, рэстаўрацыі і прыстасавання будынкаў Верхняга горада ў Мінску прысвяціў сваё выступленне археолаг **І. Чарняўскі.** Асабліва дзіўным, гаварыў ён, здаецца намер гарвыканкома аддаць пасля рамонту будынак былога кляштара бернардынак пад падменны жыллёвы фонд. Больш прадуманага функцыянальнага прыстасавання патрабуюць і іншыя будынкі ансамбля Верхняга горада. Пакуль што ў праекце рэканструкцыі не прадугледжана адраджэнне ратушы, гадзіннікавай вежы, такога унікальнага помніка беларускага барока, як Святадухаўская царква. Нельга пагадзіцца з тэзісам гарвыканкома, што горад не мае сродкаў на гэтыя аб'екты, бо не рабілася нават спробы абвясціць збор добраахвотных ахвяраванняў у спецыяльны фонд.

Доктар гістарычных навук **Л. Побаль** выказаўся за неабходнасць зберажэння шляхам кансервацыі Мінскага крамля. Драўляныя часткі яго, знойдзеныя пры раскопках, дэманструюць унікальныя архітэктурныя якасці, гэта — помнік сусветнага значэння. Тым не менш, амаль нічога не робіцца, каб выратаваць яго ад знікнення.

Гісторык **У. Палуян** у сваім выступленні выказаў думку, што прэзідыум таварыства абавязаны звярнуцца да адпаведных партыйных і савецкіх органаў з прапагандай увесці ва ўсіх вучэбных установах хоць бы невялікі курс па ахове помнікаў гісторыі і культуры. Патрэбен такі курс і для вучылішчаў, у якіх навучаюцца будучыя механізатары, меліяратары, будаўнікі.

Па абмеркаваных пытаннях пленум таварыства прыняў пастанову.

Пасяджэнне вяла і адказвала на пытанні, узнятыя прамоўцамі, старшыня таварыства, намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР **Н. М. Мазай.**

НАШ КАР.

«ЛіМ» ПАВЕДАМЛЯЕ

УТВОРАНА МУЗЫЧНАЕ ТАВАРЫСТВА

У Мінску адбылася ўстаноўчая канферэнцыя Музычнага таварыства Беларускай ССР. З дакладам «Аб задачах МТ БССР у святле рашэнняў XXVII з'езда КПСС» выступіў старшыня праўлення Саюза кампазітараў рэспублікі народны артыст СССР І. Лучанок. Адбыліся выбары кіруючых органаў новага таварыства. Старшынёй праўлення выбраны заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага акадэмічнага народнага хору імя Г. Цітовіча М. Дрынеўскі.

Нататкі з устаноўчай канферэнцыі будуць надрукаваны ў «ЛіМе».

НАШ КАР.

ДЫЯЛОГ З ЧАСАМ

Чарговая выстаўка самадзейных мастакоў і майстроў-умельцаў горада-героя Мінска і Мінскай вобласці, якая адкрылася ў аўторак у Палацы мастацтваў, праходзіць у рамках II Усесаюзнага фестывалю народнай творчасці, прысвечанага 70-годдзю Вялікага Кастрычніка. Творы, прадстаўленыя ў экспазіцыі, раскрываюць стваральную працу савецкіх людзей, адлюстроўваюць подзвіг народа ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, старонкі гераічнага мінулага. Сярод аўтараў — рабочыя і служачыя, работнікі сельскай гаспадаркі і пенсіянеры.

Многія творы выкананы членамі народнага клуба самадзейных мастакоў «Мінск». Удзельнікі выстаўкі пазнаюць почырк П. Красавінай, К. Чубанава, С. Чэпікава і іншых, чые работы неаднаразова ўжо дэманстраваліся ў шматлікіх экспазіцыях, поруч выступаюць тыя, хто нядаўна далучыўся да самадзейнага мастацтва.

Значнае месца займаюць ткацтва, саломапляценне, фларыстыка, разьба па дрэве.

ПРЫСВОЕНА ЗВАННЕ «НАРОДНЫ»

Больш за пятнаццаць гадоў кіруе харавым калектывам калгаса імя Гастэлы Мінскага раёна Наталля Мурашка. Нядаўна аўтарытэтная камісія Міністэрства культуры БССР, у склад якой уваходзяць вядомыя мастацтвазнаўцы, выкладчыкі Белдзяржкансерваторыі, Мінскага інстытута культуры, метадысты Рэспубліканскага навукова-метадычнага цэнтра народнай творчасці і культасветработы, зрабіла прафесійнае заключэнне аб прысваенні хору ганаровага звання «народны».

Паказальны канцэрт, які адбыўся ў калгасным Палацы культуры, сабраў паўнюткую залу гледачоў — працаўнікоў палёў і ферм, механізатараў настаўнікаў, вучняў. Паўтары гадзіны гучалі песні аб родным краі, любві да зямлі, да бацькоў і нашчадкаў. Гучалі ўзнёсла, шырока і раздольна, чыста і меладычна. Атэстацыйная камісія аднагалосна прызнала хор народным і духам, і зместам.

А. СУРЫНОВІЧ.

У ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ ПУШКІНА

У чарговы раз прайшло па краіне Усесаюзнае пушкінскае свята. Не абмінула яно і вёску Цялуша, што на Бабруйшчыне. Тут у дзень нараджэння вялікага рускага паэта гучалі яго вершы — як у арыгінале, так і ў перакладзе на беларускую мову.

У Цялушы пахавана Наталля Аляксандраўна Варанцова-Вельямінава, дачка старэйшага сына паэта Аляксандра Аляксандравіча Пушкіна. Не першы год у гэтых мясцінах праходзяць мерапрыемствы, прысвечаныя памяці паэта. На гэты раз да жыхароў раёна прыехалі паэты Ала Канапелька і Яўген Міклашэўскі.

ДОРАЦЬ РАДАСЦЬ ВЫЦІНАНКІ

Няпросты заказ атрымаў мастак-афарміцель Ружанскага гарпасялковага Дома культуры Юрый Малішэўскі. Для музея старажытнабеларускай культуры Акадэміі навук БССР ён рыхтуе калекцыю выцінанак. Складаныя кампазіцыі выконваюцца мастаком з паперы пры дапамозе вострага ляза.

Старадаўнім мастацтвам выцінанкі, некалі шырока распаўсюджаным у народзе, зацікавіў Малішэўскага маскоўскі мастак М. Варанецкі. Захапленне перарасло ў сістэматычную працу, якая дае цудоўны плён. Работы мастака закуплены Брэсцкім краязнаўчым музеем, Ялцінскім музеем народнай творчасці, экспанаваліся ў Брэсце, Кобрыне.

Выцінанкі Малішэўскага — частка створанага ім у Доме культуры этнаграфічнага салона. У салоне збіраецца моладзь на заняткі студыі маладых мастакоў, якую таксама стварыў Ю. Малішэўскі.

М. КАЗЛОВІЧ.

ТАМ, ДЗЕ КРЫНІЧКА ПАЭТА...

У Ракуцёўшчыне, у мясцінах, звязаных з імем класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча, адбылося нядаўна свята паэзіі і песні. Мінула 70 гадоў з таго часу, як перастала біцца сэрца паэта, але яго светлая муза і сёння адухаўляе наша жыццё. Пра гэта ў сваіх выступленнях гаварылі старэйшы паэт, заслужаны работнік культуры рэспублікі Максім Лужанін, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР Данута Бічэль-Загнетава, паэты Уладзімір Паўлаў, Галіна Каржанеўская, Валянціна Аколава, дырэктар Літаратурнага музея імя М. Багдановіча В. Хадкевіч. Прафесійныя артысты і самадзейныя выканаўцы Маладзечаншчыны таксама прымалі ўдзел у свяце, якое стала ўжо традыцыйным.

Г. ЗЯНЬКЕВІЧ.

З УЗНАГАРОДАЙ!

За заслугі ў развіцці савецкага выяўленчага мастацтва і ў сувязі з пяцідзесяцігоддзем з дня нараджэння Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў мастака-скульптара лаўрэата Ленінскай прэміі **ЗАНКОВІЧА** Валянціна Паўлавіча Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

ЧАСОПІСЫ Ў ЧЭРВЕНІ

«ПОЛЫМЯ»

Змешчаны вершы Ю. Голуба, М. Мятліцкага, Ф. Баторына.

Друкуецца раман І. Навуменкі «Асеннія мелодыі», апавяданні М. Капыловіча, мемуарныя запісы Я. Скрыгана «Скураное паліто».

Пад рубрыкай «З літаратурнай спадчыны» публікуецца «Паэма тугі» А. Бачылы.

«Публіцыстыка» прадстаўлена артыкулам Я. Пушкіна «Ад размоў — да справы».

Да 70-годдзя Вялікага Кастрычніка прымеркаваны артыкул М. Сташкевіча «У гарніле рэвалюцыі».

Чытач пазнаёміцца з нарысамі В. Шырко «Каб спявала зямля» і Р. Карпенкава «На мірным напрамку».

У раздзеле «Крытыка і літаратуразнаўства» — артыкулы М. Тычыны «Пад сцягам народнасці», У. Калесніка — «Усё людское...» (роздум аб творчасці Я. Брыля).

Кнігі рэцэнзуюць Б. Бур'ян (зборнік паэзіі Р. Барадуліна «Маўчанне перуна»), А. Марціновіч (раман Л. Левановіча «Шчыглы»), М. Ермаловіч (кніга аповесцей К. Тарасава «Странствие в тесном кругу»).

Ёсць падборка «Наш каляндар».

«МАЛАДОСЦЬ»

З вершамі выступаюць С. Законнікаў, Л. Дранько-Майсюк, Г. Каржанеўская, Ф. Баторын, С. Валодзька.

Змешчаны палеская быль А. Наварыча «Цкаванне Вялікага Звера», пачатак аповесці Г. Марчука «Паляшук», нарысы «Цяпло чужога сэрца» У. Саламахі, «Прага жыцця» Э. Карніловіча, «Легендай і славай авеяны» В. Трыхманенкі, артыкул М. Солапава «Як казка — цымбалы».

«Адказнасць перад часам» — адказы мастакоў Я. Батальёнка, М. Купавы, Л. Кальмаевай, А. Лося, Р. Сітніцы, В. Янушкевіча на анкету «Маладосці».

Л. Тарасюк рэцэнзуе энцыклапедычны даведнік «Янка Купала» — «Спасціжэнне Купалы», Х. Лялько разглядае першую кнігу прозы І. Жарнасек «Ліст да сына» — «З даверам і любоўю».

«БЕЛАРУСЬ»

Публікуюцца матэрыялы, якія расказваюць аб справах савецкага народа ў шостай пяцігодцы.

Пад рубрыкай «Палемічныя нататкі» змешчаны артыкул А. Ярася «Каэфіцыент прадпрымальнасці», «Актуальны погляд» — публіцыстычны роздум В. Янкоўскага «Шчыльней рады!».

Друкуюцца вершы У. Скарынкіна, Н. Радзівончык, М. Ждановіча, апавяданні А. Глобуса, працяг дакументальнай аповесці Ю. Іванова і І. Майданава «Аперацыя «Крот», пачатак нарыса В. Жука «Лыжка мёду, бочка дзёгцю...».

Апавяданне І. Клімянкова «Начная сустрэча» прадстаўляе У. Дамашэвіч, «Оду крэпасцям і храмам» грузінскага паэта Ш. Нішніанідзе пераклаў В. Рагойша.

З Я. Брылём гутарыць Р. Станкевіч — «Праўда пачуццяў, праўда паэзіі».

«Кватэра свая і чужая» — чытачы абмяркоўваюць артыкул В. Лапіна «Ордэр з купонамі».

«НЁМАН»

Паэзія прадстаўлена творамі С. Гаўрусёва (пер. Н. Кісліка) і А. Дракахруста.

У раздзеле прозы — раман Я. Радкевіча «Хроніка вясновай непагадзі» (пер. В. Бжазоўскага) і апавяданне М. Філіповіч «Сафійка-Зоська» (пер. В. Нікіцінай).

«Хроніка аднаго вытворчага расследавання» — падзагаловак нарыса У. Кажэўнікава «Цана прэстыжу».

Пад рубрыкай «Запіскі. Успаміны. Дакументы» змешчаны артыкулы А. Хацкевіча «На Заходнім фронце», А. Сафонава «Домыслы і факты» — абодва да 70-годдзя Вялікага Кастрычніка і С. Букчына «Карэспандэнт Валерый Брусаў».

«Лёсы вайны, лёсы міру» — літаратурна-крытычны артыкул В. Акудовіча.

З рэцэнзіямі выступаюць М. Тычына, А. Сямёнава, А. Кохан.

Завяршае нумар раздзел «Учора. Сёння. Заўтра».

З ЛІТАРАТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

Алесь БАЧЫЛА

ПАЭМА ТУГІ

Апошні варыянт «Паэмы тугі» быў закончаны Алесем Бачылам у пачатку 1982 года, але праўкі ён рабіў яшчэ 2-га снежня 1983 года. Раптоўная смерць спыніла працу на 31-й старонцы (памёр паэт 4 снежня 1983 года).

Праз усё жыццё пранёс ён любоў да селяніна, да зямлі, да вёскі. Тэмай паэмы і з'явіўся лёс селяніна 30-х гадоў.

Сёння «ЛіМ» прапануе чытачам урывак з «Паэмы тугі». Цалкам яна будзе надрукавана ў часопісе «Полымя».

А ўжо
прыгрэтая павець
Званіла капяжом.
Пагоркі
Між снегу
пачалі лысець.
У вольны час
на прызбах новых,
Пакуль не ўветралі
палі,
Гадалі мудрыя галовы
Прырэзаць дзе б
яшчэ зямлі.
Перабіралі ўсё,
што ўпотай
Прыгледзеў кожны
за зіму...
І ўспомніў нехта
пра балота...
«Яго ж
не згораць аднаму...»
І раптам...
стала ў грудзях цесна —
Зардзеўся бацькаў твар:
«Пастой!...
А што... а што,
калі сумесна
Ўсім наваліцца
грамадой» —
І пад канец
пальнуў высновай:
«Грэх, калі шанц
мы ўпусцім свой...»
Нібыта порах,
тыя словы
Узарвалі сонных душ
спакой.
І грамада...
загаманіла,
Як дамбу зрушыўшы,
вада...
І, божа мой,
якою сілай
Адразу стала
грамада!
Тады ж,
у радасці ўрачыстай
Па шчырай згодзе
ўпершыню
На вёсцы ўзнікла
таварыства,
А бацька стаў —
за старшыню.
І справу ён
павёў цвяроза,
Хоць быў гадамі
малады.
Калі дзе ўласны
хібіў розум,
Прасіў парады
ў грамады.
Народным вопытам
не грэбаў,
І хоць не скнарай быў,
а ўсё ж
Трымаўся правіл:
без патрэбы
Не браць пазыкай
лішні грош,
Не абрастаць, што мхом,
даўгамі,
А паказаць
чарцям на злосць
На што мы здатны
ў працы самі:
Рыдлёўкі ж ёсць,
сякеры ёсць,
І не пакрыўдзіў бог
здароўем...
Таму
за ганьбу не лічы —
Зразай куп'ё,
сячы кустоўе,
Карчуй
струхлелыя карчы.
Калі ж ні ног,
ні рук не чуеш,
Душу
развагаю суцеш,
Што да сямі патоў
працуёш
Не на каго,
а на сябе ж.
...Гадамі
ў гразь, слату, спякоту
Ён гартаваўся,
дружбы дух.
...І вось
не стала ўжо балота,
Дзе твань была —
віднеўся луг.
Ён так зіхцеў
пад сонцам зранку —
Ажно чапаць
было шкада...
Таму рашыла
на дзялянкі
Яго не рэзаць
грамада.
Сумесна ж
багну асушалі —
Сумесным будзе
хай і стог...
І дружна
косы замільгалі,
Густы
зразаючы мурог.
А бацька ўпотай
асцярожна
Цягнуў далей
развагі ніць:
Калі зрабіць
такое можна, —
Ільга ж
і большае зрабіць,
Набыць гуртом
у гаспадарку,
Каб не цяжэў
ад поту хлеб,
І малатарню,
і жняярку —
Не вечна ж серп,
мазольны цэп.
Пара
сялянскаму дастатку
Пракладваць смела
новы шлях.
Пачатак зроблен,
за пачаткам
Разумны
мушан быць працяг.
Ён звычкі
лёгка пераверне,
Як плуг
дзірванную зямлю...
І весялеў:
бо сам жа зерне
Памог укінуць
у раллю.
Сам паспрыяў,
сумнення шашаль
Каб не пранік
у той хаўрус,
Дзе не маё найперш,
а наша,
Дзе не патрэбен быў
прымус.
Сам пільнаваўся,
каб і ценем
Не зацямніць
супольных спраў.
...Як гэта ўсё
прадбачыў Ленін,
Як ад бяды
засцерагаў.
Як у крутыя дні
цярпліва
Вучыў
няспешліва рашаць.
Бо выспяваць
не толькі ніва,
Але...
павінна — і душа.
Не выспела —
зачахне згода,
Не даўшы
парастка дабра.
Не можна
падганяць прыроду:
На ўсё свой час,
свая пара.
Нашто вясна:
пакуль трымае
Зіма настырна
халады,
Хоць і магла б —
не пачынае
Крышыць
метровыя ільды.
Чакае доўга:
покуль сонца
Не ўгрэе промнямі
зямлю,
Не ўскіне
песняю бясконцай
Жаўрук
сваё «цюрлю-цюрлю».
Тады ўжо смела,
як штогоду,
Зламаўшы лёгка лёдастаў,
Ідзе
гуллівым крыгаходам,
З паводкай,
прэлым пахам траў.
І той хады ужо
не спыніш —
Хацець каму
ці не хацець,
Вось так бы,
так і з селянінам...
Спярша б
павагаю прыгрэць.
Затым — параіцца,
прывеціць
І груз сумнення
зняць з пляча...
Але ў жывых тады
на свеце,
Так,
не было ўжо Ільіча.

Публікацыя Я. БАЧЫЛА.

НА ХВАЛЯХ ЭФІРУ

ЭФІР — МАГУТНЫ СРОДАК

БТ: разам ля экрана

АПОШНІЯ два тыдні мая запомніліся кепскім надвор'ем. Дажджлівыя, шэрыя дні, і такая ж шэрасць... на блакітным экране. Зусім мала цікавага было ў літаратурна-мастацкіх перадачах БТ. Аніводнай праграмы, якая б выклікала актыўную зацікаўленасць, узяла б на сябе, так сказаць, ролю лідэра...

Праўда, тое-сёе ўвагу гледача, мабыць, затрымала. У перадапошні майскі вечар ішоў чарговы нумар часопіса «Літаратурная Беларусь». Назаўтра, вырашыўшы скарыстаць вопыт рубрыкі «7×7» у «Литгазете», я набрала некалькі кватэрных тэлефонаў пісьменнікаў і запытала: «Як вы ставіцеся да перадачы «Літаратурная Беларусь», якую адзнаку паставілі б ёй за ўчарашні выпуск?» Адказ ва ўсіх выпадках быў аднолькавы—«не ведаю, што сказаць», «не бачыў», «не глядзеў». Затое ў трох выпадках мне задалі сустрэчнае пытанне: «А вы глядзелі перадачу з Масквы — тэлеканферэнцыю чытачоў часопіса «Дружба народов», у якой прымаў удзел В. Быкаў?»

Шчыра кажучы, было прыкра. Не ад таго, што «эксперымент» не ўдаўся. Было прыкра за перадачы рэспубліканскага тэлебачання. Само па сабе ўзнікала пытанне: дзеля каго яны робяцца? Для саміх жа ўдзельнікаў перадачы? Або для іх знаёмых і сваякоў?

Перадача, між іншым, была як перадача. Прыстойная, прафесійная і чыста зробленая, лагічна пабудаваная. Рэпартаж з музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, які вёў пісьменнік-франтавік В. Трыхманенка. Вершы аб вайне П. Прыходзькі. У майскай перадачы абодва сюжэты прагучалі да месца. Не выклікаў пярэчанняў і сюжэт, прысвечаны 50-годдзю С. Блатуна, з успамінамі пра якога выступіў Р. Барадулін. І вядучая перадачы — В. Іпатава—была, так сказаць, на ўзроўні, гаварыла шчыра, даверліва, сур'ёзна. Адным словам, перадача цалкам задаволіла, калі б выйшла лазе некалькі год назад. Але не сёння.

Сёння, калі газеты, часопісы, перадачы ЦТ даносяць да шырокай аўдыторыі вострапраблемнае, надзённае пісьменніцкае і журналісцкае слова, нас не могуць задаволіць тэлевізійны гладкапіс, вялая ілюстрацыйнасць, бясстраснае інфармаванне. Помніцца, у адным з мінулагодніх выпускаў «Літаратурнай Беларусі» А. Дудараў пажадаў перадачы, каб яна павярнулася бліжэй да жыцця, да праблем часу. Што ж, гэтае пажаданне актуальнае і сёння...

У горшых традыцыях учарашняга дня ствараюцца на БТ паэтычная рубрыка, выступленні празаікаў. Ці ж не дзіўна, што вострыя, цікавыя меркаванні нашых пісьменнікаў — і аб перабудове, і аб пытаннях гісторыі, культуры—

Людзі з мінулага

Часам людзі ўважліва ўглядаюцца ў мінулае. Чалавек успамінае справы даўно мінулых дзён — такія, якімі ён ганарыцца, але і тыя, аб якіх нікому не раскажа. Грамадства таксама ўспамінае сваю гісторыю. Мы зноў і зноў асэнсоўваем знамянальныя падзеі і ўспамінаем такіх людзей, чые здзяйсненні напаўняюць нашу свядомасць нацыянальнай гордасцю і жывяць патрыятычныя пачуцці. Але ў гісторыі кожнага народа ёсць старонкі, якія выклікаюць жаль, ёсць людзі, чые ўчынкі ішлі наперакор інтарэсам Айчыны. «У той самы час, калі яны рабіліся, — гаварыў некалі Г. Р. Дзяржавін, — лепш бы былі забыты. Але як слаўныя прыгоды апісваюцца для пераймання, а ганебныя для аддалення ад іх, то неабходна і ўсяму таму, што здарылася, належнае месца даваць у гісторыі».

Так, неабходна. Гэта месца, аднак, не заўсёды адпавядае гістарычнай ісціне. І не толькі таму, што мінулае цяжэй разгледзець, чым сучаснасць. Справа часам яшчэ і ў суб'ектыўнай волі чалавека, які робіць экскурс у гісторыю. Калі цёмныя старонкі свайго асабістага жыцця ён усяляк скрывае, то даўнія чужыя дзеянні смела выстаўляе напаказ, не абцяжарваючы сябе дакладнасцю ацэнак. І тады з-за яго неразборлівасці, легкадумнасці, недасведчанасці, а то і свядомага жадання сказіць праўду, мінулае паўстае перад намі ў фальшывым адлюстраванні.

Вось гэта непрыманне фальшу і імкненне да ісціны асабліва патрэбны цяпер, калі мы нанава перагортваем старонкі гісторыі і вяртаем грамадству забытыя імёны. Публічнасць жа ёсць праўда і толькі праўда. Таму, здавалася б, не кожную асобу, вяртаемую з забыцця, трэба прыхарошваць і ўзносіць на п'едэстал. І ўсё ж здараецца, калі той, хто заплямяў нашу гісторыю, выстаўляецца на ўсеагульны агляд як нейкі ідэал.

Аб гэтым ужо гавораць. Напрыклад, на пленуме праўлення Саюза пісьменнікаў СССР Барыс Алейнік заўважыў, што некаторыя спрабуюць далучыць творчасць З. Гіпіус да каштоўнасцей да канца варожай ёй

З ПОШТЫ «ЛіМА»

КАБ ЛЯГЧЭЙ КАРАТАЦЬ ДАРОГУ

Дзень і ноч на станцыю Орша прыбываюць пасажырскія цягнікі. Яна — буйны чыгуначны вузел, развязка, адкуль едуць у розных напрамках. Таму на вакзале заўжды людна. Зразумела, што адпаведным службам абслугоўвання трэба працаваць зладжана, прытым кругласутачна. Газетна-часопісны кіёск у гэтым сэнсе не выключэнне.

Гэта, папраўдзе, нават не кіёск, а магазін. Грашовая выручка штомесяц складае 20 тысяч рублёў. Ля прылаўка — заўжды людна. Пасажыры спяшаюцца, каб купіць газеты, часопісы, а хто кніжку, паштоўку, буклет — напамінак пра Беларусь, іншыя тавары, якія ёсць у продажы.

Пры такім наплыве працаваць нялёгка. Трэба паспяваць, каб абслужыць хутка, ветліва, параіць, што купіць.

А яшчэ кіяскёру трэба мець уважлівасць, цярплівасць і моцныя, як кажуць, нервы. Пакупнікі — народ розны: адны стрымана чакаюць сваёй чаргі, другія, здараецца, і гарачацца.

Людзі тут працуюць вопытныя— Марыя Піліпаўна Ткачэнка, Вера Кірылаўна Саковіч, Ніна Сяргееўна Коцінава і Вера Трафімаўна Каржуева. У кожнай багаты жыццёвы вопыт і вытворчы стаж. Гэта дружны, з'яднаны калектыў. Усе — не першы год за прылаўкам.

— Кожная з нас, — расказвае В. Каржуева, — здаючы змену напарніцы, папраўляе вітрыны, цэннікі, выкладвае тавар, які паступіў у кіёск. Абавязкова падзеліцца, на які тавар быў найбольшы попыт, якога застаецца мала. Без гэтага нельга — патрэбна, каб рытм работы не парушаўся, каб не было «прабуксоўкі».

Без затрымкі рухаецца чарга за газетамі, часопісамі. Вера Трафімаўна з паўслова разумее, што просіць кліент, хуценька падбірае патрэбныя выданні, разлічваецца. Рухі кіяскёра ўпэўненыя, дакладныя. Здаецца, жанчына на памяць ведае, дзе і што ляжыць. В. Каржуева лёгка можа распазнаць пакупніка.

— Адзін купляе заўжды «свае» выданні, — тлумачыць яна. — Ён, як кажуць, без запінкі называе патрэбныя газеты, часопісы. Такіх пакупнікоў пераважная большасць. Але ёсць і такія, хто штодзень купляе розныя газеты, за парадай звяртаецца да кіяскёра. І яму трэба адказаць, а каб адказаць, трэба ведаць. У нас спецыяльнага часу для вывучэння зместу перыёдыкі няма. Але знаходзім. Перад зменай абавязкова знаёмімся, хоць бегла, з матэрыяламі. Слухаем агляды «Праўды», «Звязды» па радыё. Выходзім са становішча... А наконт часопісаў і кніг прасцей. Магчымасцей больш. Чытаем, вывучаем пры паступленні ў продаж. Дапамагаюць і пастаянныя пакупнікі, якія цікавяцца пэўнымі выданнямі...

За ўвесь перыяд работы на нікога з чацвярых не было скаргаў. Наадварот, пасажыры заўжды ўдзячны ім.

М. ДУБОУСКІ.

рэдка пачуеш у перадачах нашай студыі?

Апошнім часам у людзей з'явілася патрэба дакрануцца да такіх важных маральных катэгорый, як дабрыня, мілазэрнасць, сумленне. Здавалася б, каму, як не пісьменніку, пачаць дыялог з гледачом аб спрадвечных чалавечых каштоўнасцях? Тэмай для роздуму магла б стаць галоўная, бадай, для нас сёння праблема — духоўнае жыццё чалавека і грамадства. Вядома, карысць ад такой гаворкі можа быць, калі весціся яна будзе гранічна шчыра — так, як гаварыў В. Быкаў на тэлеканферэнцыі «Дружбы народов».

На жаль, пакуль пісьменніцкія выступленні на БТ не надта кранаюць за жывое, не выклікаюць жадання пярэчыць, спрачацца. Ці тэлебачанне не здолела пакуль «разгаварыць», настроіць выступаючых на гэта, ці самі літаратары ўсё яшчэ раўнадушна пазіраюць на тое, што адбываецца ў краіне?

Думаецца ўсё ж, што значная частка віны ляжыць на тэлебачанні, якое не на поўную сілу выкарыстоўвае такі магутны сродак, як жывы эфір. Што перашкаджае сабраць за «круглым сталом» пісьменнікаў ды задаць ім некалькі пытанняў, як кажуць, «на засыпку»? Тады б, відаць, ніхто з апытаных мной літаратараў не сказаў бы — «на жаль, не бачыў».

Смелы, адкрыты адказ на хвалюючыя пытанні стаў бы першым крокам да іх вырашэння. Грамадская думка, грамадская актыўнасць фарміруецца не спакойнымі, «добрапрыстойнымі» перадачамі, а ў вострых спрэчках. Літаратурна-мастацкаму вяшчанню патрэбны новы падыход у публіцыстычных перадачах. Публічнасць — важнейшая вартасць тэлеэкрана. Трэба толькі выкарыстоўваць яе.

Р. БАКУНОВІЧ.

НАШЫ ГОСЦІ

КНІГІ ВАШЫ І НАШЫ

Нядаўна госцем Саюза пісьменнікаў Беларусі быў польскі пісьменнік, галоўны рэдактар часопіса «Новэ ксёнжкі» Януш Тэрмер. Ён азнаёміўся з выдатнасцямі горада-героя Мінска, наведаў Дом-музей і з'езда РСДРП, музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, мемарыяльны комплекс «Хатынь», Літаратурны музей Янкі Купалы, зрабіў паездку на радзіму Якуба Коласа ў Стаўбцоўскі раён. Госць наведаў мясціны, звязаныя з жыццём і творчасцю Адама Міцкевіча і Сыракомлі—Навагрудак, Нясвіж, возера Свіцязь, Мірскі замак.

У Саюзе пісьменнікаў Беларусі госць сустрэўся з старшынёй праўлення Максімам Танкам, народным пісьменнікам Янкам Брылём, сакратарамі праўлення Алесем Жуком, Віктарам Казько, Валерыем Скварцовым, доктарам філалагічных навук Адамам Мальдзісам і інш. Януш Тэрмер быў прыняты ў Беларускім таварыстве дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі, а таксама ў Генеральным консульстве ПНР у Мінску.

У Гродне Я. Тэрмер азнаёміўся з культурным жыццём горада, яго выдатнымі мясцінамі, меў гутарку з гродзенскімі пісьменнікамі, у якой удзельнічалі Аляксей Карпюк, Данута Бічэль-Загнетава, Анатоль Іверс, Алена Руцкая, начальнік абласнога ўпраўлення культуры В. Губіч і інш.

Па маёй просьбе госць з Польшчы адказаў на некалькі пытанняў.

— Што ўяўляе сабой часопіс «Новэ ксёнжкі», які вы рэдагуеце?

— Часопіс заснаваны ў 1949 годзе. Ён прысвечаны агляду і рэцэнзаванню новых кніг мастацкай, навукова-папулярнай і літаратуры па мастацтве. У кожным нумары звычайна змяшчаецца публіцыстычны артыкул — своеасаблівая дамінанта нумара, — прысвечаны пэўнай праблеме. Калі выходзіць кніга выдатнага пісьменніка, то мы прысвячаем яму вокладку, даём інтэрв'ю і разгорнутую рэцэнзію або некалькі думак пра яго. Гэта можа быць таксама і кніга іншага плана (па гісторыі, мастацтве, праву), усё тое, што, на нашу думку, можа зацікавіць шырокага чытача. Акрамя гэтага, змяшчаем рэцэнзіі на самыя значныя навінкі. Цяпер рыхтуем нумар з твораў перакладной мастацкай літаратуры. Гэты нумар будзе прысвечаны 70-годдзю Кастрычніка.

— Мэта вашага прыезду?

— Хачу напісаць нарыс пра культурнае жыццё Беларусі для калектыўнага зборніка, які мае выйсці ў Лодзі. Пятнаццаць польскіх пісьменнікаў выехала ў пятнаццаць савецкіх саюзных рэспублік, і кожны з нас напіша пра свае ўражанні.

— Якія ж вашы ўражанні?

— Самыя добрыя. Дзякуючы маім сябрам — пісьменнікам з Мінска і Гродна — я змог убачыць шмат цікавага, сустрэцца з цікавымі людзьмі, пазнаёміцца з вашым літаратурным і культурным жыццём. Цікавіўся пытаннямі перабудовы і галоснасці.

Для мяне яшчэ важна, працягваў далей госць, што мы падарожнічалі па тых дарогах, дзе спалучаюцца мінулае і сучаснасць, што мне ўдалося наведаць мясціны, дзе жылі Міцкевіч, Ажэшка, Сыракомля. Я рады таксама таму, што пазнаёміўся з мясцінамі, звязанымі з жыццём і творчасцю Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча. Прыемна было зазначыць, што спадчыну Міцкевіча, Ажэшкі беларусы ўспрымаюць, як і сваю. Я ўжо не кажу пра Сыракомлю, які пісаў і па-беларуску. Шкада, што некаторыя старэйшыя перакладчыкі вашай літаратуры на польскую мову адышлі ад нас —не стала Гушчы, Канановіча, Сікірыцкага. Будзем спадзявацца, што маладыя возьмуць у свае рукі гэту справу, і што, з другога боку, польская літаратура будзе знаходзіць на Беларусі сваіх перакладчыкаў і чытачоў.

А. ГАРДЗІЦКІ.

Я. Тэрмер і А. Мальдзіс.

ПАЧАТАК ЗНАЁМСТВА

З 1-га па 4-е чэрвеня ў Мінску па запрашэнні АДН знаходзіўся намеснік галоўнага рэдактара газеты «Дэйлі ньюс» з Народнай Рэспублікі Бангладэш Акбар Хайдэр Кірон. А. Кірон з'яўляецца таксама галоўным рэдактарам часопіса «Войс энд віжн», які выходзіць у якасці дадатку да газеты, а таксама Генеральным сакратаром асацыяцыі клубаў радыёслухачоў Бангладэш і старшынёй слухачоў Маскоўскага радыё.

Госць з Бангладэш знаёміўся з сённяшнім днём нашай рэспублікі — у прыватнасці культурным жыццём сталіцы Беларусі, цікавіўся пытаннямі перабудовы, якая адбываецца ў нашай краіне.

А. Кірон пабываў у рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва» і меў гутарку з яе супрацоўнікамі. Госць падрабязна цікавіўся гісторыяй штотыднёвіка, пытаннямі выдання і афармлення «ЛіМа», а таксама літаратурных і грамадска-палітычных часопісаў рэспублікі. Рэдактар з Бангладэш пазнаёміўся з творчымі планамі газеты.

А. Кірон расказаў аб задачах і прынцыпах работы сродкаў масавай інфармацыі Бангладэш на прыкладзе «Дэйлі ньюс» («Штодзённыя навіны») і часопіса «Войс энд віжн», прысвечанага ў асноўным тэлебачанню і радыёвяшчанню, падкрэсліў важнасць умацавання культурнай сувязі паміж Бангладэш і Савецкім Саюзам. У якасці станоўчага прыкладу ён назваў удзел савецкіх паэтаў у Фестывалі азіяцкай паэзіі, які праходзіў у Бангладэш, а таксама ўзгадаў перавыданне кнігі паэзіі Пушкіна на мове бенгалі да 150-годдзя з дня смерці вялікага паэта.

А. Кірон сказаў, што літаратура, у прыватнасці паэзія, карыстаецца вялікай цікавасцю бангладэшскіх чытачоў. Таму адна са старонак часопіса «Войс энд віжн» рэгулярна прысвячаецца паэзіі. А. Кірон прапанаваў абменьвацца літаратурнымі публікацыямі — чытачы з Бангладэш маглі б знаёміцца з перакладамі твораў беларускіх пісьменнікаў, а чытачы «ЛіМа»—з творчасцю аўтараў Рэспублікі Бангладэш.

У сустрэчы ў рэдакцыі ўдзельнічалі супрацоўнік цэнтральнага апарату АДН У. Елбаеў, член беларускага аддзялення АДН Н. Булдык.

НАШ КАР.

Краіны Саветаў, а яна ж «ніколі не скрывала свайго абсалютнага непрымання Кастрычніцкай рэвалюцыі. Больш таго, яна не здрадзіла сваёй прыродзе і ў самы цяжкі для нашай Радзімы час фашысцкага нашэсця». Нешта падобнае назіраецца і ў нас у Беларусі.

Беларускія буржуазныя нацыяналісты, якія знайшлі прыстанішча ў краінах Захаду, пад апекай ЦРУ робяць спробы рэаніміраваць і падняць на шчыт такіх дзеячаў, як В. Ластоўскі, Р. Астроўскі, Я. Лесік, Ф. Акінчыц. Але што з іх, нацыяналістаў, возьмеш? Здраднікі праслаўляюць здраднікаў — ваенных злачынцаў, прыслужнікаў фашысцкіх акупантаў. Горш, калі нашы грамадзяне, якія перажылі жахі акупацыі, адшукваюць у ліку тых здраднікаў тыпаў, якіх паказваюць як «барацьбітоў за нацыянальныя правы». Так, у некаторых беларускіх выданнях і ў прэсе ўпамінаецца іншы раз імя Антона Луцкевіча.

Калі так, то ўспомнім аб гэтым чалавеку ўсю праўду. Ён, напрыклад, разам са сваім братам Іванам быў стваральнікам і членам ЦК дробнабуржуазнай, нацыяналістычнай партыі — Беларускай сацыялістычнай грамады. Потым актыўна супрацоўнічаў у вядомай газеце «Наша Ніва», дзе прапагандаваў «класавы мір» у беларускай вёсцы. Гэта значыць жадаў, каб памешчыкі захоўвалі свае вялікія маёнткі, а вясковая беднота заставалася ў галечы і мірылася з эксплуатацыяй.

Вядома, у пачатку цяперашняга стагоддзя, у час уздыму рэвалюцыйнага руху, розныя людзі займалі розныя пазіцыі, і наўрад ці справядліва папракаць сёння гэтага дзеяча за яго ідэйныя ваганні. Але гэта былі не выпадковыя памылкі, а свядомая пазіцыя.

Справа ў тым, што пасля першай рускай рэвалюцыі ў Вільна, як і ў іншых гарадах Расіі, узнікла масонства, якое паставіла мэту падпарадкаваць сабе нацыянальна - вызваленчы рух на ўскраінах імперыі, не дапусціць перамогі сацыялістычнай рэвалюцыі. Моцная масонская групоўка ўтварылася ў ЦК партыі рускіх кадэтаў. І вось па рэкамендацыі кадэта Г. Рома Антон і Іван Луцкевічы ў 1909 годзе былі пасвечаны ў масонства. А гэта значыць, што яны падпарадкоўваліся жалезнай дысцыпліне «вольных мулярaў», якая выключала якія-небудзь ваганні. Пазней А. Луцкевіч дзейнасць ложы ахарактарызаваў так: «Арганізацыя аб'ядноўвала ўсе тыя элементы, якія гатовы былі прыняць удзел у барацьбе, пачынаючы ад акцябрыстаў да самых крайніх левых — без абмежавання. Была прынята форма самай строгай канспірацыі не толькі ад улад, але і ад грамадства, каб партыйныя адрозненні не перашкаджалі сысціся для агульнай работы прадстаўнікам розных партый». У масонскі ордэн, адзначаў А. Луцкевіч, былі прыцягнуты і іншыя нацыяналістычныя дзеячы, напрыклад, той жа В. Ластоўскі або Д. Сямашка, які ўвайшоў пазней у састаў коўенскай ложы «Летува».

Так А. Луцкевіч стаў сваім чалавекам і ў правых, і ў так званых левых колах беларускага нацыяналістычнага руху. Аб тым, што ён не быў радавым «вольным мулярам», сведчыць толькі адзін факт: у 1915 годзе А. Луцкевіч прымаў удзел у з'ездзе прадстаўнікоў масонскіх лож Расіі, скліканым па ініцыятыве А. Керэнскага. Туды, вядома, драбязу не пасылалі.

І сапраўды, гэты «брат» зрабіў кар'еру буйнога нацыяналістычнага дзеяча. У 1916 годзе ён адправіўся на з'езд «прыгнечаных народаў Расіі» ў Лазану. Потым ён успамінаў, што «з'езд з'яўляўся грандыёзнай дэманстрацыяй, якая мела на мэце падрыхтаваць еўрапейскую грамадскую думку да расчлянення Расіі». Такое расчляненне меркавалася ажыццявіць з дапамогай кайзераўскай Германіі. Прагерманская арыентацыя атрымала развіццё ў далейшым. А. Луцкевіч, які варожа сустрэў Кастрычніцкую рэвалюцыю, у час нямецкай акупацыі ўзначаліў марыянетачны ўрад Беларускай народнай рэспублікі (БНР). Паколькі беларускі народ не падтрымаў раду БНР, яе нядоўгае існаванне скончылася разам з выгнаннем акупантаў у снежні 1918 года.

Усе здраднікі лёгка мяняюць гаспадароў, і А. Луцкевіч сярод іх не быў выключэннем. Угодніцтва перад нямецкімі каскамі ён змяніў на падлізванне перад Ю. Пілсудскім, прапанаваўшы яму ўключыць Беларусь у састаў Польшчы. Калі затым буржуазная Польшча акупіравала наш край, ён узначаліў «урад» БНР, які падтрымаў новых інтэрвентаў. Але і яго існаванне аказалася кароткім. Страціўшы сваю кіруючую пасаду, А. Луцкевіч у 20—30-я гады знаходзіўся ў Вільні, дзе супрацоўнічаў з рэжымам Ю. Пілсудскага, узначальваў розныя нацыяналістычныя групоўкі, вёў барацьбу супраць Савецкай Беларусі і КПЗБ. У той час у Вільні дзейнічала масонская ложа «Томаш Зан», дзе працягвалі сваю контррэвалюцыйную дзейнасць польскія і беларускія палітыканы.

Як гаворыцца, яблык ад яблыні недалёка падае, а таму амаль аднолькава склаўся лёс сыноў Антона — Юрыя і Лявона Луцкевічаў. Бацька служыў кайзераўцам, а гэтыя — гітлераўцам. У час нямецка - фашысцкай акупацыі Юрый уступіў у Баранавічах у створаную акупантамі «беларускую краёвую абарону», дзе служыў у якасці афіцэра - прапагандыста. Служыў спраўна, і таму фашысты паслалі яго ў разведвальную школу абвера ва Усходняй Прусіі. Туды накіравалі і Лявона. Аб той шпіёнска-дыверсійнай установе ён пазней успамінаў: «У школе нас абучалі тактыцы вядзення бою, падрыўной справе, праходзілі ваенную і страявую падрыхтоўку, вывучалі зброю ўсіх сістэм, статут Чырвонай Арміі з тым, каб, аказаўшыся на тэрыторыі СССР, паводзінамі не выдаць сябе. Акрамя таго, праводзіліся лекцыі па гісторыі Беларусі, якія чытаў мой брат... У працэсе абучэння, па ўказанню нямецкага камандавання, увесь састаў школы прымаў удзел у трох аблавах на савецкіх парашутыстаў, скінутых у Дальвіцкіх лясах, з якіх я асабіста ўдзельнічаў у дзвюх. У апошняй было забіта 10 парашутыстаў і двое ўзята ў палон».

Зразумела, у 1944 годзе браты ўцяклі разам з акупантамі і аказаліся ў Польшчы. У Варшаве яны стварылі тайную арганізацыю, якая планавала антысавецкія дыверсіі на тэрыторыі БССР.

Тут яшчэ раз трэба ўспомніць выступленне Барыса Алейніка. На пісьменніцкім пленуме ён гаварыў, што класік сусветнай літаратуры Кнут Гамсун за супрацоўніцтва з гітлераўцамі быў асуджаны нарвежскім судом, хоць у той час яму было далёка за восемдзесят. Сын Гамсуна, патрыёт, адмовіўся ад здрадніка-бацькі. Сын А. Луцкевіча, як бачым, прадоўжыў здрадніцтва ў другім пакаленні.

Такое палітычнае і маральнае аблічча гэтай сямейкі. Здавалася б, усё тут ясна, але, відаць, не для ўсіх. У свой час газета «Літаратура і мастацтва» спасылалася на аўтарытэт Лявона Луцкевіча і назвала яго нават «навукоўцам з Вільнюса». Гэта дзе ён стаў «навукоўцам»— у той шпіёнскай школе? А практыку праходзіў у час аблавы на парашутыстаў? Або, мабыць, ён пераняў «навуку» ад масона-бацькі і падзяліўся ёю з тымі прастакамі, якія наведваюць яго ў Вільнюсе?

Вось ужо, сапраўды, чорныя справы, «калі яны рабіліся, лепш бы былі забыты». Аб іх, аднак, прыходзіцца напамінаць. Таму што знаходзяцца неразборлівыя людзі, якія, прыкрываючыся прынцыпамі дэмакратызацыі і публічнасці, апускаюцца да поўнай беспрынцыповасці і выцягваюць з гістарычнага забыцця тых, хто не праславіў, а знеславіў наш шматпакутны і мужны народ.

М. СТАШКЕВІЧ,
кандыдат гістарычных навук.
(БЕЛТА).

НА МУЗЫЧНАЙ СЦЭНЕ

Яшчэ раз пра «малы оперны»

ДВА маленькія спектаклі, падрыхтаваныя групай энтузіястаў пад кіраўніцтвам рэжысёра С. Штэйна і год назад паказаныя Клубу сяброў оперы, сабралі вялікую прэсу. Я сказала б — на рэдкасць вялікую, на фоне звычайнай абыякавасці многіх нашых газет да оперных праблем. Калі паспрабаваць коратка, без эмоцый і гучных слоў вызначыць прычыну поспеху тых камерных пастановак («Медыум» і «Альпійская балада») у гледачоў і крытыкаў, дык можна сказаць: яны выявілі грамадскі попыт на камерны музычны тэатр — з аднаго боку, а з другога — наяўнасць артыстычных сіл, здольных па вялікім рахунку задаволіць такі попыт. Цікава, што ў кожным газетным водгуку канкрэтныя спектаклі разглядаліся ў сувязі з праблемай адкрыцця малой сцэны Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР. (Не выключэнне і лімаўскія публікацыі).

І вось зноў мы гаворым пра тую ж оперу. А як не гаварыць? Хіба можна абмінуць такі факт, як выкананне «Альпійскай балады» нашымі салістамі Наталляй Рудневай і Уладзімірам Экнадзіёсавым у Кіеве, у вялікай і прыгожай белакалоннай зале філармоніі, з удзелам тамтэйшага сімфанічнага аркестра, у прысутнасці аўтара — украінскага кампазітара Віталя Губарэнкі? Ці гэта не адметны факт умацавання спрадвечнай дружбы нашых народаў, асабліва значны ў год юбілею Кастрычніка?

На жаль, мне не давялося быць у тыя дні ў Кіеве. І таму асабліва зацікаўлена слухаю Н. Рудневу і У. Экнадзіёсава...

У. Э. Ідэя запрасіць беларускіх артыстаў належыць кіеўскай музыказнаўцы М. Чаркашынай, лібрэтысту «Альпійскай балады». Яна бачыла наш спектакль і, відаць, упадабала, калі параіла замест кіеўскіх выканаўцаў, што пачалі ўжо вучыць оперу, запрасіць нас з Наташай...

Дарэчы сказаць, М. Чаркашына, аўтарытэтны гісторык оперы, доктар навук, прысутнічала і на рэпетыцыі ў нашым Доме работнікаў мастацтваў. Я сядзела побач, чула, як яна паўтарала: «Нельга ўявіць сабе лепшых выканаўцаў... Гэта пападанне «ў дзесятку»... Ды яна ж сапраўдная італьянка... Якія яны абодва яркія акцёры... Якая бліскучая вынаходка пастаноўшчыкаў —даць у канцы пісьмо Джуліі...»

Н. Р. Валодзя не сказаў, што ў Кіеў нас запрасілі для ўдзелу ў аўтарскім вечары кампазітара Губарэнкі. Спачатку планавалася, што фрагменты з «Альпійскай балады» ў чыста канцэртным варыянце будуць выконвацца побач з іншымі яго творамі. Але калі дырыжор аркестра Кофман прыехаў у Мінск, пагутарыў з рэжысёрам Штэйнам, яны вырашылі не адмаўляцца ад сцэнічнага дзеяння. І атрымалася, што «Альпійская балада» заняла ўвесь вечар...

У Мінску спектакль ішоў пад фартэпіяна, у Кіеве быў аркестр. А чым наогул адрозніваўся гэты паказ?

У. Э. Вы нават не можаце ўявіць сабе, у якія суровыя ўмовы мы трапілі. У дзень прыезду мы адразу, з поезда, прыйшлі на трохгадзінную аркестравую рэпетыцыю без сцэнічнага дзеяння. Аркестр кансерваторыі складаецца з добрых інструменталістаў, досыць спрактыкаваны, мае значны рэпертуар, гастралюе. Аднак удзельнічаць у выкананні оперы яму яшчэ не даводзілася. А тут — складаная сучасная партытура і толькі адна паўнацэнная рэпетыцыя з вакалістамі!

Н. Р. Праўда, назаўтра, у дзень спектакля, мы ўсё ж апрабавалі некалькі фрагментаў на той «сцэнічнай пляцоўцы», дзе праз пару гадзін мелася адбыцца дзеянне оперы са складанымі, разнастайнымі, нязвыклымі для опернага артыста мізансцэнамі. Вы бачыце «пляцоўку» на фотаздымку: невялічкі нахілены памост, абкружаны аркестрам. Дырыжор — за спінамі ў нас. Каб хоць гэта быў Уладзімір Анатольевіч Машэнскі, музычны кіраўнік нашай пастаноўкі! Мы заўсёды яго трактоўку, яго тэмпы... А з новым дырыжорам як цяжка працаваць. Ну, і яшчэ — не было заслоны, якая аддзяляла б нас ад публікі ў час аркестравых інтэрмедый дазваляла б псіхалагічна перастроіцца, выйсці з аднаго душэўнага стану і прывесці сябе ў іншы, кантрастны. На вачах у гледачоў і аркестрантаў мы на гэтыя хвіліны пакідалі сцэну. Калі б можна было хаця б выключыць святло, каб адмежаваць адну карціну ад другой! Не было і гэтага. З якой замілаванасцю ўспаміналі мы ў той дзень родную сцэну Дома мастацтваў — няхай сабе маленькую і зусім без дэкарацый, але цалкам нашу, з белым экранам-сцяной, на якую праецыраваліся нашы цені, з заслонай і нейкім падабенствам тэатральнага асвятлення! А галоўнае, нішто на той сцэне не адцягвала ўвагу гледачоў ад нашай ігры...

Вось як нечакана павярнулася наша размова! Дык чым жа, нарэшце, усё скончылася?

Н. Р. Уявіце сабе — поспехам, якога мы, бадай, не бачылі ні ў Мінску, ні ў Куйбышаве, хаця і тут і там на прыём грэх скардзіцца. Людзі доўга апладзіравалі стоячы, многія плакалі. А потым да нас за кулісы прыйшлі калегі-спевакі, у тым ліку і вядомыя Яўгенія Мірашнічэнка, Васіль Трацяк, музыказнаўцы, журналісты... Віншавалі, дзякавалі, гаварылі нават, што павінны ў нас вучыцца. Быў і дырэктар тэатра оперы і балета імя Шаўчэнкі. Абяцаў запрасіць нас на гастролі, калі «Альпійская балада» будзе пастаўлена на ніеўскай сцэне (яна ўключана ў план). Узніклі меркаванні запісаць оперу з нашым удзелам на пласцінку.

У. Э. Я б сказаў, што Віталь Губарэнка быў кранутый той захопленасцю музычным матэрыялам, эмацыянальнай аддачай, з якой працавала наша група — і пастаноўшчыкі, і канцэртмайстры, і мы з Наташай. А вось інтэрпрэтацыя наша не зусім адпавядала ягонай задуме. Там, у Кіеве, я пашкадаваў, што мы «здавалі» Губарэнку гатовую работу. З ім варта было б сустрэцца з самага пачатку, працаваць над творам разам з аўтарам.

Неяк дзіўна настроены Экнадзіёсаў: раздражнёны, ці што? Гаворка ж ідзе пра поспех несумненны, пацверджаны і вуснымі, і друкаванымі водгукамі з Кіева...

У. Э. Ды хіба ж незразумела? Чым большы поспех і дома, і ў Куйбышаве, і ў Кіеве, тым больш крыўдна, што спектакль усё яшчэ «не прапісаны» ні на вялікай, ні на малой сцэне. Дзе яна, гэтая малая сцэна, пра неабходнасць якой столькі пісалі? Занадта «вялікай крывёю» даюцца спектаклі накшталт «Альпійскай балады», «Медыума», «Чалавечага голасу», каб паказваць іх адзін, у лепшым выпадку — два-тры разы для вузкага кола аматараў! Нам з Наташай, будзем лічыць, пашанцавала. Спектакль з-за сваёй тэмы, з-за быкаўскай першакрыніцы дэманстраваўся ўсё ж больш, і, можа, у год 70-годдзя Кастрычніка мы яго яшчэ раз сыграем — дапусцім, у зале нашай філармоніі. А што казаць пра занятых у «Медыуме» — пра тую ж Вольгу Цішыну, якая проста ашаламіла гледачоў сваёй Мадам Флорай...

Н. Р. Калі цябе ў камерным спектаклі публіка прыняла, вось тады ты сапраўды — акцёр! Бо тут і сцэнічны антураж увагу не адцягвае, і ты так набліжаны да публікі, што самая малая фальшывінка, штамп, «найгрыш» не пройдуць. Нібы цябе пад павелічальнае шкло памясцілі... Для мяне галоўнае, што дала праца над «Альпійскай баладай», — гэта вера ў сябе. Якая напружаная тэсітура партыі Джуліі — аўтар разлічваў на драматычнае сапрана, а не на мецца-сапрана... Не спадзявалася справіцца...

У. Э. Наогул, удзел у камерных пастаноўках дае надзвычай многа. Усё ж традыцыйная опера ў асноўным «плакатным штрыхом» робіцца, як мы, оперныя артысты, паміж сабой гаворым — «буйным памолам». Пасля сучасных камерных опер і класіку пяеш іначай — больш тонка, дэталявана. Напрыклад, паглядзіце, як адухоўлена, з якімі нюансамі пяе Наталля Кастэнка партыі Наташы Растовай у «Вайне і міры», Віялеты ў «Травіяце»! Думаю, гэтым яна ў значнай ступені абавязаная працы над монаоперай «Чалавечы голас» Ф. Пуленка.

У. Экнадзіёсаў намерваўся падрыхтаваць у сёлетнім сезоне «Маўру» І. Стравінскага (і друк паспеў пра гэта паведаміць). Як узбагаціла б яна работу Клуба сяброў оперы ў пушкінскі год! Ды чамусьці не падрыхтаваў...

У. Э. Таму і не падрыхтаваў, што страціў веру ў хуткае і канструктыўнае вырашэнне праблемы камернай музычнай сцэны ў Мінску. Энтузіязм энтузіязмам, але гэта толькі, так сказаць, духоўны бок пытання. Без матэрыяльнай, арганізацыйнай падтрымкі нічога не будзе. Не заняпаў бы і любімы наш клуб!

Што ж, такія думкі і ў мяне часам бываюць. Аднак на сёння справа з камернай сцэнай здаецца ўжо не такой безнадзейнай. Ведаю, што зараз Саюз кампазітараў, Дзяржаўны тэатр оперы і балета БССР сумесна хадайнічаюць аб перадачы ў іх распараджэнне аднаго былога культавага будынка з выдатнай акустыкай. Можа, і дажывём да адкрыцця «малога опернага» — эксперыментальнай сцэны, творчай лабараторыі беларускіх кампазітараў, оперных спевакоў, дырыжораў і рэжысёраў? Dum spiro, spero.

Алена САЛАМАХА,
памочнік галоўнага рэжысёра па літаратурнай частцы Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР.

Здымак зроблены пасля выступлення ў Кіеўскай філармоніі. На сцэнічным памосце—заслужаны артыст БССР У. Экнадзіёсаў, народны артыст БССР С. Штэйн, кампазітар В. Губарэнка, артыстка Н. Руднева.

АБ'ЯВЫ

Беларуская ордэна Дружбы народаў дзяржаўная кансерваторыя імя А. В. Луначарскага

АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЕМ НА 1987 ГОД У АСІСТЭНТУРУ-СТАЖЫРОЎКУ З АДРЫВАМ АД ВЫТВОРЧАСЦІ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ: ФАРТЭПІЯНА, СКРЫПКА, АРКЕСТРАВАЕ ДЫРЫЖЫРАВАННЕ (НАРОДНЫЯ ІНСТРУМЕНТЫ), КАМПАЗІЦЫЯ, СПЕВЫ.

У асістэнтуру-стажыроўку прымаюцца асобы абодвух полаў не старэй за 35 гадоў, якія маюць закончаную вышэйшую адукацыю па абранай спецыяльнасці і праявілі здольнасці да педагагічнай і мастацка-творчай дзейнасці.

Паступаючыя ў асістэнтуру-стажыроўку павінны мець вопыт практычнай работы па профілі абранай спецыяльнасці не менш за два гады пасля заканчэння вышэйшай навучальнай установы.

Маладыя спецыялісты дапускаюцца да ўдзелу ў конкурсных экзаменах у асістэнтуру-стажыроўку непасрэдна пасля заканчэння ВНУ па рэкамендацыях саветаў вышэйшых навучальных устаноў.

Заява ў асістэнтуру-стажыроўку падаецца на імя рэктара кансерваторыі з указаннем абранай спецыяльнасці з прыкладаннем: асабістай карткі па ўліку кадраў з фотаздымкам; характарыстыкі з апошняга месца работы; выпіскі з пратакола пасяджэння савета ВНУ для асоб, рэкамендаваных у асістэнтуру-стажыроўку непасрэдна пасля заканчэння вышэйшай навучальнай установы; копіі працоўнай кніжкі; рэферата па абранай спецыяльнасці.

Паступаючыя ў асістэнтуру-стажыроўку здаюць конкурсныя экзамены па спецыяльнасці, гісторыі КПСС і адной з замежных моў у аб'ёме існуючай праграмы для вышэйшых навучальных устаноў.

Асобам, дапушчаным да здачы ўступных экзаменаў у асістэнтуру-стажыроўку для падрыхтоўкі, прадастаўляецца дадатковы адпачынак у 30 каляндарных дзён з захаваннем заработнай платы па месцы работы.

Дакументам, які пацвярджае права на адпачынак, з'яўляецца паведамленне за подпісам рэктара аб допуску да здачы экзаменаў.

Прыём дакументаў з 1 чэрвеня па 1 верасня 1987 г. на адрас: 220030, г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 30.

Уступныя экзамены с 10 па 20 верасня.

У «КНІГАРНІ ПІСЬМЕННІКА»

Б. БУР'ЯН. І толькі надпіс... Артыкулы і эсэ. Мн., «Мастацкая літаратура», 1987. — 55 к.

Н. ГІЛЕВІЧ. Повязь. Вершы і песні. Мн., «Мастацкая літаратура», 1987.— 1 р.

В. ЗУЕНАК. Маўчанне травы. Паэма. Пераклад з беларускай. М., «Советский писатель», 1987.— 60 к.

Ф. КУЛЯШОЎ. Творчы шлях А. І. Купрына. На рускай мове. Мн., «Універсітэцкае», 1987. — 1 р. 80 к.

М. ЛУЖАНІН. Вярнуся ветрам. Вершы, сатыра, гумар. Мн., «Мастацкая літаратура», 1987. — 55 к.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск. На белорусском языке.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць раз на тыдзень, па пятніцах.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
АТ 02180 М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220600, ГСП. Мінск, вул. Захарава, 19.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-19-85, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-22-04, аддзела публіцыстыкі і нарыса — 33-19-65, аддзела прозы і паэзіі — 33-22-04, аддзела культуры і выяўленчага мастацтва — 33-24-62, аддзела тэатра, кіно і тэлебачання — 33-21-53, аддзела музыкі — 33-21-53, аддзела пісьмаў — 33-24-62, аддзела інфармацыі—33-24-62, аддзела мастацкага афармлення і фотаілюстрацый — 33-44-04, 33-24-62, карэктарскай — 32-20-64, бухгалтэрыі — 23-73-37.

Матэрыялы прымаюцца надрукаваныя на машынцы (праз два інтэрвалы). Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Анатоль ВЯРЦІНСКІ.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Анатоль БУТЭВІЧ, Уладзімір ГІЛЕП, Мікола ГІЛЬ (нам. галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЕДАЎ, Лілія ДАВІДОВІЧ, Міхась ДРЫНЕЎСКІ, Алесь ЖУК, Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ, Ігар ЛУЧАНОК, Уладзімір НЯКЛЯЕЎ, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Юрась СВІРКА, Уладзімір СТАЛЬМАШОНАК, Рычард СМОЛЬСКІ, Віктар ТУРАЎ.

Адказны сакратар Пятро СУШКО.